МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

**па вучэбных прадметах
для ўстаноў
агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
і выхавання**

## *I клас*

*Зацверджана
Міністэствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2015

УДК 373.121.414:373.3:1/9
ББК 74.26
В90

ISBN 978-985-559-511-4

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2015
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2015

# УВОДЗІНЫ Ў ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Пачатак навучання на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца найважнейшым этапам у развіцці дзіцяці. Вучню трэба прывыкнуць да зменаў у рэжыме дня і распарадку вучэбных заняткаў, навучыцца мець зносіны і ўзаемадзейнічаць з настаўнікамі і аднакласнікамі, асвоіць новую для яго дзейнасць — вучэбную.

Найбольш складанымі для ўсіх вучняў з'яўляюцца першыя тыдні навучання, таму ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі ствараюцца асаблівыя ўмовы для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў першапачатковы перыяд навучання.

Інтэграваны вучэбны курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» праводзіцца ў верасні ў рамках агульнай колькасці вучэбных гадзін, прадугледжаных Тыпавым вучэбным планам для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў І класе.

На вывучэнне курса вылучаецца 60 вучэбных гадзін, якія размяркоўваюцца раўнамерна — па 3 гадзіны ў дзень **на працягу першых 20 вучэбных дзён**.

У гэты перыяд у вучэбны расклад уключаюцца ўрокі курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» (па 3 урокі кожны дзень) і ўрокі па вучэбных прадметах «Фізічная культура і здароўе», «Музыка». Урокі па іншых вучэбных прадметах не праводзяцца.

Пасля заканчэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» пачынаецца сістэматычнае навучанне па вучэбных праграмах «Навучанне грамаце», «Русский язык», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Выяўленчае мастацтва». Працягваецца вывучэнне вучэбных прадметаў «Фізічная культура і здароўе», «Музыка».

Роля інтэграванага вучэбнага курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» абумоўлена яго функцыянальным прызначэннем — адаптацыяй, развіццём і дыягностыкай. Паступовае ўключэнне вучняў у адукацыйны працэс забяспечвае паспяховасць прыстасавання арганізма дзіцяці да новых умоў жыццядзейнасці.

Курс закладвае аснову для развіцця вучняў — актывізуе адвольнасць псіхічных працэсаў (мыслення, памяці, увагі, успрымання, уяўлення), самарэгуляцыю паводзін, спрыяе фарміраванню элементарных агульнавучэбных уменняў і навыкаў, засваенню спосабаў вучэбнага ўзаемадзеяння. Змест вучэбных заданняў дазваляе педагогу ў гульнявой форме правесці дыягностыку асаблівасцей індывідуальнага развіцця вучняў, вызначыць іх гатоўнасць да засваення зместу вучэбных прадметаў, якія будуць вывучацца пасля заканчэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё».

**Асноўная мэта** курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» — стварэнне аптымальных умоў для паспяховай адаптацыі вучняў I класа да навучання ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

Дасягненне мэты ажыццяўляецца за кошт рашэння наступных **задач**:

- развіццё вучэбнай матывацыі, фарміраванне станоўчых эмацыянальна-каштоўнасных адносін да школы, навучання і новай сацыяльнай ролі «вучня»;
- дыягностыка, падтрымка і развіццё індывідуальнасці вучня, актывізацыя адвольнасці псіхічных працэсаў успрымання, увагі, уяўлення, памяці, мыслення, развіццё сенсаматорных навыкаў;
- засваенне асноўных форм узаемадзеяння з настаўнікам і аднакласнікамі ў працэсе ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці, развіццё навыкаў зносін і навучальнага супрацоўніцтва;
- фарміраванне элементарных агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеяння, засваенне найпрасцейшых прыёмаў самакантролю і самаацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Рашэнне пастаўленых задач забяспечвае дасягненне вучнямі асобасных і метапрадметных вынікаў.

**Асобасныя вынікі** ўключаюць адаптацыю вучняў да новых умоў навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі, прыняцце і засваенне сацыяльнай ролі вучня, праяўленне цікавасці да атрымання новых ведаў і засваення новых спосабаў дзеяння, жаданне вучыцца, прыняцце правілаў школьнага жыцця і іх выкананне, гатоўнасць да засваення вучэбных прадметаў і пераадоленне цяжкасцей у працэсе навучання.

**Метапрадметныя вынікі** ўключаюць засваенне вучнямі элементарных агульнавучэбных уменняў і навыкаў (вучэбна-дзей-

насных, вучэбна-арганізацыйных, вучэбна-інтэлектуальных, вучэбна-інфармацыйных, вучэбна-камунікатыўных) як састаўной часткі ўніверсальных вучэбных дзеянняў.

Вучні набываюць першапачатковы вопыт ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці: прымаюць ад настаўніка вучэбна-практычную задачу; назіраюць і аналізуюць прадметы навакольнага свету з мэтай выдзялення іх істотных прыкмет; вылучаюць сістэму арыенціраў — вучацца арыентавацца ў прасторы, на старонцы вучэбнага дапаможніка і лісце (без разліноўкі і з разліноўкай у клетку і лінейку); засвойваюць рацыянальныя прыёмы запамінання вучэбнага матэрыялу; прытрымліваюцца пакрокавай інструкцыі пры выкананні вучэбнага задання; кантралююць сваю дзейнасць і ацэньваюць яе вынік па зададзеных крытэрыях.

Пры арганізацыі вучэбнага дня і вучэбных заняткаў курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» варта ўлічваць узроставыя асаблівасці вучняў. Дзіця шасцігадовага ўзросту хутка стамляецца, працэсы ўзбуджэння ў яго пераважаюць над працэсамі тармажэння. Вучань стамляецца ад статычнай паставы, яму цяжка сядзець за партай нерухома.

Узроставыя асаблівасці вучняў I класа патрабуюць стварэння для іх асаблівых умоў навучання. Уважлівае, клапатлівае і цярплівае стаўленне да дзіцяці з боку значымых для яго дарослых (педагогаў і бацькоў), разуменне ўнутраных прычын змен, якія адбываюцца з ім, дапамогуць пераадолець усе цяжкасці адаптацыйнага перыяду.

**Асноўныя педагагічныя ўмовы,** якія забяспечваюць паспяховасць адаптацыі вучняў да навучання ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

**1. Рэалізацыя індывідуальнага падыходу да вучняў.**

У першы месяц навучання педагог вывучае асаблівасці індывідуальнага развіцця кожнага вучня. Вучні па-рознаму ўспрымаюць інфармацыю, аналізуюць яе, у іх розная працаздольнасць, памяць, увага, узровень падрыхтаванасці да школы. Усе гэтыя адрозненні неабходна не толькі ведаць, але і ўлічваць пры арганізацыі навучання. Настаўніку неабходна мець поўнае ўяўленне аб стане здароўя вучня, уключаючы не толькі фізічнае, але і псіхічнае здароўе, сацыяльны дабрабыт і сацыяльную адаптаванасць.

Ступень здольнасці да навучання, стан здароўя і функцыянальны стан арганізма вучня вызначаюць у комплексе тую меру

высілкаў і намаганняў, якія патрабуюцца ад яго для выканання вучэбных заданняў. Калі нагрузка празмерная, перавышае мяжу функцыянальных магчымасцей арганізма, непазбежна надыходзіць парушэнне стану здароўя. Менавіта гэтага і не павінен дапусціць настаўнік.

**2. Арганізаваны пачатак вучэбнага дня.**

Вучэбны дзень рэкамендуецца пачынаць з ***ранішняй сустрэчы***, якая праводзіцца *да пачатку вучэбных заняткаў*.

Ранішняя сустрэча задавальняе патрэбу вучняў у зносінах, забяспечвае спакойны пераход ад пазавучэбнага часу да вучэбнага, стварае ўстаноўку на засваенне вучэбнай інфармацыі і спрыяе матывацыі наступнай дзейнасці.

Настаўнік загадзя вызначае месца для правядзення ранішніх сустрэч. Гэта можа быць вольнае месца ў вучэбным кабінеце або гульнявым пакоі. Пажадана, каб выбранае месца дазваляла арганізаваць розныя формы зносін педагога і вучняў: стоячы па крузе, стоячы побач з пераноснай дошкай, седзячы на дыване, седзячы на састаўленых у круг крэслах і інш. Асноўная ўмова — правядзенне ранішняй сустрэчы ў максімальна камфортных абставінах.

Складальнымі элементамі ранішняй сустрэчы з'яўляюцца:

- ✧ прывітанне;
- ✧ навіны класа (паведамленне настаўніка аб вучэбным дні, расказы вучняў аб важных падзеях у іх жыцці, праект «Герой дня»);
- ✧ дыдактычная, развіваючая або рухавая гульня.

Настаўнік і ўсе вучні ўтвараюць круг, бяруцца за рукі. Размяшчэнне вучняў змяняецца ў залежнасці ад ўстаноўкі настаўніка, звязанай з запланаванай гульнёй, тэмай ранішняй сустрэчы або будучага ўрока. Форма прывітання таксама мяняецца, вучні называюць адзін аднаго па імёнах, жадаюць адзін аднаму добрага дня і добрага настрою, вучацца з павагай звяртацца да сваіх аднакласнікаў. У якасці прывітання можна выкарыстоўваць чатырохрадкоўе або рыфмаванку, якая наладжвае вучняў на сумесную дзейнасць.

Настаўнік коратка распавядае аб вучэбным дні. Напрыклад: «Сёння наш дзень будзе прысвечаны вывучэнню асноўных школьных правілаў. Мы даведаемся, як школьнікі вітаюцца адзін з адным і з настаўнікам, як вітаюць уваходзячых у клас

дарослых, будзем вучыцца быць уважлівымі і стараннымі вучнямі».

Падчас ранішняй сустрэчы педагог можа прапанаваць вучням падзяліцца радаснымі навінамі ці сумнымі перажываннямі, расказаць пра свае праблемы або трывогі. Настаўнік тлумачыць, што чалавек дзеліцца сваімі пачуццямі з людзьмі, якія акружаюць яго, каб разам радавацца поспехам або супольна знайсці спосабы справіцца з цяжкасцямі. Вельмі важна стварыць даверныя адносіны паміж вучнямі і настаўнікам.

Знаёмства вучняў адзін з адным забяспечвае праект «Герой дня». Кожны дзень адзін з вучняў класа выступае ў ролі «героя дня». Чарга ўсталёўваецца ў гульнявой форме (лічылкай, фантамі, латарэяй або іншымі спосабамі). «Герой дня» рыхтуе расказ пра сябе для ранішняй сустрэчы (як мяне завуць; колькі мне гадоў; мая сям'я; мая любімая цацка; мой любімы занятак у вольны час і інш.). Настаўнік тлумачыць, што званне «герой дня» да многага абавязвае: дзіця павінна стаць на адзін дзень самым лепшым вучнем класа — старанным і руплівым у вучобе, выхаваным, уважлівым, добрым і спагадлівым. Усе вучні класа павінны знайсці магчымасць на працягу вучэбнага дня сказаць добрыя словы «герою дня», падтрымаць яго і аказаць дапамогу, калі яна неабходная. У класе можа быць аформлены плакат «Герой дня» з месцам для фатаграфіі вучня.

Гульні павінны вырашаць розныя дыдактычныя і развіваючыя задачы, па магчымасці быць блізкімі да матэрыялу заняткаў вучэбнага дня.

**3. Выкананне асноўных рэжымных момантаў у структуры вучэбнага дня.**

У рэжыме вучэбнага дня вучняў першага класа прадугледжваецца правядзенне ***дынамічных перамен*** з арганізацыяй рухавых гульняў.

На кожным уроку праводзяцца *дзве фізкультхвілінкі*, якія ўключаюць практыкаванні для захавання правільнай паставы, прафілактыкі стомы вачэй і рэлаксацыі.

Самы эфектыўны спосаб папярэджання і своечасовага зняцця стомы дзіцяці — *рухавая актыўнасць*, якая павінна складаць не менш за 60% ад агульнага часу знаходжання вучняў ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі і ахопліваць усе віды фізкультурна-

аздараўленчай дзейнасці. Правільнае ўключэнне і размеркаванне ў рэжыме дня рухавых гульняў, правядзенне паўнавартасных фізкультхвілінак на ўроках аказвае дабратворны ўплыў на функцыянаванне ўсіх сістэм арганізма вучня.

**4. Чаргаванне формаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці.**

Адукацыйны працэс варта будаваць такім чынам, каб вучань меў магчымасць рухацца, перамяшчацца па класе, адпачываць ад статычнай паставы. На ўроках разумна чаргуюцца розныя віды дзейнасці, выкарыстоўваюцца разнастайныя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў. Працэс навучання павінен гнутка спалучаць калектыўную (франтальную) працу, вучэбную працу ў парах або групах і індывідуальную дзейнасць вучняў. Змяняючы формы вучэбнага ўзаемадзеяння, вучням дазваляецца свабодна перамяшчацца па класе.

Франтальная работа можа быць арганізавана на дыване.

Не варта патрабаваць ад вучняў бездакорнай пасадкі на працягу ўсяго ўрока. Правільная пасадка вучня за партай неабходна толькі падчас выканання пісьмовых заданняў.

**5. Аптымальны рэжым вучэбнай нагрузкі на ўроку.**

Вучэбная нагрузка павінна быць пасільнай для вучняў першага класа. Педагогу неабходна разумна дазаваць вучэбныя заданні, чаргаваць іх з хвілінкамі адпачынку. Змест вучэбнага курса прадугледжвае ***дыферэнцыраваны падыход*** настаўніка да адбору вучэбнага матэрыялу, зыходзячы з узроўню падрыхтоўкі вучняў. Заданні, не выкананыя на ўроку, на дом не задаюцца.

***Урок*** будуецца ў наступнай лагічнай паслядоўнасці.

1. Арганізацыйны этап. Паведамленне тэмы ўрока.

2. Матывацыя дзейнасці вучняў. Пастаноўка праблемы або вучэбна-практычнай задачы (прыкладныя пытанні настаўніка: «Адказ на якое пытанне будзем шукаць?», «Чаму будзем вучыцца?», «Што неабходна зрабіць?»).

3. Выкананне *першага задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

4. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока (прыкладныя пытанні настаўніка: «Знайшлі адказ на пытанне?», «Чаму навучыліся, выконваючы гэта практыкаванне?»).

5. Фізкультхвілінка.

6. Пастаноўка новай вучэбна-практычнай задачы.

7. Выкананне *другога задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

8. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока.

9. Фізкультхвілінка.

10. Пастаноўка новай вучэбна-практычнай задачы.

11. Выкананне *трэцяга задання*. Самаацэнка, узаемаацэнка.

12. Падвядзенне вынікаў работы на дадзеным этапе ўрока.

13. Вынік урока. Рэфлексіўны аналіз вучнямі сваёй дзейнасці і яе вынікаў.

Кожны этап урока павінен мець лагічную завершанасць і сувязь з наступнай работай. Пераход ад аднаго этапа ўрока да другога ажыццяўляецца плаўна, але вельмі выразна — з пастаноўкай дыдактычнай мэты выканання таго ці іншага практыкавання. Настаўнік прапануе наступнае заданне, калі ўпэўнены, што ўсе вучні ***гатовыя да яго ўспрымання***:

- ✧ прыбраны дыдактычны матэрыял пасля папярэдняга задання;
- ✧ вучні праяўляюць цікавасць да далейшай работы;
- ✧ адсутнічаюць відавочныя прыкметы стамлення (зніжэнне ўвагі, тэмпу работы; агульная «рухавая турбота»; павелічэнне колькасці памылак у адказах вучняў).

**6. Спалучэнне гульнявых і вучэбных матываў дзейнасці.**

Пераход ад гульнявой дзейнасці да вучэбнай павінен быць паступовым. Курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» дапускае шырокае выкарыстанне нагляднасці, гульнявых метадаў навучання, дыдактычных гульняў і практыкаванняў гульнявога характару. Гульнявая сітуацыя павінна быць непасрэдна звязана з вучэбным матэрыялам урока. Пры выбары гульні ў першую чаргу неабходна ацаніць яе пазнавальны патэнцыял і дыдактычную накіраванасць, а не займальнасць сюжэта.

На ўроках арганізуецца практычная дзейнасць вучняў: маляванне і размалёўванне, абвядзенне контураў і штрыхоўка, пісьмо элементаў літар, графічныя дыктоўкі і маляванне па клетках, злучэнне прадметаў стрэлкамі, выкананне задання з выбарам наклейкі з дадатка, работа з геаметрычным наборам і лічыльнымі палачкамі, лепка і інш.

Метады і прыёмы навучання павінны спрыяць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, самастойнасці вучняў, падтрымліваць іх адвольную ўвагу.

**7. Асваенне спосабаў ажыццяўлення вучэбнай дзейнасці.**

Вучань становіцца суб'ектам вучэбнай дзейнасці толькі на аснове такіх асобасных утварэнняў, як актыўнасць, самастойнасць і зносіны.

Важна навучыць кожнага вучня слухаць і ўспрымаць канкрэтнае вучэбнае заданне, звернутае да ўсяго класа. Першыя вучэбныя патрабаванні павінны быць вельмі простымі, яснымі і кароткімі. Кожнае новае для вучняў вучэбнае дзеянне ўводзіцца *пакрокава*. Для асваення правільнай паслядоўнасці выканання вучэбных дзеянняў выкарыстоўваюцца *апорныя схемы* і *алгарытмы*.

Перад выкананнем кожнага задання настаўнік інструктуе ўвесь клас, індывідуальную дапамогу аказвае павольна працуючым вучням. Педагог прывучае вучняў абмяркоўваць будучую работу, планаваць свае дзеянні ў адпаведнасці з умовамі вучэбнай задачы, арганізуе ўзаемадапамогу пры выкананні практычных заданняў. Пастулова выпрацоўваецца ўменне вучняў працаваць прыкладна ў адным тэмпе.

Выкананне кожнага практычнага задання павінна заканчвацца *праверкай* і *ацэнкай*. Гэтыя вучэбныя дзеянні адрозніваюць вучэбнае заданне ад гульнявога. Настаўнік дапамагае вучню асэнсаваць зробленыя аперацыі, вучыць ажыццяўляць паэтапны кантроль сваіх дзеянняў, ацэньваць працу па зададзеных крытэрыях.

На ўроку неабходна ствараць сітуацыі, у якіх вучні змогуць весці паміж сабой *вучэбны дыялог*: задаваць адзін аднаму пытанні, каменціраваць адказы аднакласнікаў.

Такім чынам ажыццяўляецца паступовае ўключэнне вучня ў вучэбную дзейнасць — ён не толькі праяўляе актыўнасць і імкнецца вучыцца, але і свядома авалодвае спосабамі вучэбных дзеянняў.

**8. Навучанне на змястоўна-ацэначнай аснове без выкарыстання адзнак.**

Курс «Уводзіны ў школьнае жыццё» прадугледжвае знаёмства вучняў з рознымі *формамі кантрольна-ацэначнай дзейнасці*: самакантролем і самаацэнкай, узаемакантролем і ўзаемаацэнкай, кантролем і ацэнкай з боку настаўніка. Прадметам аналізу становяцца індывідуальныя вучэбныя дасягненні кожнага вучня. Не дапускаецца параўнанне вучняў паміж сабой.

Для фіксацыі вынікаў кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкарыстоўваюцца *знакі* «+», «–», «?» і *лінеечкі самаацэнкі*. Ацэньванне любога дзеяння першапачаткова ажыццяўляецца вучнем, а толькі потым — педагогам (прыярытэт самаацэнкі). Разам з вучнямі вызначаецца *крытэрый*, па якім будзе праводзіцца ацэньванне. Крытэрыяў не павінна быць многа, паколькі для кожнага з іх неабходна асобная шкала для фіксацыі вынікаў. Пачынаць навучанне варта з выкарыстання *толькі аднаго крытэрыю*, выразна сфармуляванага і зразумелага вучням (напрыклад, адпаведнасць выкананай работы ўзору).

Недапушчальна ўвядзенне ў якасці знакаў ацэнкі сонейка, смайлікаў, казачных герояў ці людзей, якія выказваюць «радасць» (сонейка ўсміхаецца), «сум» (сонейка сумуе) ці інш. Такія знакі ўспрымаюцца вучнямі вельмі эмацыянальна. Многія вучні хвалююцца, калі «сонейка» («смайлік» або «герой») у іх сшытку ім не ўсміхаецца. Сонейка павінна свяціць і ўсміхацца ўсім, нават калі ў вучня нешта не атрымалася пры выкананні задання. Ён прыйшоў у школу вучыцца і мае права на памылку.

Для вучня першага класа асабліва важна адчуць, перажыць радасць поспеху ад самастойна выкананага задання, гонар за пераадоленне першых школьных цяжкасцей. Настаўнік павінен зрабіць усё магчымае, каб вучань паверыў у свае сілы. Таленавіты педагог здольны арганізаваць сітуацыю поспеха для ўсіх, знайсці магчымасць пахваліць і падтрымаць кожнага.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

Змест урокаў інтэграванага вучэбнага курса «Уводзіны ў школьнае жыццё» складае комплекс гульняў і практыкаванняў развіваючага характару, накіраваных на актывізацыю працэсаў успрымання, уяўлення, памяці, адвольнай увагі, разумовых аперацый, выпрацоўку сенсаматорных навыкаў, знаёмства з правіламі школьнага жыцця, засваенне агульнавучэбных уменняў і навыкаў, спосабаў пазнавальнай дзейнасці.

Рэалізацыя названых мэт дасягаецца ў выніку засваення наступнага абагульненага зместу адукацыі.

## Раздзел «Правілы школьнага жыцця»

Знаёмства з установай агульнай сярэдняй адукацыі (экскурсія). Школьныя памяшканні, іх прызначэнне. Праца дарослых ва ўстанове адукацыі. Знаёмства з прафесіяй настаўніка.

Вучэбны клас. Абавязкі дзяжурных па класе. Выкананне найпрасцейшых даручэнняў настаўніка па падтрыманні парадку ў вучэбным памяшканні.

Правілы паводзін у школьнай сталовай, бібліятэцы, спартыўнай зале, актавай зале. Абавязкі дзяжурных у сталовай.

Правілы паводзін вучня на ўроку і перапынку. Правілы школьнага прывітання. Знаёмства з правіламі: «Калі адказвае адзін вучань, усе слухаюць», «Гатовы да адказу — падымі руку», «Вучань для адказу ўстае», «У адказ на словы прывітання вучні моўчкі ўстаюць», «У пачатку і канцы кожнага ўрока вучні стоячы вітаюць настаўніка».

Увядзенне знакаў «Паднятая рука», «Забарона паднятай рукі», «Адказ хорам», «Работа ў пары», «Праблема», «Пастка».

Знаёмства з вучэбнымі прадметамі, якія трэба будзе вывучаць пасля завяршэння курса «Уводзіны ў школьнае жыццё».

Сімвалічнае прысвячэнне дзяцей у вучні.

## Раздзел «Спосабы арганізацыі вучэбнай дзейнасці. Агульнавучэбныя ўменні і навыкі»

Практычнае знаёмства з прызначэннем асноўных вучэбных прыналежнасцей і правіламі іх выкарыстання. Падрыхтоўка неабходных вучэбных прыналежнасцей і рабочага месца да ўрока (пад кіраўніцтвам настаўніка). Падтрыманне парадку на рабочым месцы. Засваенне рацыянальных спосабаў размяшчэння на парце вучэбных прыналежнасцей, іх збору пасля выканання вучэбнага задання і пасля ўрока.

Засваенне ўменняў збіраць партфель (ранец) і падтрымліваць у ім парадак (калі вучэбныя прыналежнасці захоўваюцца ў партфелі або ранцы).

Арыенціроўка ў вучэбным дапаможніку на аснове выкарыстання нумарацыі старонак або ўмоўных абазначэнняў новага вучэбнага дня (сонейка) і новага ўрока (званок). Арыенціроўка на старонцы вучэбнага дапаможніка. Пошук вучэбнага задання на старонцы вучэбнага дапаможніка.

Планаванне дзейнасці: прыняцце мэты, адбор сродкаў для выканання вучэбнага задання; вызначэнне паслядоўнасці дзеянняў.

Спосабы кантролю і ацэнкі дзейнасці. Знаёмства з найпрасцейшымі формамі самакантролю і самаацэнкі. Крытэрыі для ацэнкі выкананай работы: правільнасць (без памылак), адпаведнасць узору.

Выкарыстанне знакаў «+», «–», «?» для фіксацыі вынікаў кантрольна-ацэначнай дзейнасці. Лінеечкі самаацэнкі.

Узаемаправерка і ўзаемаацэнка вучнямі выкананай работы.

Суаднясенне вынікаў самаацэнкі, узаемаацэнка з ацэнкай настаўніка.

Удзел у падвядзенні вынікаў кожнага этапу ўрока. Рэфлексіўны аналіз вучэбных дзеянняў па пытаннях настаўніка: «Чаму навучыліся, выконваючы гэта практыкаванне (гэтыя заданні)?», «Пра што даведаліся?», «Што паўтарылі?», «Што зацікавіла?», «Ці дасягнулі пастаўленай мэты (адказалі на пытанне)?», «Які вынік атрымалі?» і інш.

Асэнсаванне вынікаў дзейнасці ў канцы ўрока. Калектыўны вучэбны дыялог з працягам выказванняў: «Сёння на ўроку я навучыўся ...», «На ўроку я даведаўся (зразумеў), што ...», «У мяне атрымалася ...», «Я змог ...», «Мне вельмі спадабалася заданне ...», «На ўроку мне было лёгка (цяжка) ...» і інш.

## Раздзел «Спосабы арганізацыі вучэбнага супрацоўніцтва»

Правілы вучэбнага супрацоўніцтва: дагавор аб размеркаванні работы, добрасумленнае выкананне работы для атрымання агульнага выніку, ацэнка ўкладу кожнага члена групы, справаздача аб праведзенай рабоце.

Работа ў пары. Размеркаванне роляў для работы ў пары «настаўнік — вучань». Уменне дамовіцца аб выкананні агульнага задання. Узгадненне крытэрыяў для ацэнкі. Узаемакантроль і ўзаемаацэнка выкананай работы.

Работа ў групе. Размеркаванне роляў і абавязкаў у групе. Адказнасць кожнага за агульны вынік дзейнасці. Ацэнка свайго ўкладу ў агульны вынік. Правілы справаздачы групы.

Удзел у вучэбным дыялогу: уменне ставіць пытанне, будаваць адказ, абменьвацца рэплікамі, шукаць доказы (тлумачыць). Уменне элементарна абгрунтоўваць выказванне.

Арганізацыя міжгрупавога ўзаемадзеяння. Вучэбны дыялог паміж парамі і групамі.

Культура ўзаемадзеяння. Правілы вырашэння канфліктаў.

## Раздзел «Спосабы пазнання навакольнага свету. Актывізацыя псіхічных працэсаў»

***Арыенціроўка ў прасторы.***

Паняцці «права», «лева», «верх», «ніз».

Арыенціроўка на лісце без разліноўкі: цэнтр ліста, правы верхні вугал, правы ніжні вугал, левы верхні вугал, левы ніжні вугал. Размяшчэнне прадметаў на лісце ў адпаведнасці з названымі арыенцірамі.

Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у клетку. Маляванне фігур па клетках. Графічная дыктоўка.

Арыенціроўка ў клетцы: цэнтр клеткі, правы верхні вугал, правы ніжні вугал, левы верхні вугал, левы ніжні вугал.

Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у лінейку. Рабочы радок. Верхняя і ніжняя лініі рабочага радка. Нерабочы радок (міжрадковая прастора). Размяшчэнне элементаў літар у рабочым радку.

Узаемаразмяшчэнне прадметаў у прасторы. Паняцці «за», «перад», «на», «пад». Размяшчэнне прадметаў па вызначаным парадку (правілу).

Злучэнне кропак па правілу з выкарыстаннем лінейкі і без лінейкі.

***Развіццё ўспрымання, уяўлення, увагі.***

Развіццё зрокава-прасторавага ўспрымання і зрокава-маторнай каардынацыі.

Развіццё навыкаў успрымання формы, велічыні і колеру. Фарміраванне зрокавых уяўленняў аб прадметах і з'явах рэчаіснасці.

Засваенне спосабаў абследавання прадметаў: успрыманне прадмета ў цэлым; вылучэнне асноўных частак, дробных дэталей і суадносін паміж імі; знаходжанне адметных прыкмет.

Засваенне прыёму назірання. Разглядванне прадметаў навакольнага свету ў адпаведнасці з прапанаванай мэтай. Вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) прадметаў.

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці вадкасці. Назіранне за эфектам зрокавага «памяншэння» і «павелічэння» вады пры яе пераліванні ў шырокую і вузкую пасудзіны.

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці рэчыва (на прыкладзе пластыліну).

Назіранне і эксперыментаванне з захаваннем колькасці прадметаў лічэння.

Развіццё творчага ўяўлення. Маляванне на зададзеную тэму і па ўласнай задуме. Прарысоўванне дэталей у сітуацыі выбару аднаго з прапанаваных варыянтаў. Лепка па задуме і ўзоры. Канструяванне з геаметрычных фігур па задуме і ўзоры. Фантазіраванне (складанне расказаў).

Развіццё адвольнай увагі. Трэніроўка пераключэння і размеркавання ўвагі.

***Засваенне прыёмаў лагічнага мыслення.***

Засваенне прыёму параўнання: вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) аб'екта на аснове супастаўлення яго з іншым аб'ектам; вызначэнне агульных і адметных, істотных (галоўных) і неістотных (другарадных) прыкмет параўноўваемых аб'ектаў. Пошук адказаў на пытанні: «Чым падобныя?», «Чым адрозніваюцца?», «Хто такі ж, як ...?» і інш. Параўнанне сюжэтных малюнкаў, пошук адрозненняў. Выказванне меркавання на аснове параўнання.

Засваенне прыёму абагульнення: аб'яднанне прадметаў (з'яў) па іх агульных і істотных прыкметах. Пошук адказаў на пытанні: «Як назваць адным словам?», «Па якой прыкмеце прадметы аб'яднаны ў адну групу?» і інш.

Засваенне прыёму класіфікацыі: аднясенне канкрэтнага аб'екта да зададзенага класа (напрыклад, кубак — да класа «посуд»); канкрэтызацыя агульнага паняцця праз адзінкавыя (напрыклад, «мэбля» — гэта шафа, канапа, стол); групоўка аб'ектаў на аснове агульных прыкмет; размеркаванне аб'ектаў па класах на аснове вылучанай прыкметы. Пошук адказаў на пытанні: «На якія групы можна падзяліць ...?», «Якія яшчэ прадметы адносяцца да дадзенай групы?», «Што лішняе, хто лішні?» і інш.

Засваенне прыёму сістэматызацыі: вылучэнне розных прыкмет (уласцівасцей) прадметаў; супастаўленне прадметаў па вылучанай прыкмеце; вызначэнне заканамернасці ў пабудове шэрага прадметаў (па адной прыкмеце; па дзвюх і больш прыкметах);

парадкаванне аб’ектаў па ступені інтэнсіўнасці (змяншэнні або ўзрастанні) аднаго або некалькіх прыкмет. Пошук адказаў на пытанні: «Якая прыкмета паўтараецца?», «Што змяняецца?», «Як працягнуць рад?», «У якім парадку трэба размясціць карцінкі?» і інш.

Засваенне прыёму сэнсавага суаднясення: вылучэнне сувязі прадметаў на аснове адносіны «частка — цэлае» *(дах — дом)*, падабенства ці супрацьлегласці ўласцівасцей, функцый *(ручка — аловак; дзень — ноч)*, прыналежнасці да аднаго роду або віду *(яблык — груша)*, зададзенай залежнасці *(малпа — банан)* і інш. Пошук адказаў на пытанні: «Якая сувязь існуе паміж прадметамі?», «Чаму прадметы ўтвараюць пару?», «Па якой прыкмеце прадметы аб’яднаны ў пару (тройку)?» і інш.

Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення ў працэсе работы з загадкамі. Адгадванне загадак і доказ правільнасці адгадкі: вылучэнне прыкмет (уласцівасцей) невядомага аб’екта; супастаўленне ўсіх вылучаных прыкмет; суаднясенне прыкмет з пэўным прадметам (з’явай); доказ правільнасці адказу на аснове пералічэння прыкмет, уласцівых адгаданаму прадмету (з’яве). Прыдумванне загадак па алгарытме.

***Засваенне рацыянальных прыёмаў запамінання.***

Трэніроўка вобразнай памяці на аснове зрокавага запамінання прадметаў.

Трэніроўка славесна-лагічнай памяці на аснове запамінання групы слоў, невялікіх вершаў, паведамленняў.

Развіццё адвольнасці працэсаў запамінання і ўзнаўлення.

Засваенне прыёму паўтарэння: выкананне дзеяння ў знешнім плане (паўтарэнне з прагаворваннем услых, шэптам ці бязгучна, толькі варушачы вуснамі) і ўнутраным (разумовае паўтарэнне, пералік аб’ектаў запамінання).

Засваенне прыёмаў лагічнага запамінання: групоўка; сэнсавае суаднясенне.

Засваенне прыёмаў завучвання на памяць вершаў: на аснове рухальнай памяці (суправаджэнне дэкламацыі вершаў рухамі); вылучэнне апорных слоў; «пераказ» верша сваімі словамі (устанаўленне паслядоўнасці падзей, узнаўленне сюжэта).

## Раздзел «Развіццё маўлення»

***Развіццё гукавой культуры мовы.***

Развіццё слыхавай памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку чутнай гаворкі (сваёй і чужой).

Удасканаленне маўленчых навыкаў: навучанне няспешнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму маўленчаму дыханню, умеранай гучнасці і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Развіццё фанематычнага слыху. Распазнаванне і вылучэнне першага і апошняга гукаў у слове.

***Слоўнікава-лексічная работа, словаўтварэнне.***

Правільнае разуменне і ўжыванне слоў — назваў прадметаў, прыкмет, дзеянняў. Выкарыстанне абагульняючых слоў, адпаведных узроўню ведаў і жыццёвых уяўленняў вучняў: цацкі, школьныя прыналежнасці, адзенне, абутак, посуд, мэбля, інструменты, прадукты, садавіна, агародніна, ягады, кветкі і інш.

Тэматычная групоўка слоў, іх родавідавая суаднесенасць.

Практычнае знаёмства з прыёмамі словаўтварэння (у гульнявой форме). Канструяванне слоў па прапанаваным узоры.

Падбор блізкіх і супрацьлеглых па сэнсе слоў (па ўзоры).

***Развіццё граматычнага ладу маўлення.***

Складанне сказаў на пэўную тэму (па пытаннях настаўніка).

Абдумванне адказу на пытанне настаўніка, дакладнае яго фармуляванне, выкарыстанне пры адказе поўных і няпоўных сказаў.

Пабудова вуснага выказвання па плане-алгарытме.

***Развіццё звязнага маўлення.***

Складанне невялікага расказа па малюнку, серыі сюжэтных малюнкаў, асабістых назіраннях вучняў, зададзенай тэме (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Складанне расказа-апісання па плане-алгарытме.

## Раздзел «Падрыхтоўка вучняў да пісьма»

Знаёмства з гігіенічнымі правіламі пісьма: правільная пасадка, размяшчэнне сшытка на парце, уменне правільна трымаць у руцэ ручку і аловак.

Падрыхтоўка рукі да пісьма: пальчыкавая гімнастыка, свабодны рух рукі ў зададзеным кірунку. Развіццё дробнай маторыкі пальцаў, каардынацыі кісці рукі. Практыкаванні для адпачынку і зняцця мышачнага напружання рук.

Штрыхоўка ў зададзеным кірунку. Размалёўванне. Абвядзенне па контуры. Дамалёўванне фігур. Маляванне па ўзоры.

Развіццё графічных навыкаў пісьма: прамыя лініі (вертыкальныя, гарызантальныя, нахільныя), паралельныя лініі, лініі з закругленнем унізе, лініі з пятлёй, круг і паўкруг, авал і паўавал, элементы друкаваных і пісьмовых літар. Практыкаванні ў узнаўленні элементаў пісьмовых літар на рабочым радку.

## Раздзел «Выхаванне і развіццё асобасных якасцей вучняў. Спосабы ўзаемадзеяння з акружаючымі»

Беларусь — наша Радзіма. Павага да дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь. Павага да гісторыі і традыцый Рэспублікі Беларусь.

Удакладненне ўяўленняў вучняў аб прафесіях і працы дарослых.

Засваенне этычных норм паводзін. Уважлівае стаўленне да акружаючых людзей. Правілы ветлівасці ў розных жыццёвых сітуацыях (у школе, сям'і, транспарце, магазіне). Словы падзякі. Правілы ветлівасці падчас ежы.

Дабро і зло ў жыцці чалавека. Усведамленне маральнага боку ўчынкаў людзей («добрыя» і «дрэнныя» ўчынкі, справы).

Беражлівыя адносіны да прыроды. Клопат і догляд хатніх жывёл.

Беражлівыя адносіны да рэчаў, вучэбных прыналежнасцей. Захаванне парадку і чысціні ў школе і дома.

Пашырэнне ўяўленняў пра абавязкі дзіцяці ў сям'і, пасільную дапамогу дарослым.

Пашырэнне ўяўленняў пра паняцці «сябар», «сяброўства». Фарміраванне ўмення мірыцца, прасіць прабачэння ў сябра.

Пашырэнне ўяўленняў пра здаровы лад жыцця, пра карысць зарадкі і заняткаў спортам для здароўя дзяцей, дарослых.

Бяспечныя паводзіны па дарозе ў школу і дадому. Сігналы святлафора. Дарожныя знакі «Пешаходны пераход», «Падземны пераход». Асноўныя правілы пераходу праезджай часткі.

Правы і абавязкі вучняў. Знаёмства з асноўнымі правамі дзіцяці (на прыкладзе казачных сюжэтаў). Права на жыццё. Права на адукацыю. Права на ахову і ўмацаванне здароўя. Права на адпачынак. Права на пражыванне ў сям'і. Права на абарону гонару і годнасці. Неабходнасць захавання правоў і выканання абавязкаў вучняў.

## Раздзел «Дыягностыка індывідуальных якасцей вучняў»

Першаснае вывучэнне матываў і памкненняў дзяцей пры паступленні ў школу: даўно марылі аб школе і вельмі хацелі пайсці вучыцца як мага хутчэй; хацелі ў школу, але было вельмі сумна развітвацца з дзіцячым садам, яшчэ на адзін год пагадзіліся б застацца дашкольнікамі; прыйшлі ў школу таму, што бацькі сказалі, што яны ўжо дарослыя і ім трэба вучыцца.

Дыягностыка асаблівасцей асобаснага развіцця вучня: стаўленне да акружаючых дарослых; узаемаадносіны з аднакласнікамі; стаўленне да самога сябе (самаацэнка).

Дыягностыка развіцця зрокава-прасторавага ўспрымання і зрокава-маторнай каардынацыі.

Дыягностыка развіцця адвольнай рэгуляцыі дзеянняў. Графічная дыктоўка (дыягнастычная методыка Д. Б. Эльконіна).

Дыягностыка развіцця пераключэння і размеркавання ўвагі вучняў.

Дыягностыка індывідуальнай гатоўнасці вучняў да засваення зместу вучэбных прадметаў «Навучанне грамаце», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Выяўленчае мастацтва»: развіццё дробнай маторыкі і графічных уменняў; вызначэнне круга ведаў і ўяўленняў аб прадметах і з'явах навакольнай рэчаіснасці.

Вывучэнне вучэбных пераваг вучняў у працэсе знаёмства з вучэбнымі прадметамі «Навучанне грамаце», «Матэматыка», «Чалавек і свет», «Працоўнае навучанне», «Музыка», «Выяўленчае мастацтва», «Фізічная культура і здароўе».

## ПРЫКЛАДНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПА ВУЧЭБНЫХ ДНЯХ[1]

(20 дзён па 3 урока, усяго 60 гадзін)

### Першы вучэбны дзень

Урок 1. Беларусь — наша Радзіма.
Урок 2. Знаёмства з настаўнікам і аднакласнікамі.
Урок 3. Экскурсія па ўстанове адукацыі.

### Другі вучэбны дзень

Урок 1. Правілы паводзін вучня на ўроку і перапынку.

Урок 2. Знаёмства з правіламі пісьма: вучымся правільна сядзець, трымаць ручку і аловак. Прасторавая арыентацыя.

Урок 3. Рэжым дня вучня.

### Трэці вучэбны дзень

Урок 1. Арыенціроўка на лісце з разліноўкай у клетку.
Урок 2. Арганізацыя рабочага месца. Дзяжурства вучняў.
Урок 3. Выкананне дзеянняў па алгарытме.

### Чацвёрты вучэбны дзень

Урок 1. Асваенне прыёму параўнання: вылучэнне прыкмет прадметаў на аснове іх супастаўлення.

Урок 2. Арыенціроўка па лінейках рабочага радка. Развіццё графічных навыкаў: прамыя лініі, круг і паўкруг.

Урок 3. Правілы ветлівасці.

### Пяты вучэбны дзень

Урок 1. Выкананне дзеянняў на аснове сістэмы арыенціраў.
Урок 2. Засваенне прыёмаў абагульнення і класіфікацыі.
Урок 3. Добрыя ўчынкі ў жыцці чалавека.

---

[1] Настаўнік мае права ўносіць змены ў прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу.

**Шосты вучэбны дзень**

Урок 1. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.

Урок 2. Складанне апавядання па апорных словах.

Урок 3. Абагульненне і класіфікацыя прадметаў па розных прыкметах.

**Сёмы вучэбны дзень**

Урок 1. Засваенне прыёму сэнсавага суаднясення.

Урок 2. Рацыянальныя прыёмы завучвання на памяць.

Урок 3. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: лініі з закругленнем унізе, паўавал.

**Восьмы вучэбны дзень**

Урок 1. Засваенне прыёму сістэматызацыі.

Урок 2. Выкананне дзеянняў па правілу, інструкцыі.

Урок 3. Правілы зносін у сітуацыі супрацоўніцтва.

**Дзявяты вучэбны дзень**

Урок 1. Развіццё адвольнай увагі.

Урок 2. Алгарытм складання загадак.

Урок 3. Замацаванне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення.

**Дзясяты вучэбны дзень**

Урок 1. Вылучэнне агульных і адметных прыкмет прадметаў.

Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: паралельныя лініі, лініі з пятлёй, паўавал.

Урок 3. Абагульненне ведаў аб правілах дарожнага руху.

**Адзінаццаты вучэбны дзень**

Урок 1. Узаемаразмяшчэнне прадметаў у прасторы.

Урок 2. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.

Урок 3. Часавыя прадстаўленні: суткі, дні тыдня.

### Дванаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў параўнання, класіфікацыі і сістэматызацыі.

Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё каардынацыі руху, графічных навыкаў.

Урок 3. Развіццё ўспрымання, увагі і ўяўлення.

### Трынаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Развіццё гукавой культуры мовы, знаёмства з прыёмамі словаўтварэння.

Урок 2. Развіццё зрокава-прасторавай каардынацыі і ўяўлення.

Урок 3. Успрыманне часавай працягласці.

### Чатырнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Канструяванне з геаметрычных фігур па задуме і ўзоры.

Урок 2. Маляванне на тэму «Школа».

Урок 3. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: лініі з закругленнем унізе, паўавал, круг.

### Пятнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Вылучэнне частак цэлага на аснове зрокавага ўспрымання і ўяўлення.

Урок 2. Засваенне прыёмаў запамінання і ўзнаўлення на аснове зрокавай памяці.

Урок 3. Развіццё зрокава-прасторавага ўспрымання і каардынацыі рухаў.

### Шаснаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення: класіфікацыя, сэнсавае суаднясенне.

Урок 2. Развіццё творчага ўяўлення: фантазіраванне.

Урок 3. Маляванне на тэму «Мая сям’я».

### Сямнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё графічных навыкаў: авал, паўавал.

Урок 2. Умацаванне здароўя: зарадка, заняткі спортам.

Урок 3. Маляванне на тэму «Мой сябар, мае сябры».

### Васямнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Часавыя ўяўленні: год, месяц, пара года.

Урок 2. Выкананне дзеянняў па славеснай інструкцыі.

Урок 3. Засваенне прыёму паслядоўнага аналізу.

### Дзевятнаццаты вучэбны дзень

Урок 1. Замацаванне прыёмаў лагічнага мыслення: параўнанне, абагульненне, сэнсавае суаднясенне.

Урок 2. Падрыхтоўка рукі да пісьма. Развіццё каардынацыі руху, графічных навыкаў.

Урок 3. Мадэліраванне колькасных адносін.

### Дваццаты вучэбны дзень

Урок 1. Правы і абавязкі вучняў.

Урок 2. Знаёмства з вучэбнымі прадметамі.

Урок 3. Свята «Пасвячэнне ў вучні».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Ведаць/разумець:***

- значэнне вучобы ў жыцці чалавека;
- правілы школьнага прывітання настаўніка, аднакласнікаў, работнікаў школы;
- правілы зносін з настаўнікам, аднакласнікамі, работнікамі школы;
- правілы паводзін на ўроку і перапынку;
- правілы вучэбнага супрацоўніцтва ў пары, групе.

***Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):***

- ✧ выкарыстоўваць параўнанне для ўстанаўлення агульных і адметных уласцівасцей аб'ектаў;
- ✧ размяркоўваць аб'екты ў групы па агульнай прыкмеце (такія ж, як ...);
- ✧ усталёўваць і называць характэрныя (якія лёгка адрозніваюцца) прыкметы назіраемага аб'екта;
- ✧ вусна апісваць аб'ект назірання па прапанаваным алгарытме;
- ✧ выконваць дзеянні ў пэўнай паслядоўнасці (па інструкцыі, алгарытме);
- ✧ суадносіць вынік сваёй дзейнасці з эталонам, узорам;
- ✧ ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і абраным крытэрыем.

***Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:***

- ✧ выкарыстоўваць вучэбныя прыналежнасці ў адпаведнасці з іх прызначэннем;
- ✧ выконваць правілы бяспекі работы з вучэбнымі прыналежнасцямі;
- ✧ рыхтаваць рабочае месца, падтрымліваць парадак на рабочым месцы;
- ✧ коратка расказваць пра сябе, сябра, аб сваёй сям'і, школе;
- ✧ састаўляць невялікія расказы з элементамі апісання прадмета (па алгарытму);
- ✧ састаўляць расказы па малюнку, серыі сюжэтных малюнкаў;
- ✧ удзельнічаць у дыялогу ва ўмовах штодзённых зносін: задаваць простыя пытанні (хто, што, дзе, калі) і адказваць на пытанні суразмоўцы;
- ✧ выкарыстоўваць нормы маўленчага этыкету ў сітуацыях штодзённых і вучэбных зносін (зварот, прывітанне, развітанне, знаёмства, удзячнасць, прабачэнне, віншаванне);
- ✧ працаваць у пары і групе (дамаўляцца, размяркоўваць работу, атрымліваць вынік, ацэньваць свой уклад);
- ✧ планаваць сваю дзейнасць і ажыццяўляць кантроль яе хода;
- ✧ знаходзіць памылкі ў сваёй і чужой вучэбнай рабоце і здымаць іх.

## *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу*


- *Цірынава, В. І.* Уводзіны ў школьнае жыццё / Введение в школьную жизнь : вучэб. дапам. для 1-га класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Цірынава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.
- *Цірынава, В. І.* Уводзіны ў школьнае жыццё : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. І. Цірынава. — Мінск : Аверсэв, 2012.
- *Тиринова, О. И.* Введение в школьную жизнь. 1 класс. Дидактический материал : учеб. нагляд. пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения. — Минск : Нац. ин-т образования, 2011; Аверсэв, 2012.

# НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне грамаце з'яўляецца пачатковым этапам сістэматычнага вывучэння беларускай мовы, забяспечвае лінгвістычнае і разумовае развіццё вучняў, дае вялікія магчымасці для вырашэння задач эстэтычнага і маральнага выхавання.

У працэсе навучання грамаце вучні не толькі авалодваюць моўнымі навыкамі — фанетычнымі, граматычнымі, лексічнымі, але і засвойваюць камунікатыўныя ўменні ў сферы зносін паміж сабой і з дарослымі. Важным з'яўляецца фарміраванне культуры маўлення і маўленчых зносін.

Чытанне і пісьмо як важныя віды маўленчай дзейнасці спачатку выступаюць толькі ў якасці прадмета навучання, а пасля становяцца сродкам навучання і развіцця вучняў.

**Мэты** навучання грамаце — фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеянняў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін. Пры гэтым веды, уменні і навыкі разглядваюцца не як мэта, а як сродак паўнацэннага развіцця асобы вучня.

Асноўнымі **задачамі** навучання грамаце выступаюць:

- развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);
- фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;
- навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;
- развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

- ✧ узбагачэнне слоўнікавага запасу;
- ✧ развіццё звязнага вуснага маўлення;
- ✧ фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці.

Вядучымі падыходамі да пабудовы вучэбнага працэсу выступаюць асобасна арыентаваны, культуралагічны і кампетэнтнасны.

*Асобасна арыентаваны падыход* прадугледжвае ўлік інтарэсаў навучэнцаў і вызначэнне перспектыў развіцця кожнага вучня з улікам яго магчымасцей і здольнасцей.

У якасці галоўнага арыенціра *культуралагічнага падыходу* выступае фарміраванне творчай асобы вучня, развіццё яго як чалавека культуры, здольнага да культурнага самаразвіцця.

*Кампетэнтнасны падыход* прадугледжвае атрыманне ў працэсе навучання грамаце асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў.

Да *асобасных вынікаў* належаць:

цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да мовы;

пазітыўныя адносіны да чытання, жаданне самастойна чытаць дзіцячыя кнігі;

імкненне авалодаць пісьмом як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў пісьмовай форме.

*Метапрадметныя вынікі* ўключаюць наступныя кампаненты:

дзейсны (здольнасць да актыўнай творчай дзейнасці ў пазнанні моўных з’яў);

інтэлектуальны (валоданне элементарнымі дзеяннямі аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення, класіфікацыі моўных адзінак);

камунікатыўны (уменне ўстанаўліваць кантакты, разумець выказванні іншага чалавека і выражаць свае пачуцці, эмоцыі, жаданні, задаваць пытанні, аргументаваць свае суджэнні);

інфармацыйны (здольнасць арыентавацца ў такіх крыніцах інфармацыі, як кніга, расказ дарослага або аднакласнікаў, схема; прымяняць атрыманую інфармацыю ў сваёй дзейнасці).

*Прадметныя вынікі* ўключаюць:

валоданне элементарнай тэхнікай чытання і пісьма;

валоданне першапачатковымі ўяўленнямі пра лексічныя, арфаэпічныя, граматычныя нормы беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету;
здольнасць будаваць нескладаныя звязныя выказванні для вырашэння камунікатыўных задач;
валоданне ўменнем спісваць невялікі тэкст, пісаць пад дыктоўку асобныя словы і сказы;
валоданне пачатковымі навыкамі сэнсавага чытання тэксту, чытацкай самастойнасці, наяўнасць чытацкага кругагляду — уяўленняў пра творы, іх аўтараў, жанры.

Курс навучання грамаце заканамерна падпарадкоўваецца ***агульным прынцыпам*** пабудовы зместу адукацыі: культураадпаведнасці, прадуктыўнасці, гуманізацыі, аптымізацыі, дыферэнцыяцыі, свядомасці і актыўнасці вучняў, пераемнасці адукацыі і інш.

Важным прынцыпам навучання грамаце з'яўляецца прынцып *мульцікультурнасці* — арыентацыі на асваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі. У працэсе навучання грамаце ажыццяўляецца нацыянальна-культурная сацыялізацыя вучня, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці на аснове лепшых узораў вуснай народнай творчасці і класічнай літаратуры для дзяцей.

Навучанне чытанню і пісьму арганізуецца ў адпаведнасці з прынцыпамі *прыродаадпаведнасці і індывідуалізацыі*, што мае на ўвазе ўлік узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў.

Навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму ажыццяўляецца на аснове ***гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду*** з шырокім выкарыстаннем гульнявых метадаў і прыёмаў.

У навучанні грамаце вызначальным з'яўляецца складовы (пазіцыйны) прынцып беларускай графікі. Ён знаходзіць сваё ўвасабленне ў абазначэнні мяккасці зычных і гука [й'] на пісьме. Толькі ў кантэксце склада, арыентуючыся на наступную галосную, вучань здольны вызначыць цвёрдасць і мяккасць зычнага і правільна прачытаць склад.

У працэсе навучання вучні знаёмяцца з гукавой сістэмай беларускай мовы, авалодваюць дзеяннямі гукавога аналізу слова, уменнем адрозніваць зычныя і галосныя гукі, знаёмяцца з літарамі як знакамі для абазначэння гукаў на пісьме.

На ўроках навучання грамаце ажыццяўляецца развіццё фанематычнага слыху вучняў, іх азнаямленне з асноўнымі лінгвістычнымі паняццямі — гукам, словам, сказам. Вучні атрымліваюць уяўленне пра складовую структуру слова, націск.

Змест навучання грамаце пабудаваны такім чынам, каб большасць зычных гукаў і іх літар вывучаецца вучнямі раней за галосныя гукі і літары. На фоне засвоеных зычных гукаў і адпаведных літар у вучняў фарміруецца асэнсаванне галоснага ў складзе. Навучанне чытанню прамых складоў ажыццяўляецца «па падабенству» — **ма, на, ра, та, са** і г. д. Папярэдняе вывучэнне літар зычных гукаў дазваляе вучням хутка авалодаць чытаннем прамых складоў з кожным галосным гукам, што вывучаецца, і перайсці да чытання слоў.

Пасля асваення чытання складу і слова па складах вучні авалодваюць прыёмамі цэласнага чытання слова. Пачынаючы з этапа авалодання чытаннем цэлымі словамі і словазлучэннямі (сказамі), чытанне можа выступаць у якасці сродку навучання розным вучэбным прадметам.

Паралельна з навучаннем чытанню ажыццяўляецца ***падрыхтоўка рукі вучня да пісьма і навучанне ўласна пісьму***. Вучні авалодваюць уменнямі абазначаць на пісьме гукі літарамі, складаць словы з літар і складоў, правільна спісваць літары, склады, словы і кароткія сказы з пісьмовага і рукапіснага шрыфтоў, пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем, і кароткія сказы з такіх слоў.

На ўроках пісьма развіваюцца мелкія мышцы рукі, адпрацоўваюцца правільныя напісанні літар і іх рацыянальныя злучэнні ў словах, рытмічнасць і плаўнасць пісьма.

Адна з задач навучання пісьму — фарміраванне выразнага, разборлівага, дастаткова прыгожага пісьма, якое з’яўляецца неад’емнай прыметай культуры пісьмовых зносін. Нядбайнае пісьмо ўскладняе цэласнае ўспрыманне інфармацыі.

З мэтай захавання здароўя вучняў выключаецца патрабаванне абавязковага безадрыўнага напісання літар, складоў і слоў. У час пісьма вучню неабходны чаргаванні напружанняў і расслабленняў. Вучань мае права рабіць невялікія паўзы пасля прапісвання асобных элементаў, літар і складоў. Гэта дае магчымасць своечасова зняць мускульнае напружанне рукі і цела.

На занятках па ***пазакласным чытанні*** ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

Змест навучання грамаце структураваны па раздзелах: *навучанне грамаце; пазакласнае чытанне; развіццё маўлення.*

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (Агульная колькасць гадзін — 180[1])

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

У навучанні грамаце вылучаюць перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны).

### ПАДРЫХТОЎЧЫ (ДАБУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД (12 гадзін)[2]

**Агульнае ўяўленне аб вусным і пісьмовым маўленні**

Падзел вуснага маўлення на сказы, фарміраванне элементарнага асэнсавання функцыі сказа (сказ выражае думку, у ім пра кагосьці або пра штосьці гаворыцца). Вызначэнне паслядоўнасці і колькасці слоў у сказе. Прыдумванне сказаў па малюнках з зададзенай колькасцю слоў, з апорай на схемы. Адлюстраванне з дапамогай схемы слоўнага склада сказа, яго лінейнасці (словы ідуць адно за адным). Работа над інтанацыяй сказа.

Знаёмства з намінатыўнай роляй слова, з тым, што слова мае значэнне (сэнс) — словамі называюць прадметы, іх прыкметы і дзеянні. Называнне аднаго і таго ж аб’екта рознымі словамі *(заяц, зайка, зайчык, бяляк...)*. Знаёмства з разнастайнасцю слоў (этыкетныя словы і выразы, формы слоў са значэннем ацэнкі *(мамачка, сынок, дачушка, добранькі...)*, словы розных тэматычных груп *(«Радзіма», «сваякі», «школьныя прыналежнасці»...)* і інш.).

---

[1] Настаўнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць вучняў, умовы іх работы.

Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаванымі: на адным і тым жа ўроку настаўнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

[2] На вывучэнне асобных тэм у вучэбнай праграме даецца прыкладная колькасць гадзін.

Развіццё фанематычнага слыху, фарміраванне ўмення выдзяляць гукі ў слове.

Выдзяленне зычнага гука ў пачатку слова. Адрозніванне на слых і пры вымаўленні цвёрдых і мяккіх зычных. Падбор слоў з зададзеным гукам.

***Падрыхтоўка рукі вучня да пісьма:*** расфарбоўка, маляванне ўзораў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках, напісанне элементаў літар, іх злучэнне.

Выпрацоўка правільнай паставы вучня, засваенне правіл размяшчэння сшытка на парце, умення трымаць ручку пры пісьме.

## АСНОЎНЫ (БУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД
(140 гадзін)

### Навучанне чытанню

Вывучэнне 10 літар, якія абазначаюць зычныя гукі ***(С, П, М, Т, Л, Н, Ш, Р, К, Д)***. Суаднясенне цвёрдых і мяккіх зычных гукаў і адпаведных літар. Распазнаванне літар па іх характэрных прыкметах (ізалявана і ў слове).

Падзел слоў на склады, вызначэнне колькасці і паслядоўнасці складоў у слове, абазначэнне складовага саставу слова на схеме.

Знаёмства з націскным складам. Вычляненне са слова і называнне націскнога складу. Знаёмства з сэнсаадрознівальнай роляй націску (праз параўнанне слоў тыпу *ка́ра — кара́*).

Вывучэнне галосных гукаў і адпаведных ім літар ***Аа, Яя, Уу, Іі, Оо, ы***. Правільнае суаднясенне гукаў і літар.

Распазнаванне галоснага гука ў складах тыпу ЗГ («цвёрды зычны + галосны»). Чытанне такіх складоў пачаргова з вывучанымі літарамі галоснага гука ***(а, у, о, ы)***.

Адрозніванне на слых і пры вымаўленні зычных і галосных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных. Выдзяленне ў словах асобных гукаў. Гукавы аналіз слова (вызначэнне паслядоўнасці гукаў у слове, іх характарыстыка — галосны ці зычны, галосны націскны ці ненаціскны, зычны цвёрды ці мяккі). Падбор слоў з зададзеным гукам. Знаёмства на практычным узроўні са звонкімі і глухімі зычнымі.

Цэласнае чытанне трох- і чатырохлітарных слоў. Фарміраванне навыку чытання на тэкстах, якія складаюцца са слоў са складамі ЗГ на кожную вывучаную літару галоснага гука.

Вывучэнне астатніх літар, якія абазначаюць зычныя і галосныя гукі. Знаёмства з мяккім знакам і апострафам. Зварот асаблівай увагі на літары ***Яя, Юю, Ее, Ёё***, якія ўказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага. Чытанне слоў і тэкстаў з вывучанымі літарамі.

Паступовае навучанне свядомаму, правільнаму і плаўнаму чытанню ўголас і моўчкі асобных слоў, кароткіх сказаў і невялікіх тэкстаў, зразумелых вучням па змесце, на аснове правільнага і хуткага пазнавання літар, арыенціроўкі на літару галоснага гука.

Практычнае знаёмства са знакамі прыпынку пры чытанні сказаў («.», «!», «?», «,»).

Чытанне сказа з паўзамі і інтанацыямі, адпаведнымі знакамі прыпынку.

Знаёмства з правіламі гігіены чытання.

## Навучанне пісьму

Абазначэнне гукаў адпаведнымі літарамі друкаванага (на ўроках чытання) і пісьмовага шрыфтоў. Знаёмства з напісаннем усіх вялікіх і малых літар, асноўнымі тыпамі іх злучэнняў. Выпрацоўка звязнага і рытмічнага напісання літар і іх злучэнняў у словах, правільнае суаднясенне літар па велічыні, нахілу, раўнамернае размяшчэнне літар і слоў у радку.

Запіс слоў і сказаў з прагаворваннем па складах пасля папярэдняга іх склада-гукавога разбору з настаўнікам, а затым і самастойна.

Алгарытм спісвання. Спісванне слоў і сказаў з узораў (пісьмовых і друкаваных) з арфаграфічным прагаворваннем. Праверка напісанага праз параўнанне з узорам.

Алгарытм пісьма пад дыктоўку. Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў і слоў, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка ў канцы яго. Вялікая літара ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр.

Прыцягванне ўвагі вучняў да слоў, напісанне якіх разыходзіцца з вымаўленнем (словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі).

Фарміраванне ўмення пераводзіць друкаваны тэкст у пісьмовы. Замацаванне і ўдасканаленне прадуктыўных спосабаў чытання слоў і сказаў. Чытанне пісьмовага тэксту.

Удасканальванне работы маўленчага апарату навучэнцаў, навыкаў склада-гукавога аналізу слоў, развіццё вуснага маўлення.

## ЗАКЛЮЧНЫ (ПАСЛЯБУКВАРНЫ) ПЕРЫЯД
(28 гадзін)

### Навучанне чытанню

Абагульненне, замацаванне ведаў і ўменняў, набытых у працэсе падрыхтоўчага і асноўнага перыядаў навучання грамаце.

Удасканаленне навыку чытання. Навучанне прыёмам цэласнага чытання слова, плаўнаму, свядомаму чытанню сказа. Развіццё навыкаў асэнсаванага чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і інш.).

Развіццё ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць свае адносіны да прачытанага.

Чытанне дыялогаў па асобах. Інсцэніраванне невялікага знаёмага твора.

### Навучанне пісьму

Удасканальванне навыку пісьма. Захаванне вучнямі асноўных гігіенічных патрабаванняў да пісьма. Замацаванне графічна правільных напісанняў літар і спосабаў злучэння іх у слове. Практыкаванні ў рытмічным напісанні літар, складоў, слоў, невялікіх сказаў (з 2—3 слоў).

Удасканальванне ўмення правільна (без пропускаў і перастановак літар і складоў) спісваць невялікія тэксты з дошкі і падручніка, пісаць словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Падзел слоў на склады, перанос слоў па складах.

Практычнае прымяненне правіл аб вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр; аб напісанні сказаў (вялікая літара ў пачатку, кропка ў канцы сказа).

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ[1]

На занятках па пазакласным чытанні ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання. Вядучы метад навучання — чытанне-разгляд дзіцячых кніг.

**Кола чытання.** Невялікія мастацкія творы беларускіх і рускіх (у перакладзе на беларускую мову) пісьменнікаў (1—2 старонкі) з дзіцячай кнігі аб'ёмам 10—20 старонак, назва якой, ілюстрацыі на вокладцы і ў тэксце поўнасцю адпавядаюць яе зместу. Дзіцячыя кнігі ў адпаведным афармленні (багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам).

**Тэматыка чытання.** Творы для чытання настаўнікам услых: аўтарскія, народныя творы (вершы, дзіцячыя песні, казкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, апавяданні). Асноўныя тэмы дзіцячага чытання: пра Радзіму, дзяцей, сяброўства, працу, жывёл, расліны, прыгоды і чарадзейства.

**Работа з дзіцячай кнігай.** Фарміраванне чытацкага кругагляду (адна кніга на кожным занятку); выхаванне цікавасці да дзіцячых кніг, выпрацоўка ўмення адрозніваць кнігі па змесце, правільна называць іх, прачытваючы прозвішча аўтара і загаловак; удзел у самых простых літаратурных гульнях па прачытаных у класе кнігах; выкарыстанне ўзораў літаратурнай мовы (загадкі, песенькі і г. д.); выкананне правіл гігіены чытання і захавання кніг.

У *паслябукварны перыяд* працягваецца работа па фарміраванні ўменняў правільна называць кнігу (загаловак, прозвішча аўтара), чытаць услых назву дзіцячай кнігі на вокладцы, тлумачыць назву і суадносіць са зместам твора, пазнаваць знаёмыя эпізоды і сітуацыі на ілюстрацыях дзіцячых кніг, называць герояў, узнаўляць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю, расказваць аб прачытаным.

---

[1] Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

Знаёмства са школьнай бібліятэкай. Выбар кнігі ў бібліятэцы (кніжная выстава, ілюстраваны рэкамендацыйны спіс, плакат).

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ[1]

**Гукавая культура маўлення.** Развіццё слыхавой памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку мовы (сваёй і чужой). Удасканальванне моўных навыкаў: навучанне нармальнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму маўленчаму дыханню, патрэбнай гучнасці (уменне гаварыць без напружання) і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Навучанне вымаўленню слоў у адпаведнасці з нормамі арфаэпіі, з захаваннем націску.

Правільнае вымаўленне гукаў беларускай мовы, дакладнае ўжыванне падобных гукаў, якія найбольш часта блытаюць вучні: [л]—[р], [с]—[з], [ш]—[ж], [п]—[б], [с]—[ш] і г. д. (ізаляванае вымаўленне, а таксама ў словах, фразах і скорагаворках).

**Работа над словам.** Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка вучняў. Правільнае разуменне і ўжыванне слоў — назваў прадметаў, прымет, дзеянняў і тлумачэнне іх значэння. Тэматычная групоўка слоў, іх родавідавое суаднясенне.

Выхаванне чуйнасці да сэнсавых адценняў слоў *(слон, слонік, сланяня)*, адрозніванне і разуменне самых простых выпадкаў шматзначнасці слоў *(іголка швейная, медыцынская і інш.)*, аманіміі *(лісічкі, каса)*.

Выпрацоўка ўмення карыстацца словам у правільнай граматычнай форме.

Выкарыстанне слоў ветлівасці.

**Работа над сказам і звязным маўленнем.** Абдумванне адказаў на пытанні настаўніка, дакладнае іх фармуляванне, ужыванне ў адказе сказаў рознага тыпу.

Пераказ знаёмай казкі ці невялікага апавядання (па пытаннях настаўніка).

Складанне па малюнку ці серыі малюнкаў невялікага апавядання (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Адказы на пытанні па прачытаных сказах і тэкстах.

---

[1]Работа па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку на працягу вучэбнага года.

Слоўнае маляванне з дапамогай настаўніка па прачытаным творы. Дапаўненне сюжэта, самастойнае прыдумванне падзей, як папярэдніх, так і наступных.

Выказванне сваіх уражанняў ад прагледжаных мультфільмаў, тэлеперадач, тэатральных спектакляў, экскурсій, назіранняў.

Адгадванне загадак, тлумачэнне сэнсу прыказак і прымавак, блізкіх да жыццёвага вопыту вучняў.

Завучванне на памяць вершаў, пацешак, песень, лічылак і ўзнаўленне іх з захаваннем інтанацыі, якая дыктуецца зместам.

Выхаванне ўважлівых і добразычлівых адносін да адказаў і паведамленняў іншых вучняў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Ведаць / разумець:***

- што мова з'яўляецца асноўным сродкам зносін паміж людзьмі, што беларуская і руская мовы — дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь;
- важнасць умення правільна гаварыць на беларускай мове, захоўваць правілы маўленчага этыкету;
- усе літары беларускага алфавіта, асноўныя характарыстыкі гукаў мовы (галосныя і зычныя гукі, зычныя мяккія — цвёрдыя, звонкія — глухія);
- асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі вымаўляем, літары пішам);
- спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я*** і мяккім знакам.

***Умець:***

- вычляняць словы ў сказе, гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;
- адрозніваць галосныя і зычныя гукі;
- правільна вымаўляць мяккія і цвёрдыя зычныя гукі ў слове і ізалявана;
- падбіраць словы з зададзеным гукам;
- вызначаць месца націску ў слове;
- правільна, без скажэнняў пісаць малыя і вялікія літары, іх злучэнні ў словах;

- правільна спісваць словы і сказы, напісаныя ад рукі і надрукаваныя;
- граматна (без пропускаў, скажэнняў літар) пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем;
- ужываць вялікую літару ў пачатку, кропку ў канцы сказа;
- ужываць вялікую літару на пачатку ўласных імёнаў (імёнаў і прозвішчаў людзей, мянушак жывёл, назваў гарадоў і вёсак, краін, рэк і азёр);
- злітна чытаць аднаскладовыя і двухскладовыя словы і плаўна па складах — шматскладовыя;
- чытаць невялікія тэксты і вусна расказваць аб прачытаным;
- правільна называць знаёмыя кнігі, персанажаў любімых казак, апавяданняў;
- інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, сцэнкі з іх;
- ведаць на памяць 4—6 вершаў, выразна іх чытаць.

***Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў штодзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:***

- падтрымліваць размову на знаёмую тэму, адбіраючы неабходныя моўныя сродкі для вырашэння пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач;
- самастойна або па пытаннях настаўніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;
- складаць апавяданне па малюнку, па серыі малюнкаў, на зададзеную тэму, расказваць пра падзеі з асабістага жыцця;
- інтанацыйна афармляць сваё выказванне;
- правільна вымаўляць гукі беларускай мовы;
- самастойна падпісваць работу (малюнак, выраб і інш.), выкарыстоўваючы вялікую літару для запісу свайго імя;
- самастойна скласці і запісаць невялікае пісьмовае паведамленне (1—2 сказы), адрасаванае бацькам або сябру;
- самастойна чытаць друкаваны і пісьмовы тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія лісты, інфармацыйныя паведамленні);

- самастойна або пры дапамозе дарослых (выкладчыка, бібліятэкара, бацькоў) выбіраць кнігу па тэме, якая зацікавіла;
- самастойна чытаць невялікія па аб'ёму творы з кніг, часопісаў для дзяцей, расказваць аб прачытаным.

### *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу*


- *Клышка, А. К.* Буквар / А. К. Клышка. — Мінск : Народная асвета, 2014.
- *Клышка, А. К.* Пропісь 1 / А. К. Клышка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.
- *Клышка, А. К.* Пропісь 2 / А. К. Клышка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.
- *Клышка, А. К.* Пісьмо / А. К. Клышка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2014, 2015.
- *Клышка, А. К.* Буквар : старонкі і ўрокі / А. К. Клышка. — Мінск : Народная асвета, 2014.
- *Буторына, І. А.* Пазакласнае чытанне ў 1 класе / І. А. Буторына. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013.

# РУССКИЙ ЯЗЫК

## ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Изучение русского языка в первом классе начинается устным курсом[1].

Устный курс представляет собой предварительный этап в системе обучения русскому языку учащихся учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и воспитания и выполняет в основном адаптационную роль.

**Цель** устного курса: формирование у учащихся первоначальных умений и навыков речевой деятельности на русском языке (слушание и говорение) как основы коммуникативной компетенции.

В основу отбора содержания устного курса положен *ситуативно-тематический принцип*, позволяющий выделить перечень конкретных тем и ситуаций общения, которые актуальны для учащихся первого класса, учитывают их познавательный интерес и возрастные особенности. В целом содержание устного курса очерчено 20 отобранными темами и ситуациями общения, которые отражены и раскрыты в прозаических и стихотворных текстах русского фольклора (сказки, загадки, скороговорки, считалки, речевки), прозаических и стихотворных текстах русской детской классики и произведениях современных писателей и поэтов. Лексика и речевые модели отобранных тем и ситуаций обеспечивают элементарное общение учащихся на русском языке в различных жизненных ситуациях, способствуют формированию у них нравственной, эмоциональной, эстетической сторон личности.

**Задачи** устного курса:

***формирование элементов языковой компетенции:***

✧ усвоение орфоэпических норм произношения специфических звуков русского языка [г], [г’], [р’] ,[ч’], [щ’], [д’], [т’] как в изолированном предъявлении, так и в составе изученных слов, скороговорок, потешек, а также при декламации заученных наизусть стихотворений;

[1] Устный курс изучается после завершения курса «Введение в школьную жизнь».

***формирование элементов коммуникативно-речевой компетенции:***

- ✧ умение воспринимать (слушать, слышать и понимать) русскую устную речь, отличать ее от белорусской устной речи;
- ✧ обогащение словаря учащихся русской лексикой: усвоение в рамках лексического минимума урока значения и произношения новых слов;
- ✧ умение использовать в речевых высказываниях изученную лексику;
- ✧ умение вести элементарные диалоги, создавать небольшие собственные высказывания на русском языке (с опорой на образец, наводящие вопросы учителя, ситуативные картинки);
- ✧ усвоение и активизация в устной речи формул речевого этикета — приветствия, прощания, благодарности;
- ✧ чтение (со II полугодия) отдельных слов, графический облик и лексический смысл которых совпадают в русском и белорусском языках, а также отдельных предложений из 2—5 слов;
- ✧ декламация заученных наизусть стихотворений, в которых встречаются специфические звуки русского языка, с соблюдением орфоэпических норм русского языка;

***формирование элементов культурологической компетенции:***

- ✧ знакомство с элементами культуры и быта русского народа;
- ✧ осознание красоты, богатства, выразительности и ценности русского языка как духовно-культурного наследия русского народа;
- ✧ воспитание нравственных и эстетических качеств личности через восприятие произведений русской классической и современной детской литературы и устного народного творчества.

Решение поставленных задач осуществляется в процессе слухового восприятия учащимися различных по жанру произведений классической и современной русской детской литературы, произведений русского фольклора и последующего организованного общения на русском языке учащихся с учителем и друг с другом.

Основной формой представления языкового материала является речевой образец. Литературные тексты предъявляются

учащимся как через образцовую русскую речь учителя (чтение и рассказывание), так и в форме звукозаписи, через электронные средства обучения. Прослушивание текстов сопровождается выполнением заданий, направленных на проверку адекватности восприятия учащимися содержания текстов и включение их в творческий процесс создания собственных высказываний на русском языке. Задания предусматривают такие виды деятельности, как: ответы на вопросы учителя; драматизация, инсценирование сказок; разыгрывание диалогов; использование лексических игр; заучивание наизусть скороговорок, стихотворений; рисование иллюстраций и т. д. Перечисленные задания и формы работы способствуют тому, что каждый ученик становится активным и равноправным участником коммуникативно-речевого процесса на уроке.

# СОДЕРЖАНИЕ УЧЕБНОГО ПРЕДМЕТА (30 ч)

## УСТНЫЙ КУРС

### Слушание и говорение

Русская речь, различение устной русской и белорусской речи.

Произведения русского фольклора, русской детской классики, современных детских писателей и поэтов (восприятие на слух). Обогащение словаря учащихся русской лексикой.

Построение элементарных высказываний (ответы на вопросы по содержанию текста, драматизация и ролевое воспроизведение текстов).

Воспроизведение готовых диалогов, разыгрывание диалогов (по образцу, по заданной ситуации). Построение элементарных высказываний в простейших ситуациях общения.

Формирование первоначальных навыков произношения специфических русских звуков [г], [г’], [р’], [ч’], [щ’], [д’], [т’].

Знакомство с формулами русского речевого этикета — приветствия, прощания, благодарности, извинения (практическое усвоение).

Раскрашивание и рисование иллюстраций к прослушанным текстам.

Лексические игры, разгадывание ребусов, отгадывание загадок.

## Чтение

Чтение (эпизодическое, начиная со второго полугодия) отдельных слов, совпадающих по графическому начертанию и лексическому значению в русском и белорусском языках, а также предложений из 2—5 слов.

***Тематика «Устного курса»***

**I. Слушаем, запоминаем, говорим, играем (20 ч)**

1. Мы изучаем русский язык (1 ч).
2. Знакомство (1 ч).
3. Осень школьная пришла (1 ч).
4. Давайте дружить (1 ч).
5. Моя семья (1 ч).
6. Учимся вежливости (5 ч).
7. Праздник чудный — Новый год (1 ч).
8. Что такое хорошо, и что такое плохо (3 ч).
9. Солнце, воздух и вода — наши лучшие друзья (2 ч).
10. Добро не умрет, и зло пропадет (1 ч).
11. Мамин день (1 ч).
12. Без труда не выловишь рыбку из пруда (1 ч).
13. Кем быть? (1 ч).

**II Слушаем, говорим, учимся читать (10 ч)**

1. В слова играем, друг друга понимаем (2 ч).
2. Сказка — в жизни подсказка (2 ч).
3. Наши домашние любимцы (1 ч).
4. Земное чудо — лес (1 ч).
5. С любовью к природе (1 ч).
6. Учимся видеть прекрасное (2 ч).
7. День за днем (1 ч).

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К УРОВНЮ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

***Знать и понимать:***

- слова, составляющие лексический минимум каждого урока;
- заученные скороговорки, стихотворения;
- изученные пословицы;
- формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности.

***Уметь (владеть способами познавательной деятельности):***

- ✧ различать в потоке речи русскую и белорусскую речь;
- ✧ различать виды речевой деятельности — слушание, говорение, чтение, письмо;
- ✧ понимать общий смысл прослушанных произведений;
- ✧ прогнозировать содержание и устанавливать последовательность событий по данным к текстам иллюстрациям и рисункам;
- ✧ правильно произносить отдельные звуки, а также слова, скороговорки, стихи со специфическими русскими звуками [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'];
- ✧ отвечать на вопросы по содержанию текста, опираясь на лексику вопросов;
- ✧ вести элементарные ситуативные диалоги с 4—6 репликами-вопросами и репликами-ответами;
- ✧ читать по слогам и складывать из букв разрезной азбуки отдельные слова, совпадающие по графическому начертанию и лексическому значению в русском и белорусском языках, а также предложения из 2—5 слов;
- ✧ складывать из букв разрезной азбуки отдельные слова.

***Использовать приобретенные знания и умения в практической речевой деятельности:***

- ✧ изученные слова, скороговорки, стихи со специфическими русскими звуками [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'];
- ✧ формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности;
- ✧ изученные пословицы;
- ✧ ситуативные диалоги с 4—6 репликами-вопросами и репликами-ответами.

## ***Учебно-методическое обеспечение образовательного процесса***


- *Антипова, М. Б.* Русский язык. 1 класс / М. Б. Антипова, Е. С. Грабчикова. — Минск : Нац. ин-т образования, 2010.
- *Антипова, М. Б.* Русский язык. 1 класс. Рабочая тетрадь / М. Б. Антипова, Е. С. Грабчикова. — Минск : Аверсэв, 2014, 2015.
- *Антипова, М. Б.* Русский язык в 1 классе / М. Б. Антипова, Е. С. Грабчикова. — Минск : Нац. ин-т образования, 2010.

# МАТЭМАТЫКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне ў вучняў першапачатковых уяўленняў аб матэматыцы як навуцы, якая вывучае колькасныя адносіны і прасторавыя формы сапраўднага свету. Вучэбны прадмет «Матэматыка» спрыяе развіццю вобразнага і лагічнага мыслення, закладвае асновы для фарміравання ў вучняў пазнавальнай самастойнасці, паказвае магчымасці прымянення матэматычных ведаў у паўсядзённым жыцці.

**Мэта** навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі — сфарміраваць прадметныя кампетэнцыі (логіка-аналітычныя, вылічальныя, канструктыўна-вымяральныя), неабходныя для працягу навучання матэматыцы на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі; стварыць умовы для авалодання вучэбна-пазнавальнымі кампетэнцыямі, якія з'яўляюцца асновай развіцця пазнавальнай самастойнасці вучняў.

*Логіка-аналітычныя кампетэнцыі* звязаны з фарміраваннем уменняў аналізаваць і структураваць матэматычную інфармацыю, вылучаць матэматычныя адносіны, ствараць матэматычную мадэль сітуацыі, ажыццяўляць пошук рашэння задачы і інтэрпрэтаваць атрыманыя вынікі.

Фарміраванне *вылічальных кампетэнцый* адбываецца на аснове выканання арыфметычных дзеянняў над лікамі і лікавымі значэннямі велічынь, засваення правілаў парадку дзеянняў у выразах з дужкамі і без дужак, знаходжання значэнняў лікавых выразаў, рашэнні ўраўненняў, падбору значэнняў пераменнай, пры якіх няроўнасці становяцца вернымі.

Асноўным сродкам фарміравання канструктыўна-вымяральных кампетэнцый з'яўляецца назапашванне вопыту па распазнаванні і пабудове геаметрычных фігур, схематычных і графічных мадэляў, па вымярэнні велічынь з дапамогай спецыяльных інструментаў.

Да вучэбна-пазнавальных кампетэнцый, якія фарміруюцца пры вывучэнні матэматыкі, можна аднесці: аналіз вучэбнага задання, параўнанне і класіфікацыю аб'ектаў, прадстаўленне інфармацыі ў таблічнай форме і ў выглядзе дыяграмы, мадэліраванне сітуацыі з дапамогай візуальных, вербальных і сімвалічных сродкаў, выяўленне заканамернасцей.

Фарміраванне прадметных і вучэбна-пазнавальных кампетэнцый пры навучанні матэматыцы патрабуе вырашэння наступных **задач**:

- ✧ сфарміраваць уяўленне аб цэлым неадмоўным ліку на аснове вывучэння нумарацыі, параўнання лікаў і выканання над імі арыфметычных дзеянняў, вымярэння велічынь і рашэння тэкставых арыфметычных задач;
- ✧ навучыць распазнаваць, будаваць і даследаваць геаметрычныя фігуры, параўноўваць аднародныя велічыні, вызначаць лікавыя значэнні велічынь з дапамогай вымярэнняў і вылічэнняў;
- ✧ пазнаёміць са спосабамі прадстаўлення інфармацыі з дапамогай малюнкаў, тэкстаў, табліц, схем, дыяграм, матэматычнай сімволікі; сфарміраваць пачатковыя ўменні па пабудове мадэляў рэальных сітуацый з колькаснымі дадзенымі з дапамогай візуальных, вербальных, сімвалічных сродкаў;
- ✧ стварыць умовы для авалодання асновамі лагічнага і алгарытмічнага мыслення, развіцця прасторавага ўяўлення, матэматычнай мовы;
- ✧ забяспечыць набыццё пачатковага вопыту прымянення матэматычных ведаў для вырашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач;
- ✧ садзейнічаць выхаванню цікавасці да матэматыкі, да даследавання матэматычнай сутнасці прадметаў і з'яў.

У змесце навучальнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вылучаюцца наступныя асноўныя лініі: арыфметычны матэрыял, велічыні і іх вымярэнне, геаметрычны матэрыял, алгебраічны матэрыял.

Аснову вучэбнага прадмета «Матэматыка» складае арыфметычны матэрыял. Арыфметычны матэрыял вывучаецца канцэнтрычна: адназначныя лікі, двухзначныя лікі да 20, лікі ад 21 да 100, трохзначныя лікі, мнагазначныя лікі да 1 000 000. Пера-

ход да новага канцэнтра суправаджаецца не толькі пашырэннем мноства вядомых лікаў, але і сістэматызацыяй і паглыбленнем ведаў, увядзеннем новых паняццяў і спосабаў дзеянняў у дзейнасць вучняў. Лінія велічынь, геаметрычная і алгебраічная лініі з'яўляюцца спадарожнымі: вывучэнне элементаў алгебры і геаметрыі, знаёмства з велічынямі размеркавана па адпаведных канцэнтрах.

У кожным канцэнтры вучні знаёмяцца з тэкставымі задачамі і спосабамі іх рашэнняў. Рашэнне задач на ўроках матэматыкі з'яўляецца адным з важных сродкаў фарміравання матэматычных паняццяў і асновай для прымянення вывучанай матэматычнай тэорыі. З дапамогай тэкставых задач вучні ўдакладняюць і абагульняюць веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні арыфметычнага і геаметрычнага матэрыялу, асноўных велічынь і элементаў алгебры.

Асаблівая роля ў навучанні матэматыцы на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца дыдактычнай гульні і метаду навучальнага мадэліравання. Дыдактычная гульня дазваляе пазнаёміць з матэматычнымі паняццямі на даступным для вучняў узроўні. Вучэбнае мадэліраванне накіравана на авалоданне вучнямі метадам пазнання, у аснове якога ляжыць уменне прадстаўляць істотную інфармацыю з дапамогай мадэляў розных відаў.

**Арыфметычны матэрыял**

***Цэлыя неадмоўныя лікі і арыфметычныя дзеянні над імі.*** Пры вывучэнні матэматыкі ў вучняў фарміруюцца ўяўленні аб утварэнні, чытанні, запісу, паслядоўнасці цэлых неадмоўных лікаў, пра спосабы параўнання лікаў, аб арыфметычных дзеяннях над цэлымі неадмоўнымі лікамі (складанне, адніманне, множанне, дзяленне), пра ўласцівасці арыфметычных дзеянняў (перамяшчальная ўласцівасць складання і множання, спалучальная ўласцівасць складання і множання, размеркавальная ўласцівасць множання), а таксама заснаваныя на гэтых уяўленнях навыкі вусных і пісьмовых вылічэнняў.

***Долі і дробы.*** На І ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з доляй і яе запісам з дапамогай дробу, вучацца параўноўваць долі на практычнай аснове, а таксама рашаць задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

**Велічыні і іх вымярэнне**

У цеснай сувязі з вывучэннем арыфметычнага матэрыялу раскрываецца паняцце «велічыні» і вывучаюцца спосабы вымярэння велічынь. Важным, з практычнага пункту гледжання, з'яўляецца навучанне вымярэнню велічынь. Вучні атрымліваюць уяўленне аб тым, што лік з'яўляецца вынікам вымярэння велічыні. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з такімі велічынямі, як даўжыня, плошча, маса, час, ёмістасць, і з адзінкамі іх вымярэння. Вызначэнне значэнняў гэтых велічынь заснавана на выкарыстанні вымяральных інструментаў і вылічэнняў. Пры рашэнні тэкставых задач вучні таксама знаёмяцца з іншымі велічынямі, лікавыя значэнні якіх вызначаюцца з дапамогай вылічэнняў (хуткасць, час, адлегласць, цана, колькасць, кошт і інш.).

**Геаметрычны матэрыял**

На ўроках матэматыкі вучні знаёмяцца з геаметрычнымі фігурамі (пункт, крывая, прамая, адрэзак, ломаная, прамень, вугал, многавугольнік, акружнасць, круг і інш.), з геаметрычнымі паняццямі (прамавугольнік і квадрат); вучацца знаходзіць даўжыні адрэзка і ломанай, перыметр многавугольніка, плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі, вылічаць плошчу прамавугольніка па даўжынях яго старон, будаваць геаметрычныя фігуры.

Вучні выконваюць заданні з геаметрычным зместам, накіраваныя на фарміраванне прасторавых уяўленняў. Знаёмства з геаметрычнымі целамі (куб, прызма, піраміда, цыліндр, конус, шар) прапануецца на прапедэўтычным узроўні.

**Алгебраічны матэрыял**

Алгебраічныя паняцці (лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, пераменная, выраз з пераменнай, ураўненне, няроўнасць з пераменнай) разглядаюцца на ўроках матэматыкі на прапедэўтычным узроўні і выконваюць дапаможную ролю.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
# (120 гадзін)

## ПАРАЎНАННЕ ПРАДМЕТАЎ І МНОСТВАЎ ПРАДМЕТАЎ, ПРАСТОРАВЫЯ І ЧАСАВЫЯ ЎЯЎЛЕННІ

(8 гадзін)

Атаясамліванне і распазнаванне прадметаў па адной уласцівасці: форме (круглыя, трохвугольныя, квадратныя, прамавугольныя), памеру (малыя, вялікія), колеру. Прасторавыя ўяўленні: *зверху, знізу, вышэй, ніжэй, злева, справа, лявей, правей, перад, за, паміж, побач.* Часовыя прадстаўленні: *спачатку, потым, раней, пазней, да, пасля; раніца, дзень, вечар, ноч.* Поры года: *вясна, лета, восень, зіма.*

Класіфікацыя прадметаў па адной і дзвюх уласцівасцях. Упарадкаванне прадметаў дадзенага мноства. Параўнанне мностваў прадметаў па колькасці: *столькі ж, больш, менш, больш на, менш на.*

Назвы лікаў ад 1 да 20. Лік прадметаў у межах 20.

## АДНАЗНАЧНЫЯ ЛІКІ

(42 гадзіны)

Назвы, паслядоўнасць і абазначэнне адназначных лікаў ад 1 да 9.

Лік 0 і яго абазначэнне.

Утварэнне ліку дадаваннем адзінкі да папярэдняга ліку, адніманнем адзінкі ад наступнай колькасці. Знакі «+» і «–».

Параўнанне лікаў. Знакі «>», «<», «=».

Састаў адназначных лікаў. Складанне і адніманне адназначных лікаў на практычнай аснове (з дапамогай лічэння прадметаў). Складанне і адніманне з нулём.

Рашэнне простых задач, якія раскрываюць канкрэтны сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання.

Прамая і крывая лініі. Пункт. Адрэзак.

## ДВУХЗНАЧНЫЯ ЛІКІ ДА 20
## (60 гадзін)

Лік 10. Дзясятак. Састаў ліку 10. Утварэнне лікаў ад 11 да 20. Назвы, чытанне і запіс лікаў ад 11 да 20. Дзесяцічны састаў двухзначных лікаў у межах 20. Параўнанне лікаў у межах 20.

Назвы кампанентаў і выніку складання і аднімання. Перамяшчальная ўласцівасць складання. Узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання.

Табліца складання (аднімання) лікаў у межах 10. Прыёмы складання і аднімання лікаў: прылічванне (адлічванне) па адным, складанне (адніманне) па частках, складанне з выкарыстаннем перамяшчальнай уласцівасці складання, адніманне з апорай на сувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання.

Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 20 без пераходу праз дзясятак.

Лікавыя выразы ў 1—2 дзеянні без дужак: чытанне, запіс, знаходжанне значэння.

Падбор невядомага кампанента складання (аднімання) па вядомых кампаненце і выніку.

Рашэнне простых задач на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак.

Адзінкі даўжыні: *сантыметр, дэцыметр*. Даўжыня адрэзка. Параўнанне адрэзкаў па даўжыні. Вымярэнне даўжыні адрэзка з дапамогай лінейкі. Пабудова адрэзкаў зададзенай даўжыні. Параўнанне лікавых значэнняў даўжыні. Складанне і адніманне лікавых значэнняў даўжыні.

Адзінка часу: *гадзіна*. Вызначэнне часу з дакладнасцю да гадзіны.

Адзінка масы: *кілаграм*. Маса прадмета. Параўнанне прадметаў па масе. Знаёмства з вагамі.

Адзінка ёмістасці: *літр*. Ёмістасць пасудзіны. Параўнанне пасудзін па ёмістасці.

## ПАЎТАРЭННЕ ЗА І КЛАС
## (10 гадзін)

Нумарацыя адназначных і двухзначных лікаў да 20.

Параўнанне лікаў у межах 20.

Таблічнае складанне і адніманне ў межах 10.

Пазатаблічнае складанне і адніманне ў межах 20.

Знаходжанне значэнняў выразаў без дужак у 1—2 дзеянні.

Рашэнне простых задач, якія раскрываюць сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання, на павелічэнне або памяншэнне ліку на некалькі адзінак.

Геаметрычныя фігуры: распазнаванне квадрата, круга, трохвугольніка, прамавугольніка. Атаясамліванне і распазнаванне фігур па памеры і колеру. Крывая. Прамая. Пункт. Адрэзак.

Адзінкі даўжыні: *сантыметр, дэцыметр*. Вымярэнне даўжыні адрэзка з дапамогай лінейкі. Пабудова адрэзка зададзенай даўжыні.

Адзінка часу: *гадзіна*. Вызначэнне часу з дакладнасцю да гадзіны.

Адзінка масы: *кілаграм*. Параўнанне прадметаў па масе.

Адзінка ёмістасці: *літр*. Параўнанне пасудзін па ёмістасці.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Ведаць / разумець:***

- ✧ прыкметы параўнання прадметаў і груп прадметаў;
- ✧ прасторавыя і часавыя катэгорыі;
- ✧ паслядоўнасць лікаў ад 0 да 20;
- ✧ адносіны паміж лікамі (больш, менш, роўна);
- ✧ састаў адназначных лікаў;
- ✧ дзесятковы састаў лікаў ад 10 да 20;
- ✧ назвы і абазначэнні дзеянняў складання і аднімання, назвы кампанентаў і выніку дзеянняў складання і аднімання;
- ✧ перамяшчальную ўласцівасць складання;
- ✧ узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання;
- ✧ табліцу складання ў межах 10 і адпаведныя выпадкі аднімання;
- ✧ структуру задачы, узаемасувязь паміж умовай і пытаннем;
- ✧ назвы геаметрычных фігур (пункт, крывая, прамая, адрэзак, круг, трохвугольнік, квадрат, прамавульнік);
- ✧ назвы адзінак вымярэння даўжыні (дэцыметр, сантыметр), часу (гадзіна), масы (кілаграм), ёмістасці (літр).

***Валодаць прадметнымі і вучэбна-пазнавальнымі уменнямі.***

*Прадметныя ўменні:*

- ✧ лічыць прадметы ў межах 20;
- ✧ чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 20;
- ✧ складаць і аднімаць лікі ў межах 20 без пераходу праз дзясятак;
- ✧ рашаць задачы ў адно дзеянне, якія раскрываюць канкрэтны сэнс аперацый складання і аднімання, а таксама задачы на знаходжанне колькасці, якая на некалькі адзінак больш (менш) дадзенай;
- ✧ практычна параўноўваць і вымяраць велічыні: даўжыню, масу, ёмістасць;
- ✧ параўноўваць велічыні па іх лічбавых значэннях;
- ✧ выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (дэцыметр, сантыметр);
- ✧ чарціць адрэзак зададзенай даўжыні і вымяраць даўжыню дадзенага адрэзка;
- ✧ вызначаць час з дакладнасцю да гадзіны;
- ✧ распазнаваць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры;
- ✧ карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

*Вучэбна-пазнавальныя ўменні:*

- ✧ аналізаваць вучэбнае заданне (выдзяляць умовы і патрабаванне);
- ✧ разумець і супастаўляць інфармацыю, прадстаўленую ў выглядзе тэксту, малюнка, схемы, лікавага выразу або роўнасці;
- ✧ разумець інфармацыю, прадстаўленую ў таблічнай форме;
- ✧ параўноўваць і класіфікаваць прадметы па адной (дзвюм) прыкметах;
- ✧ вызначаць заканамернасці (правіла, па якім складзены шэраг прадметаў, фігур, лікаў і інш.) і выкарыстоўваць іх пры выкананні заданняў.

***Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:***

- ✧ арыенціроўкі ў навакольнай прасторы;
- ✧ ацэнкі памераў прадметаў «на вока», спосабамі прыкладання і накладання;
- ✧ параўнання прадметаў па масе і пасудзін па ёмістасці;

- ✧ вызначэння часу па гадзінах (з дакладнасцю да гадзіны);
- ✧ канструявання геаметрычных аб'ектаў;
- ✧ рашэння ў побыце розных задач, звязаных з лічэннем прадметаў і вылічэннямі.

***Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу***

- *Мураўёва, Г. Л.* Матэматыка. 1 клас : у 2 ч. / Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015.
- *Мураўёва, Г. Л.* Матэматыка. 1 клас. Рабочы сшытак : у 2 ч. / Г. Л. Мураўёва [і інш.] — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015.
- *Муравьёва, Г. Л.* Математика в 1 классе / Г. Л. Муравьева [и др.]. — Минск : Нац. ин-т образования, 2011, Аверсэв, 2015.
- *Чабатарэўская, Т. М.* Матэматыка. 1 клас : у 2 ч. / Т. М. Чабатарэўская, В. У. Нікалаева. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015.
- *Чабатарэўская, Т. М.* Матэматыка. 1 клас. Рабочы сшытак : у 2 ч. / Т. М. Чабатарэўская, В. У. Нікалаева. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015.
- *Чеботаревская, Т. М.* Математика в 1 классе / Т. М. Чеботаревская, В. В. Николаева. — Минск : Нац. ин-т образования, 2011.

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Чалавек і свет» складаецца з трох змястоўных кампанентаў «Прырода і чалавек», «Чалавек і яго здароўе», «Чалавек і грамадства», якія прадстаўляюць цэласную сістэму «прырода — грамадства — чалавек». Інтэграцыя біялагічных, валеалагічных, геаграфічных, грамадазнаўчых ведаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» дазваляе фарміраваць у вучняў цэласнае ўяўленне пра навакольны свет, развіваць цікавасць да яго вывучэння, патрэбу ў рознабаковым узаемадзеянні з ім.

**Мэта** вывучэння вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» у першым класе заключаецца ў фарміраванні ў вучняў ведаў і вопыту рознабаковага ўзаемадзеяння з навакольным светам, асноў экалагічнай культуры і здаровага ладу жыцця, паступовым авалоданні ўменнямі вучэбнай дзейнасці.

Дасягненне названай мэты прадугледжвае рашэнне наступных **задач**:

- забяспечыць засваенне вучнямі ўяўленняў пра аб'екты і з'явы прыроды, іх разнастайнасць, адзінства прыроднага і сацыяльнага, усведамленне сваёй ролі ў прыродзе і грамадстве;
- садзейнічаць развіццю эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды, набыццю вопыту выканання экалагічна абумоўленых нормаў прыродаахоўных паводзін;
- спрыяць развіццю патрэбнасці і здольнасці вучняў у захаванні і ўмацаванні свайго здароўя праз засваенне ведаў аб арганізме чалавека, кампанентах здаровага ладу жыцця і спосабах яго рэалізацыі;
- спрыяць фарміраванню пазнавальнай цікавасці да вывучэння прадмета, развіццю назіральнасці, маўлення, лагічнага мыслення, здольнасці да творчай самарэалізацыі ў працэсе вырашэння вучэбных задач.

Пры вызначэнні патрабаванняў да вынікаў навучання вучняў выкарыстаны кампетэнтнасны падыход, які прадугледжвае стварэнне ўмоў для рэалізацыі пераемнасці ў працэсе паступовага фарміравання асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый, неабходных для далейшага авалодання сістэматычнымі ведамі і спосабамі дзейнасці на наступнай ступені адукацыі. Дадзены падыход канкрэтызаваны ў раздзеле праграмы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў», дзе прадстаўлены абавязковы мінімум прадметных ведаў і ўменняў, якімі авалодваюць вучні за перыяд навучання ў першым класе.

У працэсе вывучэння вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» вучні маюць магчымасць сістэматызаваць, пашыраць, паглыбляць атрыманыя раней (у сям'і, дашкольнай установе, з асабістага вопыту ўзаемадзеяння з прыродай і людзьмі) уяўленні аб прыродных і сацыяльных аб'ектах, асэнсоўваць характар узаемадзеянняў чалавека з прыродай, асаблівасці ўзаемаадносін унутры асобных сацыяльных груп (сям'я, клас, школа). Вучні ўсведамляюць важнасць здаровага ладу жыцця, асвойваючы правілы бяспечных, экалагічна граматных і маральных паводзін у прыродзе і грамадстве.

У аснову змястоўнага кампанента «Прырода і чалавек» пры яго вывучэнні пакладзена канцэпцыя экалагічнай адукацыі асобы, што прадугледжвае засваенне экалагічных ведаў і ўменняў, фарміраванне здольнасці правільна і ўсвядомлена выкарыстоўваць іх у канкрэтных жыццёвых сітуацыях, выхаванне беражлівых і гуманных адносін да прыроды, жадання і здольнасці ўдзельнічаць у разнастайнай практычнай прыродаахоўнай дзейнасці. Засваенне прыродазнаўчага зместу стварае ўмовы для фарміравання важнейшых каштоўнасна-сэнсавых установак асобы, звязаных з перакананасцю ў самакаштоўнасці і цэласнасці прыроды; у тым, што ахова прыроды — абавязак кожнага чалавека.

Вывучэнне змястоўнага кампанента «Прырода і чалавек» пабудавана па прынцыпе сезоннасці, паколькі магчымасць і даступнасць непасрэдных назіранняў за зменамі ў нежывой і жывой прыродзе, працай людзей у розны час года даюць матэрыял для разумення ўзаемазалежнасці з'яў у прыродзе.

Змест вучэбнага матэрыялу пададзены такім чынам, каб у працэсе назірання ў прыродзе забяспечвалася пачуццёвая аснова для авалодання вучнямі такімі прыродазнаўчымі паняццямі,

як «прырода», «жывая прырода», «нежывая прырода», «расліны», «жывёлы», «сувязі паміж нежывой і жывой прыродай» і г. д. Першачарговае значэнне надаецца фарміраванню ў вучняў вопыту практычнай дзейнасці ў працэсе ажыццяўлення назіранняў у прыродзе. Пры гэтым вучні засвойваюць канкрэтныя веды пра расліны, жыццё дзікіх і свойскіх жывёл, сезонныя змены ў прыродзе і асаблівасці пор года, вучацца тлумачыць сувязі, якія існуюць паміж асобнымі элементамі нежывой прыроды, паміж нежывой і жывой прыродай, г. зн. пераконваюцца ў тым, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана, і што змены ў жыцці раслін і жывёл з'яўляюцца прыстасаваннем да змен у нежывой прыродзе.

На першым годзе навучання ў вучняў замацоўваюцца веды аб правілах асабістай і грамадскай гігіены, якія яны набылі ў дашкольным узросце. У працэсе атрымання звестак аб тым, чаму і як уплывае прырода на здароўе чалавека, пашыраюцца і паглыбляюцца веды пра спосабы захавання і ўмацавання здароўя, ажыццяўляецца адпрацоўка іх на практыцы.

Пры вывучэнні змястоўнага кампанента «Чалавек і грамадства» ў вучняў фарміруецца ўяўленне аб краіне, у якой яны жывуць, прыгажосці прыроды роднага краю. Вучні набываюць вопыт пабудовы добразычлівых адносін з аднакласнікамі і настаўнікамі, выканання правіл бяспечных паводзін у паўсядзённым жыцці.

Асаблівая ўвага надаецца развіццю маўлення і пазнавальных працэсаў вучняў (увагі, памяці, лагічнага мыслення, уяўлення). Уменне прымаць і ставіць задачы, планавання сваёй дзейнасці, самаацэнкі і карэкцыі яе вынікаў, пошуку і перапрацоўкі інфармацыі пры яе ўзнаўленні ўжо з першага класа становяцца спецыяльным прадметам іх паступовага фарміравання ў вучняў.

Важнае месца ў адукацыйным працэсе адводзіцца гульнявой дзейнасці, накіраванай на засваенне прадметных ведаў і ўменняў, іх ужыванне, развіццё пазнавальных працэсаў, захаванне і падтрыманне працаздольнасці вучняў, забеспячэнне іх патрэбы ў рухальнай актыўнасці, зняцце фізічнага і псіхічнага напружання.

Для паспяховага засваення зместу вучэбнага прадмета выкарыстоўваюцца разнастайныя метады і формы навучання, якія спрыяюць фарміраванню ў вучняў вопыту эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прадметаў і з'яў навакольнага свету, інтэграцыі інтэлектуальнага і эмацыянальнага кампанентаў у навучанні. Выкананню гэтых задач служаць назіран-

ні ў прыродзе, выкарыстанне літаратурных твораў, сродкаў музычнага і выяўленчага мастацтва, яркага і вобразнага расказа настаўніка. Правядзенне экскурсій у прыроду, па сваім населеным пункце, мэтавых прагулак, урокаў-падарожжаў, мікрадаследаванне дазваляе вучням набываць вопыт назірання як спосабу пазнання навакольнага свету, вывучэння навакольных аб'ектаў з дапамогай розных органаў пачуццяў, прадстаўлення вынікаў пазнання ў розных творчых работах (вырабах, малюнках, апавяданнях-апісаннях і да т. п.); сфарміраваць вопыт прыродаахоўных паводзін. Развіццё здольнасці вучняў да прадуктыўнай камунікацыі, да супрацоўніцтва забяспечвае выкарыстанне групавых, парных форм вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Прыродныя з'явы, якія ў змесце праграмы пазначаны зорачкай, вывучаюцца па меры іх наступлення ў прыродзе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (30 гадзін)

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

**Наша Радзіма — Беларусь.** Наша дзяржава — Рэспубліка Беларусь. Дзяржаўныя герб і сцяг Рэспублікі Беларусь.

Беларусь — край рэк, азёр, лясоў. Прыродная прыгажосць роднага краю. Месцазнаходжанне населенага пункта, дзе я жыву, і школы, у якой я вучуся. Мінск — сталіца нашай Радзімы.

## ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (26 гадзін)

### **Асеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека** (11 гадзін)

**Што такое прырода. Жывая і нежывая прырода.** Аб'екты прыроды і працы чалавека. Навакольны свет раслін і жывёл. Аб'екты жывой і нежывой прыроды, іх элементарныя прыкметы. Сонца — крыніца святла і цяпла, якія неабходны для жыцця раслін і жывёл.

**Змены ў нежывой прыродзе восенню.** Змены ў нежывой прыродзе восенню ў параўнанні з летам: зніжэнне вышыні Сонца над зямлёй і тэмпературы паветра і вады; змены віду ападкаў, першыя замаразкі*.

**Залатая восень. Расліны — частка жывой прыроды.** Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лістоў дрэў і кустоў. Лістапад. Завяданне травяністых раслін*. Прычыны асенніх змен у жыцці раслін.

Разнастайнасць раслін: дрэвы, кусты і травы. Расліны летам і восенню. Прыгажосць раслін. Выспяванне пладоў і насення, іх распаўсюджванне.

**Восеньскія плады і насенне** — крыніца здароўя. Агароднiна і садавіна — крыніцы вітамінаў. Правілы ўжывання агародніны і садавіны.

**Уплыў змен у прыродзе на жыццё чалавека восенню.** Як правільна апранацца восенню, загартоўваць арганізм. Чым карысныя асеннія прагулкі на свежым паветры, іх уплыў на здароўе і настрой чалавека.

**Правілы асабістай гігіены.** Догляд зубоў, пазногцяў і валасоў. Як даглядаць адзенне і абутак.

**Рэжым дня першакласніка.** Чаргаванне працы і адпачынку ў рэжыме дня. Чаму трэба выконваць рэжым дня.

**Дзікія і свойскія жывёлы.** Разнастайнасць жывёл. Адрозненне дамашніх жывёл ад дзікіх. Змены ў жыцці птушак, насякомых, звяроў і іншых жывёл. Беражлівыя адносіны да жывёл і клопат чалавека аб захаванні разнастайнасці жывёл.

**Змены ў жыцці свойскіх жывёл восенню. Уплыў змен у прыродзе на працу чалавека восенню.** Значэнне свойскіх жывёл для чалавека. Прыстасаванне свойскіх жывёл да змен у жыцці прыроды. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл.

Асеннія работы на палях, у садах, парках, на вуліцах гарадоў і вёсак. Уборка ўраджаю бульбы, капусты, буракоў і г. д., дапамога дзяцей.

**Асеннія з'явы ў прыродзе** (абагульняючы ўрок).

***Экскурсія*** «Змяненні ў нежывой прыродзе і жыцці раслін восенню», ***мэтавая прагулка*** ў лес, парк «Залатая восень у прыродзе», «Позняя восень».

**Фарміраванне вопыту практычнай дзейнасці.** Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх вуч-

ні вучацца вызначаць асеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін і жывёл; пазнаваць па адметных прыкметах некалькі дрэў і кустоў, а таксама птушак, нарыхтоўваць корм для зімуючых птушак і развешваць кармушкі; адлюстроўваць у малюнку, расказе-апісанні вынікаў назіранняў у прыродзе.

Вопыт выканання элементарных правіл асабістай гігіены, рэжыму дня.

## Зімовыя змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (5 гадзін)

**Змены ў нежывой прыродзе зімой. Як зімуюць расліны.** Змены ў нежывой прыродзе зімой у параўнанні з восенню: змяненне вышыні Сонца над зямлёй, тэмпературы паветра і вады; змена віду ападкаў. Снег і лёд, снегапады, завеі.* Хвойныя і ліставыя дрэвы і кусты зімой. Каго корміць дрэва ў зімовы час?

**Змены ў жыцці дзікіх жывёл зімой.** Чаму адны жывёлы на зіму засынаюць, а другія вядуць актыўны лад жыцця. Жыццё птушак зімой. Дапамога чалавека дзікім жывёлам. Удзел вучняў у падкормцы жывёл зімой.

**Змены ў жыцці свойскіх жывёл зімой. Уплыў зімовых змен у прыродзе на працу чалавека.** Прыстасаванне свойскіх жывёл да змен у жыцці прыроды. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Змены ў працы людзей зімой.

**Клопат чалавека пра сваё здароўе зімой.** Папярэджанне прастудных захворванняў. Як правільна апранацца і загартоўваць арганізм зімой. Значэнне для здароўя зімовых прагулак і гульняў на прыродзе. Правілы паводзін у снегапад, падчас галалёду, пры катанні на каньках, лыжах, санках.

**Зімовыя з'явы ў прыродзе** (абагульняючы ўрок).

***Экскурсія*** «Змяненні ў нежывой прыродзе зімой. Як зімуюць расліны» ці ***мэтавая прагулка*** ў прыроду «Прыгажосць зімовага лесу (парку, сквера)».

**Фарміраванне вопыту практычнай дзейнасці.** Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх вучні вучацца вызначаць зімовыя змены ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл; пазнаваць дрэвы і кусты ў зімовы час

(па сілуэтах, колеры ствала, галінках, пакінутых пладах, лісці, шышках (хвойныя дрэвы), некалькі відаў птушак; падкормліваць птушак.

## Вясеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (6 гадзін)

**Ранняя вясна.** Сакавік — першы месяц вясны. Змяненне месцазнаходжання Сонца над зямлёй. Павышэнне тэмпературы паветра. Раставанне снегу, крыгаход. Вясенні разліў рэк (паводка).*

**Вясна — час абуджэння раслін.** Набуханне пупышак на дрэвах і кустах. Раннеквітнеючыя расліны — крыніца корму для насякомых, якія абудзіліся пасля зімы. Неабходнасць беражлівых адносін да вясенніх першацветаў.

**Вясна і здароўе чалавека.** Як апранацца вясной. Прагулкі і гульні ў парку, скверы. Бяспечныя месцы для гульняў. Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной.

**Змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной.** Змены ў жыцці насякомых і іншых жывёл вясной. Вылет чмялёў, пчол, з'яўленне матылькоў, мурашак, жаб, рапух. Абуджэнне ад зімовай спячкі вожыкаў, барсукоў. Насякомыя — апыляльнікі раннеквітнеючых раслін. Змены ў жыцці птушак вясной. Прылёт і гнездаванне птушак. Залежнасць паміж тэрмінам прылёту птушак і наяўнасцю корму. Беражлівыя адносіны чалавека да птушак у вясеннюю пару года.

**Змены ў жыцці свойскіх жывёл вясной. Уплыў вясенніх змен у прыродзе на працу чалавека.** Прыстасаванне свойскіх жывёл да змен у жыцці прыроды з прыходам вясны. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Змены ў працы людзей вясной. Вясенняя праца на палях, у садах, парках, на вуліцах гарадоў і вёсак.

**Вясеннія з'явы ў прыродзе** (абагульняючы ўрок).

***Экскурсія*** «Раннеквітнеючыя расліны — упрыгожванне прыроды», ***мэтавыя прагулкі*** ў прыроду: «Ранняя вясна», «Вясна — час абуджэння раслін».

**Фарміраванне вопыту практычнай дзейнасці.** Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх вучні вучацца вызначаць прыкметы наступлення вясны ў нежывой

прыродзе, жыцці раслін; пазнаваць квітнеючыя расліны, дрэвы і кусты ў непасрэдным прыродным асяроддзі; насякомых, птушак.

## Змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека летам (4 гадзіны)

**Змены ў нежывой прыродзе і жыцці раслін летам.** Лета — самы цёплы час года. Летнія навальніцы. Расліны летам: цвіценне траў, паспяванне ягад.* Ядавітыя расліны.

**Жыццё дзікіх і свойскіх жывёл летам.** Звычкі дзікіх звяроў, птушак летам, іх клопат аб патомстве. Жыццё свойскіх жывёл летам. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Удзел дзяцей у ахове раслін і жывёл сваёй мясцовасці.

**Лета і здароўе чалавека.** Летняя загартоўка арганізма. Правілы прыёму сонечных і паветраных ваннаў. Гульні на паветры як ўмова захавання і ўмацавання здароўя. Правілы паводзін у лесе, на лузе, каля вадаёмаў, падчас навальніцы, пры сустрэчы з ядавітымі раслінамі, змеямі.

**Змены ў прыродзе і працы людзей у розныя поры года** (абагульняючы ўрок).

**Фарміраванне вопыту практычнай дзейнасці.** Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх вучні вучацца вызначаць наступленне першых прыкмет лета ў нежывой прыродзе, жыцці раслін у непасрэдным прыродным асяроддзі; вучацца элементарным правілам бяспечных паводзін падчас навальніцы, каля вадаёмаў, у лесе (з дапамогай мадэліравання сітуацый).

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА (3 гадзіны)

**Мой горад (вёска).** Назва населенага пункта, дзе я жыву. Галоўная вуліца (плошча) роднага горада (вёскі). Транспарт, якім людзі карыстаюцца ў сваім населеным пункце і неабходнасць захавання правілаў дарожнага руху. Культурна-асветніцкія ўстановы горада, вёскі (бібліятэка, кінатэатр, спартыўныя збудаванні). Выдатныя мясціны населенага пункта. Гаспадарчая дзейнасць жыхароў населенага пункта.

**Я і мая сям'я.** Значэнне сям'і ў жыцці чалавека. Добразычлівыя адносіны ў сям'і. Размеркаванне абавязкаў у сям'і. Пасільная дапамога дзяцей іншым членам сям'і. Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Адказнасць дзяцей за свае ўчынкі.

**Небяспечныя сітуацыі ў доме.** Меры бяспекі ў хатніх умовах (пры звароце з бытавой тэхнікай, вострымі прадметамі і г. д.). Правілы супрацьпажарнай бяспекі, асноўныя правілы абыходжання з газам, электрычнасцю, вадой. Нумары тэлефонаў экстранных службаў, па якіх можна выклікаць пажарную, аварыйна-выратавальную службу, міліцыю, хуткую медыцынскую дапамогу, аварыйную службу газавай сеткі.

***Экскурсія*** па населеным пункце «Мой горад (вёска)».

**Фарміраванне вопыту практычнай дзейнасці.** Засваенне вучнямі найпрасцейшых відаў дамашняй працы; навядзенне парадку ў класным пакоі; адпрацоўка падчас правядзення экскурсій і прагулак правілаў пераходу вуліцы, азнаямленне з правіламі выканання дарожнага руху ў ваколіцах школы; знаёмства з выдатнымі мясцінамі, размешчанымі ў раёне школы.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Ведаць:***

- назву краіны, дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь;
- назву сталіцы Беларусі і свайго населенага пункта;
- элементарныя прыкметы паняццяў «прырода», «нежывая прырода», «жывая прырода»;
- сезонныя прыкметы ў нежывой прыродзе, жыцці раслін і жывёл, працы людзей;
- асноўныя правілы прыродаахоўных паводзін у адносінах да раслін і жывёл;
- рэжым дня першакласніка і яго складальныя часткі;
- асноўныя правілы асабістай і грамадскай гігіены, бяспечных паводзін на вадаёмах, у лесе, у небяспечных сітуацыях дома, а таксама дарожнага руху;
- тэлефонныя нумары экстранных службаў;
- выдатныя мясціны сваёй мясцовасці (1—3).

***Умець:***

- весці назіранні за сезоннымі зменамі ў прыродзе, параўноўваць аб'екты, вызначаць прыкметы розных аб'ектаў прыроды з дапамогай органаў пачуццяў (колер і адценні колеру, форму, пах, параўнальныя памеры);
- выконваць рэжым дня;
- выконваць правілы асабістай гігіены;

*адрозніваць*:

- аб'екты прыроды і прадметы працы; аб'екты нежывой і жывой прыроды;
- некалькі відаў дрэў (3—4), кустоў (не менш 1—2),
- травяністыя расліны бліжэйшага акружэння (не менш за 2);
- агароднiна і садавіна (не менш за 3);
- некалькі відаў насякомых (не менш за 2—3), птушак (не менш за 3), звяроў (не менш за 4—5);
- некалькі відаў хатніх жывёл (не менш за 3);

*тлумачыць*:

- даступныя разуменню вучняў прычыны назіраемых сезонных змен у прыродзе;
- неабходнасць выканання правілаў прыродаахоўных паводзін;
- неабходнасць выканання правілаў асабістай гігіены і бяспечных паводзін;

***Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:***

- распазнавання раслін і жывёл бліжэйшага акружэння;
- апісання сезонных змен у прыродзе (нежывой, у жыцці раслін, жывёл і працы чалавека; на аснове назіранняў);
- устанаўлення сувязей паміж жыццём жывых арганізмаў і сезоннымі зменамі ў прыродзе;
- выканання правілаў аховы і ўмацавання здароўя ў розны час года, бяспечных паводзін у розных месцах, звароту па дапамогу ў небяспечных сітуацыях, якія ўзнікаюць дома;
- выканання правілаў паводзін у прыродзе і ажыццяўлення элементарнай прыродаахоўнай дзейнасці (падкормкі птушак, удзелу ў вырабе найпрасцейшых кармушак і да т. п.);
- аповеду пра выдатныя мясціны сваёй мясцовасці.

### *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу*

- *Удавічэнка, В. М.* Чалавек і свет. 1 клас / В. М. Удавічэнка, Т. А. Кавальчук. — Мінск : Народная асвета, 2012.
- *Доўнар, Л. А.* Чалавек і свет. 1 клас. Рабочы сшытак / Л. А. Доўнар. — Мінск : «Кузьма», 2015.

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Працоўнае навучанне на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі — арганічная састаўная частка адзінай сістэмы навучання, выхавання і развіцця вучняў. На занятках па працоўным навучанні адбываецца фарміраванне ведаў, уменняў, вопыту практычнай дзейнасці, якія маюць інтэгратыўны характар з прыродазнаўча-навуковымі і гуманітарнымі прадметамі, а таксама фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да працэсу і выніку вучэбна-працоўнай дзейнасці. Менавіта на занятках па працоўным навучанні магчыма рэалізацыя міжпрадметных сувязей і фарміраванне ўяўленняў аб разнастайных тэхналогіях, іх узаемасувязі з прыродай, грамадствам, а таксама ўплыў на жыццядзейнасць кожнага чалавека.

**Мэтай** вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» з'яўляецца фарміраванне асноў тэхналагічнай культуры вучняў. Дасягненне гэтай мэты забяспечваецца пры дапамозе фарміравання ў вучняў асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый.

**Задачы** вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» мяркуюць стварэнне ўмоў для фарміравання ў вучняў асноў кампетэнцый:

- мэтаматывацыйнай — здольнасці да каштоўнаснага і эмацыянальна-валявога ажыццяўлення працоўнай дзейнасці, да рэалізацыі творчых задум у працэсе вучэбна-пазнавальнай, пераўтваральнай і стваральнай дзейнасці;
- рэфлексійна-ацэначнай — здольнасці да самакантролю і самааналізу;
- інфармацыйна-камунікацыйнай — здольнасці пошуку інфармацыі, стварэння ўласнага інфармацыйнага прадукту (малюнак, эскіз і інш.);
- камунікатыўнай — здольнасці да прадуктыўнага супрацоўніцтва ў калектыўнай дзейнасці;

- ✧ прафарыентацыйнай — здольнасці арыентавацца ў свеце прафесій, сферах працоўнай дзейнасці чалавека;
- ✧ праектна-канструктарскай — здольнасці чытання графічнага відарыса вырабу, які мадэлюецца (канструіруецца), дзякуючы фарміраванню элементарных тэхніка-тэхналагічных ведаў;
- ✧ праектна-тэхналагічнай — здольнасці чытання тэхналагічнай дакументацыі (графічнага відарыса паслядоўнасці выканання тэхналагічных аперацый, схем складання) па якой выконваецца выраб;
- ✧ выканальніцкай — здольнасці да стваральнай і пераўтваральнай дзейнасці ў адпаведнасці з канструктарскай і тэхналагічнай дакументацыяй дзякуючы авалоданню культурай працы і спосабамі дзейнасці па выкананні асноўных тэхналагічных аперацый ручной працы.

Асноўнымі падыходамі, што рэалізуюцца на занятках па працоўным навучанні, з'яўляюцца: асобасна арыентаваны, дзейнасны і кампетэнтнасны.

Асобасна арыентаваны падыход на вучэбных занятках па працоўным навучанні патрабуе ўліку індывідуальных асаблівасцей вучняў, іх інтарэсаў, здольнасцей, каштоўнасных арыентацый, суб'ектыўнага вопыту, што дазваляе стварыць умовы кожнаму вучню для паспяховай рэалізацыі сябе ў спазнанні і дзейнасці.

Згодна з дзейнасным падыходам засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца ў працэсе ўласнай актыўнай дзейнасці. Дзейнасць пры гэтым разглядаецца як крыніца фарміравання асобы і галоўны фактар яе развіцця. У працэсе навучання важна актыўнае выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці (пазнавальнай, праектнай, камунікатыўнай, гульнявой, прыродаахоўнай).

Згодна з кампетэнтнасным падыходам галоўнае ў працэсе навучання не фарміраванне асобных ведаў і ўменняў, а стварэнне ўмоў для развіцця здольнасці ажыццяўляць прадугледжаныя праграмай віды і спосабы дзейнасці. У змесце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» выдзелены кампетэнцыі, якія ўяўляюць сабой сукупнасць інфармацыйных адзінак, якія ўключаюць тэарэтычныя звесткі, спосабы дзейнасці, тэхналагічныя аперацыі і працэсы, якія адлюстроўваюць змест і характар пэўнага віду дзейнасці.

Праграма прадугледжвае пераемнасць навучання ва ўстановах дашкольнай адукацыі, на I і II ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Апора на вопыт вучняў, улік іх здольнасцей і магчымасцей садзейнічаюць дасягненню неабходнага ўзроўню засваення зместу навучання.

Змест працоўнага навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўключае вывучэнне наступных асноўных раздзелаў:

- «Тэхналогія і грамадства»;
- «Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»;
- «Тэхналогія народных рамёстваў»;
- «Тэхналогія гаспадарання»;
- «Тэхналогія раслінаводства»;
- «Я і свет тэхналогій».

Раздзел ***«Тэхналогія і грамадства»*** дазваляе вучням усвядоміць узаемаўплыў тэхналогіі і грамадства (вытворчасці); актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дашкольнай адукацыі, стварыць арыенціровачную аснову для паспяховага навучання, пазнаёміць з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспекі працы.

У межах раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжана выкарыстанне вялікай разнастайнасці матэрыялаў як традыцыйных (папера, кардон, тканіна, ніткі, прыродныя матэрыялы), так і нетрадыцыйных (шпагат, тонкі шнур, саломінкі для кактэйлю і інш.), што забяспечвае магчымасць не толькі азнаямлення з шырокім пералікам матэрыялаў, але і спрыяе развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі вучняў.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць з найбольш даступнымі для вучняў I класа рамёствамі: выцінанка, фларыстыка. Арганізуючы заняткі ў рамках дадзенага раздзела, неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляценне, інкрустацыя саломкай, ткацтва, вышыўка, роспіс, фларыстыка, кераміка і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** спрыяе фарміраванню вопыту па самаабслугоўванні, культуры паводзін у побыце, выхаванню самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць вучняў з прыёмамі вырошчвання пакаёвых раслін і догляду іх.

Раздзел ***«Я і свет тэхналогій»*** прызначаны для падвядзення вынікаў навучання за год, аналізу вучэбна-працоўных дасягненняў кожнага вучня, вызначэння ўзроўню засваення вывучаных тэхналогій. У дадзеным раздзеле прадугледжана выкананне калектыўнага выніковага задання, у рамках якога кожны вучань стварае выраб на зададзеную тэму. Матэрыялы і тэхналогію вырабу вучні выбіраюць па ўласным жаданні.

Асноўнымі метадамі працоўнага навучання з'яўляюцца дэманстрацыя, практыкаванні, доследы і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, якія рэалізуюцца ў працэсе выканання вучнямі канкрэтных вырабаў, якія адпавядаюць патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка вучэбнага часу (не менш за 80 %) адводзіцца практычнай дзейнасці вучняў. На выкананне вырабу можа адводзіцца 1 ці 2 вучэбныя заняткі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму работы. Настаўнік можа выбраць любы з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні») ці падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія вырабу якіх адпавядае зместу раздзела, які вывучаецца. Настаўніку даецца магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % вучэбнага часу па ўласным меркаванні пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, якія прыведзены ў адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на вучэбных занятках, сустрэчы з людзьмі розных прафесій, прагулкі, экскурсіі.

У праграме выдзелены міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэграцыйны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

Курсівам з зорачкай пазначаны тэмы, якія з'яўляюцца неабавязковымі для вывучэння і могуць вывучацца па меркаванні настаўніка.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
# (30 гадзін)

## ТЭХНАЛОГІЯ І ГРАМАДСТВА
## (2 гадзіны)

### Уводзіны ў прадмет «Працоўнае навучанне»

***Тэарэтычныя звесткі.*** Чалавек, прырода, грамадства і свет тэхналогій. Праца ў нашым жыцці. Ручная праца. Прыгажосць і карысць рэчаў, якія вырабляюцца.

Крыніцы інфармацыі: падручнік, альбом «Цуда-майстэрня», сшытак самаацэнкі і інш.

Разнастайнасць канструкцыйных і прыродных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў. Беражлівыя адносіны да прыроды і навакольных прадметаў. Правілы арганізацыі рабочага месца. Правілы бяспекі працы. Рабочае адзенне.

Што мы ўмеем рабіць сваімі рукамі? (Гутарка пра вырабы, якія вучні стваралі ва ўстановах дашкольнай адукацыі і ў хатніх умовах.)

***Пераемныя сувязі (з дашкольнай адукацыяй).*** Ручная праца. Самаабслугоўванне. Гаспадарча-бытавая праца. Праца ў прыродзе. Канструяванне. Дзіцячы дызайн. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

***Прафесійная арыентацыя.*** Людзі розных прафесій. Прафесіі бацькоў.

***Практычная дзейнасць.*** Вызначэнне канструкцыйных матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў на аснове дэманстрацыі вырабаў настаўнікам. Арганізацыя рабочага месца.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Прыстасаванні для работы:* падстаўка для памазкоў для клею.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* складванне сурвэтак (з вопыту дашкольнай адукацыі).

## ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ
## (18 гадзін)

### Выкананне вырабаў з паперы і кардону (9 гадзін)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Віды паперы: паліграфічная, чарцёжная, абгортачная, газетная. Уласцівасці паперы: трываласць; шурпатасць; тэхналагічныя ўласцівасці (здольнасць да згінання, скручвання, разрыву, разразання, склейвання); колер. Сыравіна для вытворчасці паперы — драўніна і макулатура. Прымяненне паперы.

Асноўныя геаметрычныя фігуры: квадрат, прамавугольнік, трохвугольнік, многавугольнік, круг. Арнамент з геаметрычных фігур у паласе. Рытм у арнаменце. Правілы пабудовы кампазіцыі.

Элементы графічнай граматы: лінія разрэзу, лінія згібу, месцы нанясення клею. Схемы складання арыгамі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблону, трафарэта, згінаннем; абрыванне, згінанне, рэзанне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя віды паперы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, гладзілка, пamaзок для клею і інш.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

***Прафесійная арыентацыя.*** Прафесійная дзейнасць людзей па вырабу паперы. Гутарка «Як зрабілі сшытак?»

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Матэматыка:** узаемнае размяшчэнне прадметаў. Прамая і крывая лініі. Адрэзак. Даўжыня адрэзка. Вымярэнне даўжыні адрэзка. Сантыметр.

**Выяўленчае мастацтва:** кампазіцыя — запаўненне ўсёй паверхні плоскасці аркуша паперы. Гарманічнае размяшчэнне малюнка на аркушы паперы. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру малюнка памерам аркуша паперы. Узаемасувязь фігур кампазіцыі. Развіццё навыкаў самастойнага пошуку кампазіцыі. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні. Фарміраванне паняцця пра форму, яе прапорцыі. Элементарнае ўяўленне пра выразнасць колеру: колер радасны і сумны. Арнамент.

**Чалавек і свет:** уплыў людзей на жыццё раслін.

**Літаратурнае чытанне і беларуская мова:** узбагачэнне слоўнікавага запасу (драўніна, макулатура, трываласць, шурпатасць).

***Практычная дзейнасць.*** Вывучэнне ўласцівасцей паперы. Параўнанне ўласцівасцей розных відаў паперы. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх выяў. Чытанне схем складання арыгамі і графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, з элементамі творчасці: выбар матэрыялу, разметка дэталей квадратнай формы згінаннем, разметка дэталей па шаблоне, трафарэце, згінанне, абрыванне, выразанне па знешніх контурах, кампаноўка дэталей на аснове, наклейванне, склейванне, ацэнка гатовага вырабу і працэсу яго стварэння.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Прыстасаванні для працы:* каробачка для абрэзкаў паперы, закладка для кніг.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Караблік у моры», «Пунсовы ветразь», «Семіколеравая кветачка», «Ураджай» — абрыўная аплікацыя. «Матылькі», «Замак», «Машына», «Пунсовая кветачка» — аплікацыя з геаметрычных фігур. «Квітнеючы луг», «Рыбкі ў акварыуме», «На паляне», «Падарожжа на машыне», «У цырку» — сюжэтная аплікацыя. Упрыгожанні да свята (ланцужкі, зорачкі, сняжынкі) — канструяванне з палосак паперы.

*Цацкі:* фігуркі жывёл, рыб, птушак і інш. — арыгамі, канструяванне з палосак паперы.

*Дыдактычны матэрыял:* геаметрычны лічыльны матэрыял (прадметная аплікацыя), танграм.

## Выкананне вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (4 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Разнастайнасць тэкстыльных матэрыялаў. Першапачатковыя звесткі аб будове тканіны. Баваўняная тканіна (паркаль, фланель). Ніткі. Уласцівасці тэкстыльных матэрыялаў: трываласць, мяккасць, колер. Выкарыстанне тэкстыльных матэрыялаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, склейванне, выцягванне нітак тканіны, разразанне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: фланель, аднатонны паркаль, ніткі.

Інструменты і прыстасаванні: лякалы, кравецкая крэйда, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

***Прафесійная арыентацыя.*** Прафесія ткача. Гутарка «Як кашуля ў полі вырасла?»

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Выяўленчае мастацтва:** паняцце пра форму, яе прапорцыі. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Выразнасць колеру.

**Матэматыка:** вымярэнне даўжыні прадметаў.

**Літаратурнае чытанне і беларуская мова:** узбагачэнне слоўнікавага запасу (тэкстыльныя матэрыялы, баваўняная тканіна, фланель).

***Практычная дзейнасць.*** Распазнаванне паркалю і фланелі па знешнім выглядзе, навобмацак. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры з унясеннем творчых дапаўненняў: выбар матэрыялу, разметка дэталей па лякале, выкройванне дэталей, апрацоўка краю вырабу махрамі, выраб кутасіка, завязванне вузельчыка, падразанне канцоў, ацэнка гатовага вырабу і працэсу яго стварэння.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Прыстасаванні для працы:* ігольнік-кніжка.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* сурвэтка з махрамі, «Чароўны ўзор», «Цуда-кветка» (аплікацыя з нітак).

*Дэкаратыўныя элементы адзення:* кутасікі.

## Выкананне вырабаў з прыродных матэрыялаў (3 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Разнастайнасць прыродных матэрыялаў. Беражлівыя адносіны да прыроды. Уласцівасці матэрыялаў: форма, колер, памеры. Варыятыўнасць выкарыстання. Узаемасувязь, прапарцыянальнасць і суразмернасць частак вырабу.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, барбарысу, засушанае лісце і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера, ніткі.

***Прафесійная арыентацыя.*** Прафесіі тыпу «чалавек-прырода» (па Е. А. Клімаву).

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Выяўленчае мастацтва:** паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Чалавек і свет:** асеннія з'явы ў прыродзе. Выспяванне пладоў і насення раслін. Разнастайнасць і прыгажосць раслін. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

***Практычная дзейнасць.*** Дызайн-аналіз гатовых вырабаў. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўяўленні. Ажыццяўленне працэсу вырабу: падбор матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў, злучэнне дэталей, афармленне вырабу, аналіз-разважанне пра прыгажосць гатовага вырабу.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* фігуркі жывёл «Госці лесу», героі казак, мадэлі транспартных сродкаў.

*Цацкі:* «Пінгвіняты», «Кракадзіл Гена», «Залатая рыбка», «Матылёк», «Лесавічок», «Вожык» і інш.

## **Вырабы з нетрадыцыйных матэрыялаў** (2 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Нетрадыцыйнае выкарыстанне матэрыялаў. Другое жыццё рэчаў. Уласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюць пры стварэнні вырабаў. Асноўная форма, галоўныя і другарадныя дэталі, іх прапарцыянальныя суадносіны.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, разразанне, нанізванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка, саломінкі для кактэйлю, трубачкі ад фламастараў, стрыжняў.

Інструменты і прыстасаванні: пэндзаль для клею, нажніцы, аловак, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: клей, папера, тонкі кардон, ніткі.

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Выяўленчае мастацтва:** паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Літаратурнае чытанне і беларуская мова:** узбагачэнне слоўнікавага запасу (шпагат, лінейныя матэрыялы).

***Практычная дзейнасць.*** Вывучэнне ўласцівасцей матэрыялаў. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Састаўленне плана работы. Выкананне вырабаў па ўзоры, па ўласнай задуме: падбор матэрыялу, злучэнне шчыльнай паперы і лінейных матэрыялаў пры дапамозе клею, уцягванне ніткі ў іголку, разразанне і нанізванне трубачак, аналіз вырабу і працэсу яго стварэння.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Сёміколеравая кветачка», «Вясёлыя звераняты» — пано са шпагата (калектыўная праца), «Церамок», упрыгажэнні да свята — падвескі з трубачак.

*Цацкі:* «Парсючок», «Кацяня», «Шчанюк» з шпагата.

*Дыдактычны матэрыял:* канструктар «Дзівосныя трубачкі».

## ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ (5 гадзін)

### **Выцінанка** (2 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** «Беларуская выцінанка». Папера для выцінанак. Залежнасць формы вырабу ад спосабу складання і формы элементаў, якія выразаюцца. Сіметрычныя, рапортныя, разеткавыя ўзоры.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складанне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: тонкая белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

***Прафесійная арыентацыя.*** Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Выяўленчае мастацтва:** паняцце пра лінію і яе разнавіднасці. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні.

**Літаратурнае чытанне:** узбагачэнне слоўніка (выцінанка, сіметрыя і інш.).

***Практычная дзейнасць.*** Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў або іх відарысаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс стварэння вырабу. Выкананне вырабаў па гато-

вай разметцы, па ўяўленні: выбар, складанне паперы ў 2, 4 згібы, выразанне элементаў, аналіз выніку і працэсу выканання работы.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера:* «Цуда-сняжынкі», гірлянды.

*Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі:* «З Новым годам», «Усе ў госці да нас».

*Дыдактычны матэрыял:* лічыльны матэрыял (грушы, ялінкі, цюльпаны, домікі і інш.).

## **Фларыстыка** (3 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Правілы збору і засушвання лістоў. Беражлівыя адносіны да прыроды. Уласцівасці матэрыялаў: форма, колер, трываласць. Узор у паласе, квадраце. Рытмічная арганізацыя ўзора.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: лісце дрэў і кустоў, засушаныя ў плоскасці.

Інструменты: пэндзаль для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

***Прафесійная арыентацыя.*** Знаёмства з творчасцю беларускіх майстроў фларыстыкі.

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Выяўленчае мастацтва:** колеры восеньскай прыроды. Паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру выявы памерам аркуша паперы. Кампаноўка буйной выявы на аркушы паперы. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

**Чалавек і свет:** залатая восень. Разнастайнасць восеньскай афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

**Літаратурнае чытанне і беларуская мова:** узбагачэнне слоўнікавага запасу (фларыстыка, рытм і інш.).

***Практычная дзейнасць.*** Аналіз змянення ўласцівасцей матэрыялу пры засушванні. Аналіз гатовых вырабаў. Састаўленне плана работы. Мадэліраванне на паперы. Выкананне вырабаў па

ўзоры, па ўяўленні: выбар асновы, падбор лістоў, складанне кампазіцыі, разметка *размяшчэння лістоў на аснове**, наклейванне засушаных лістоў на аснову, аналіз выкананых вырабаў.

***Прыкладныя вучэбныя заданні:***

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: пано «Дыван з восеньскіх лістоў», «Узоры восені», «Восеньская казка», узор з лістоў у паласе, квадраце.

## ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ
## (3 гадзіны)

### Забеспячэнне побыту сям'і (3 гадзіны)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Віды дзейнасці па самаабслугоўванні ў хатніх умовах. Словы «хачу» і «трэба» ў нашых сем'ях. Электрычныя памочнікі. Эканомія электраэнергіі і вады.

Афармленне інтэр'ера пакоя да свята. Афармленне падарункаў.

Сервіроўка святочнага стала да чаю. Неабходны посуд. Складванне папяровых сурвэтак. Культура паводзін за сталом.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек-чалавек» (па Е. А. Клімаву). Гутарка «Добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца».

***Міжпрадметныя сувязі.***

**Чалавек і свет:** я і мая сям'я. Абавязкі дзіцяці ў сям'і. Небяспечныя сітуацыі дома. Правілы асабістай гігіены. Як даглядаць адзенне і абутак.

**Беларуская мова і літаратурнае чытанне:** успрыняцце і аналіз твораў (загадак, прыказак, казак і г. д.). Літаратурная творчасць і імправізацыя (складанне апавяданняў, казак). Культура гаворкі.

***Практычная дзейнасць.*** Арганізацыйна-дзейнасная гульня «Маміны (татавы) памочнікі». Афармленне падарункаў, класнага кабінета да свята (калектыўная работа). Сервіроўка стала да чаю.

## ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА
## (1 гадзіна)

### **Догляд пакаёвых раслін** (1 гадзіна)

***Тэарэтычныя звесткі.*** Прыгажосць і карысць пакаёвых раслін. Правілы догляду пакаёвых раслін.

***Прафесійная арыентацыя.*** Прафесіі тыпу «чалавек-прырода» (па Е. А. Клімаву).

***Міжпрадметныя сувязі.***
**Чалавек і свет.** Расліны — частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць раслін.
**Літаратурнае чытанне і беларуская мова:** узбагачэнне слоўнікавага запасу (назвы раслін).

***Практычная дзейнасць.*** Паліў і апырскванне раслін, рыхленне глебы, выдаленне пылу з лістоў, мыццё паддонаў.

## Я І СВЕТ ТЭХНАЛОГІЙ
## (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Выстаўка вырабаў, падрыхтаваных у бягучым годзе. Прэзентацыя і аналіз найлепшых вырабаў.

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для працы ў II класе: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупіны лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, пер’е і інш.; кветкі, лісце, галінкі раслін, засушаныя ў плоскасці; саломка.

***Практычная дзейнасць.*** Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем неабходных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

***Прыкладнае выніковае заданне:*** калектыўная работа «Танец матылькоў».

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Валодаць спосабамі дзейнасці:***

*кіравацца правіламі:*

- ✧ бяспекі працы, рацыянальнай арганізацыі рабочага месца і асабістай гігіены;

- беражлівых адносін да прыроды, інструментаў, прадметаў побыту;
- эканомнага расходавання матэрыялаў;
- працоўнай дысцыпліны;

*мець уяўленне аб:*

- прафесіях людзей з бліжэйшага акружэння;
- відах народных рамёстваў (выцінанка, фларыстыка);

*распазнаваць:*

- віды паперы, прыродныя матэрыялы, бавоўняныя тканіны (паркаль, фланель), вывучаныя нетрадыцыйныя матэрыялы;
- лініі згібу і разрэзу;
- злучэнне дэталей склейваннем, звязваннем, з дапамогай пластыліну;

*характарызаваць:*

- асноўныя інструменты пры рабоце з паперай, тэкстыльнымі і прыроднымі матэрыяламі, іх прызначэнне і правілы работы з імі;

*чытаць і разумець:*

- найпрасцейшыя схемы складання арыгамі;

*ажыццяўляць (выконваць):*

- арганізацыю свайго рабочага месца;
- разметку паперы па шаблоне, трафарэце, згінаннем, разметку тканіны па лекале;
- абрыванне паперы, разразанне паперы, тканіны, нітак, шпагату і інш.;
- злучэнне дэталей з паперы, тэкстыльных, прыродных і нетрадыцыйных матэрыялаў (склейванне, злучэнне з дапамогай пластыліну, звязванне, нанізванне і інш.);
- выкананне вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, эскізе, малюнку;
- аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;
- найпрасцейшыя работы па доглядзе пакаёвых раслін;
- сервіроўку стала да чаю.

***Выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:***

- планаваць сваю дзейнасць і кантраляваць яе ход;
- ажыццяўляць арганізацыю свайго рабочага месца;

- ✧ ажыццяўляць тэхналагічны працэс выканання вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка ці дарослага па ўзоры, эскізе, малюнку;
- ✧ ажыццяўляць аздабленне і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;
- ✧ ажыццяўляць найпрасцейшыя работы па доглядзе пакаёвых раслін;
- ✧ ажыццяўляць сервіроўку стала да чаю;
- ✧ выконваць правілы асабістай гігіены і бяспекі працы з матэрыяламі, інструментамі, электрапрыборамі.

### ***Вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу***

*Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:*

- *Журба, А. Ф.* Працоўнае навучанне. 1 клас / А. Ф. Журба, Н. А. Юрчанка. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2010.
- *Журба, А. Ф.* Трудовое обучение в 1 классе / А. Ф. Журба, Н. А. Юрченко. — Минск : Нац. ин-т образования, 2010.

*Матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне:*

- інструменты і прыстасаванні: нажніцы «школьныя», лінейка, аловак, памазок для клею, тоўстая іголка (цыравальная), стэкі, падкладная дошка, пульверызатар, лейка;
- асноўныя матэрыялы: папера (пісчая (белая і каляровая), чарцёжная, абгортачная, аксамітная, крэпіраваная), тонкі кардон; баваўняная тканіна (паркаль, фланель); ніткі; прыродныя матэрыялы (шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, барбарыса і інш.), засушанае лісце; шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка; саломінкі для кактэйлю, трубачкі ад фламастараў, стрыжняў, цукерак; папяровыя сурвэткі.
- дапаможныя матэрыялы: клей ПВА, клеючы аловак, пластылін.

# ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Выяўленчае мастацтва» адыгрывае значную ролю ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Ён закліканы вырашаць задачы, звязаныя з перадачай мастацкіх каштоўнасцей культуры, выпрацаваных чалавецтвам, з мэтай эмацыянальна-пачуццёвага і духоўна-маральнага развіцця асобы, фарміраваннем яе эстэтычнага вопыту і творчага патэнцыялу.

Зыходзячы са спецыфікі вучэбнага прадмета асноўнай ***мэтай*** навучання вучэбнаму прадмету з'яўляецца фарміраванне асноў мастацка-эстэтычнай, духоўна-маральнай культуры вучняў, азнаямленне з нацыянальным і сусветным мастацтвам, развіццё патрэбнасці ў мастацка-творчай дзейнасці.

Для рэалізацыі дадзенай мэты ставяцца наступныя ***задачы***:

- фарміраванне ўяўленняў аб маральна-эстэтычных каштоўнасцях нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне пачуцця павагі да культурнай спадчыны іншых народаў;
- выхаванне эстэтычнага стаўлення да рэчаіснасці, мастацтва, з'яў мастацкай культуры, развіццё эстэтычных пачуццяў і асноў эстэтычнага густу;
- развіццё здольнасцей эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі твораў мастацтва розных відаў і жанраў;
- навучанне асновам выяўленчай граматы; удасканаленне практычных уменняў і навыкаў выяўленчай, дэкаратыўна-прыкладной і канструктарска-дызайнерскай дзейнасці, лепкі;
- развіццё зрокавага ўспрымання, кампазіцыйнай і каларыстычнай культуры, прасторавага мыслення, уяўлення;
- развіццё мастацка-творчых здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў.

У вучняў пры вядучай ролі пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца элементы ўяўленняў, ведаў пра эстэтычныя і мастацкія з'явы. Вопыт назапашаных эмацыянальна-пачуццёвых уражанняў і эстэтычных перажыванняў знаходзіць адлюстраванне ў мастацка-творчай дзейнасці, спрыяе развіццю творчага патэнцыялу, мастацка-творчых здольнасцей. Асновай для мастацкай творчасці вучняў з'яўляецца сістэма выяўленча-выразных сродкаў пластычных (прасторавых) мастацтваў.

У выніку мастацкай творчасці вучнямі ствараюцца пасільныя мастацкія вобразы, якія ўдасканальваюцца па меры таго, як вучні авалодваюць ведамі, уменнямі і навыкамі ў галіне таго ці іншага віду мастацтва (графікі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну).

У выкладанні выяўленчага мастацтва рэалізуецца кампетэнтнасны падыход, які прадугледжвае інтэграцыю ведаў і творчую самарэалізацыю асобы, фарміраванне ў вучняў пачатковых ключавых кампетэнцый — асобасных, метапрадметных і прадметных.

Да асобасных кампетэнцый адносяцца: каштоўнаснае стаўленне да нацыянальнага мастацтва свайго народа і народаў свету; мастацка-вобразнае мысленне, назіральнасць і ўяўленне; наяўнасць эстэтычных інтарэсаў і патрэб, эмацыянальна-каштоўнасных крытэрыяў жыццядзейнасці.

Метапрадметнымі кампетэнцыямі, якія фарміруюцца пры вывучэнні выяўленчага мастацтва, з'яўляюцца: валоданне ўменнем «творчага бачання»; уменне рацыянальна арганізаваць працэс мастацка-творчай дзейнасці; імкненне мець зносіны з нагоды мастацтва, валоданне культурай сатворчасці.

*Прадметнымі (мастацка-эстэтычнымі) кампетэнцыямі* (па Б. М. Няменскаму) выступаюць: веданне відаў і жанраў пластычных мастацтваў, асаблівасцей відаў мастацкай дзейнасці (адлюстраванне, канструяванне, дэкарыраванне (упрыгожванне)); разуменне мастацка-вобразнай прыроды мастацтва; здольнасць эстэтычна ўспрымаць, эмацыянальна ацэньваць і аналізаваць (з пасільным ужываннем мастацтвазнаўчай тэрміналогіі) творы мастацтва, аб'екты і з'явы прыроды; прымяненне спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў у працэсе адлюстравання аб'ектаў, канструявання вырабаў з паперы, лепкі з пластыліну,

гліны, салёнага цеста, стварэння вобразаў у розных мастацкіх тэхніках: аплікацыя, мазаіка, калаж, выцінанка і інш.

**Асноўныя раздзелы вучэбнай праграмы:**

- «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці»;
- «Успрыманне твораў мастацтва»;
- «Практычная мастацка-творчая дзейнасць».

***«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці»*** як састаўная частка мастацкай дзейнасці мае ў праграме адносна самастойную сістэму вучэбных задач па фарміраванні эстэтычнай свядомасці і эстэтычных пачуццяў вучняў.

Асаблівая ўвага надаецца сферы эстэтычных і этычных каштоўнасцей нацыянальнай культуры, духоўна-эстэтычнага ўдасканалення чалавека, эстэтычнага асваення прыроднага свету і свету «другаснай прыроды» — архітэктурнага і прадметнага асяроддзя чалавека.

Задачай дадзенага змястоўнага кампанента праграмы з'яўляецца мэтанакіраванае развіццё ў вучняў назіральнасці, візуальнага ўспрымання формы і колеру прадметаў, уменні вызначаць адценні колеру аб'ектаў прыроды.

Змястоўны кампанент ***«Успрыманне твораў мастацтва»*** спрыяе засваенню вучэбнага прадмета на мастацтвазнаўчым узроўні. Яго задачай з'яўляецца фарміраванне ключавых арыенціраў успрымання твораў выяўленчага мастацтва, пашырэнне мастацкага кругагляду вучняў, вывучэнне тэарэтычных асноў выяўленчага мастацтва, засваенне яго мовы, сістэмы выразных сродкаў.

У выніку засваення зместу дадзенага раздзела праграмы вучні атрымліваюць уяўленне аб ролі мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, аб асновах нацыянальнага і сусветнага мастацтва, асаблівасцях розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва, іх узаемасувязі.

Пры засваенні вучнямі твораў айчыннай мастацкай спадчыны выхоўваецца любоў да роднай культуры, адчуванне яе нацыянальнай адметнасці, імкненне працягваць мастацкія традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца знаёмству з творчасцю прафесійных і народных майстроў, мясцовымі мастацкімі славутасцямі. Вывучэнне помнікаў архітэктуры і выяўленчага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў свайго рэгіёна, горада, сяла, вёскі, не толькі спрыяе далучэнню вучняў да творчасці на аснове мяс-

цовых традыцый, але і выхоўвае любоў да роднага краю, павагу да людзей, якія жывуць побач, фарміруе жаданне берагчы і множыць мастацкі набытак свайго рэгіёна.

Пры азнаямленні вучняў з раздзелам праграмы «Успрыманне твораў мастацтва» вельмі важным з'яўляецца развіццё навыкаў успрымання і аналізу твораў айчыннага і сусветнага мастацтва, фарміраванне ведаў і ўяўленняў аб творчасці мастакоў. Развіваюцца здольнасці вучняў суперажываць і эмацыянальна адгукацца на твор выяўленчага мастацтва, яго змест, уменне выказваць да яго свае адносіны. Вучні атрымліваюць навыкі ўспрымання твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, раскрываюць яго змест на аснове засвоеных паняццяў і тэрмінаў, адзначаюць даступныя іх разуменню мастацкія сродкі і раскрываюць іх ролю ў стварэнні мастацкага вобраза.

Пералік рэкамендаваных у праграме твораў з'яўляецца прыкладным. Настаўнік можа прапанаваць іншыя, раўнацэнныя ў мастацкіх адносінах творы. У гэтым выпадку падбор ілюстрацыйнага матэрыялу па ўспрыманні твораў мастацтва павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з тэматыкай раздзела, узроставымі асаблівасцямі дзяцей. Прыярытэтнае значэнне мае азнаямленне вучняў з творамі беларускай мастацкай спадчыны.

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва праз дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый павінна ажыццяўляцца на кожным уроку. Успрыманне аб'ектаў, з'яў рэчаіснасці і твораў мастацтва, іх шматаспектны аналіз папярэднічаюць выкананню практычнай работы: у пачатку занятка мяркуецца гутарка (мультымедыйная прэзентацыя), наступная яго частка — практычная рэалізацыя тэмы (стварэнне творчай кампазіцыі, лепка, дэкарыраванне вырабаў (эскіз роспісу, упрыгожвання адзення і да т. п.).

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела ***«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва»***, размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае 8 вучэбных гадзін.

У аснову змястоўнага кампанента ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»*** пакладзены прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэліравання свету. У працэсе засваення зместу дадзенага раздзела, які ажыццяўляецца на мастацка-творчым узроўні, набываецца вопыт творчай дзейнасці,

развіваюцца мастацкія здольнасці вучняў у галіне колера- і формаўтварэння, засвойваюцца прасторавыя з'явы, фарміруюцца навыкі лепкі, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці, мастацкага канструявання (дызайну).

На занятках выяўленчага мастацтва вучні малююць, лепяць з натуры, па памяці, па ўяўленні, канструіруюць, выконваюць работы ў розных мастацкіх тэхніках.

Працэс практычнай мастацка-творчай дзейнасці патрабуе стварэння ўмоў для праяўлення ў вучняў пачуцця радасці ад мастацкай працы, упэўненасці ў сваіх сілах, актыўнасці ў выбары мастацкіх сродкаў, тэхнікі і матэрыялу пры выкананні вучэбных і творчых заданняў (кампазіцый), фарміравання ўменняў самастойна выбіраць сюжэт і ўвасабляць творчую задуму на практыцы.

Раздзел «Практычная мастацка-творчая дзейнасць» уключае наступныя змястоўныя кампаненты:

- Адлюстраванне на плоскасці;
- Лепка;
- Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн.

*Адлюстраванне на плоскасці* ўключае маляванне з натуры, па памяці пасля непасрэдных назіранняў або па ўяўленні, выкананне сюжэтна-тэматычных кампазіцый, а таксама выкананне накідаў.

*Лепка* прадугледжвае азнаямленне вучняў з прыёмамі і спосабамі лепкі, лепку рэльефу і аб'ёмных форм.

Лепка, як від мастацкай дзейнасці мае асаблівае значэнне, паколькі рухальна-тактыльны кампанент выконвае дамінуючую ролю ў развіцці выяўленчай дзейнасці вучняў I класа.

*Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн* прадугледжвае азнаямленне з прыёмамі дэкаратыўнага абагульнення форм і колеру прадметаў (аб'ектаў), відамі арнаменту, асноўнымі кампазіцыйнымі схемамі, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару, выкананне кампазіцый з прыроднага матэрыялу (лісце, кветкі, травы і т. п.), у тэхніцы «аплікацыя», «манатыпія», «трафарэт» і інш.

Спалучэнне выяўленчай дзейнасці з аб'ёмна-прасторавымі відамі работ (лепкай, канструяваннем, мадэліраваннем), камбінаванне тэарэтычнага вывучэння асноў выяўленчай граматы з аналізам формы, прапорцый і канструкцыі прадмета, прымянен-

не і чаргаванне матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (гуаш, акварэль, каляровыя крэйды, туш, пластылін, гліна, аплікацыя, выцінанка, манатыпія і інш.) дазволяць вучням атрымаць уяўленне аб разнастайнасці сродкаў для стварэння мастацкага вобраза і ўменні свядома выбіраць матэрыял у залежнасці ад зместу і задумы работы.

Настаўніку даецца магчымасць выбару выяўленчых матэрыялаў для выканання вучнямі творчага задання з улікам іх пажаданняў, пераваг і ўзроставых асаблівасцей.

Асноўны прынцып выбару заданняў для практычнай дзейнасці вучняў — варыятыўны, які дазваляе індывідуалізаваць мастацка-творчы працэс, максімальна набліжаючы яго да асобы вучня. З гэтай мэтай у праграме прапануецца некалькі тэм (заданняў) па кожнай вучэбнай задачы. Але і яны з'яўляюцца прыкладнымі, дазваляючы вучням самастойна выбраць тэму, а таксама тэхніку выканання кампазіцыі, калі гэта не супярэчыць пастаўленай вучэбнай задачы.

Змест практычнай дзейнасці прадугледжвае вырашэнне чатырох асноўных груп вучэбных задач:

1) кампазіцыя;
2) форма, прапорцыі, канструкцыя;
3) колер і асвятленне;
4) прастора і аб'ём.

Засваенне гэтых груп задач, якія ляжаць у аснове выяўленчай граматнасці, павінна быць падпарадкавана свядомаму вырашэнню мастацкага вобраза ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучняў.

Практычную мастацка-творчую дзейнасць неабходна спалучаць з успрыманнем і аналізам твораў мастацтва, назіраннямі вучняў за аб'ектамі і з'явамі прыроды (праз экскурсіі і дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, рэпрадукцый мастацкіх твораў і фотаздымкаў). Накіды і замалёўкі, выкананыя падчас экскурсій на прыроду і прагляд мультымедыйных прэзентацый, могуць служыць асновай для стварэння мастацкага вобраза пры выкананні вучнямі творчых кампазіцый.

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»***, размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае 52 вучэбныя гадзіны.

Пры рэалізацыі вучэбнага зместу праграмы вучні знаёмяцца з асаблівасцямі розных мастацкіх тэхнік. Вялікае значэнне мае наглядны паказ (дэманстрацыя) настаўнікам прыёмаў работы з матэрыяламі і інструментамі.

Праграмай рэкамендуецца наступнае размеркаванне часу па раздзелах, змястоўных кампанентах (відах дзейнасці) і асноўных вучэбных праблемах (задачах).

## Размеркаванне часу па раздзелах праграмы

| Раздзелы праграмы | Колькасць гадзін |
|---|---|
| Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва | 8 |
| Практычная мастацка-творчая дзейнасць | 52 |
| **УСЯГО:** | **60** |

## Размеркаванне часу па раздзелу «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва»

| Віды дзейнасці | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва** | **8** |
| Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці | 3 |
| Успрыманне твораў мастацтва | 5 |

## Размеркаванне часу па раздзелу «Практычная мастацка-творчая дзейнасць»

| Віды дзейнасці | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Практычная мастацка-творчая дзейнасць** | **52** |
| Адлюстраванне на плоскасці | 30 |
| Лепка | 8 |
| Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн | 14 |

## Размеркаванне часу па асноўных вучэбных задачах (раздзел «Адлюстраванне на плоскасці»)

| Вучэбныя задачы | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Адлюстраванне на плоскасці** | **30** |
| Кампазіцыя | 11 |
| Прастора | 2 |
| Форма, прапорцыі, канструкцыя | 8 |
| Колер | 9 |

Асноўныя патрабаванні да зместу і метадаў выкладання выяўленчага мастацтва ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі заснаваны на наступных ***прынцыпах***:

- ✧ культуралагічная адпаведнасць — апора на культуру як сукупнасць усіх форм духоўнага быцця чалавека і грамадства;
- ✧ пераемнасць — метадалагічная аснова ўзаемасувязі зместу ўсіх звёнаў сістэмы мастацкай адукацыі;
- ✧ адзінства духоўна-маральнага, мастацка-эстэтычнага выхавання з засваеннем вучнямі мастацкіх ведаў, практычных навыкаў мастацкай дзейнасці;

- ✧ стварэнне мастацкага вобраза — мэта навучання; набыццё ведаў, засваенне вучнямі выяўленчых навыкаў і тэхнічных прыёмаў — сродкі для яе дасягнення;
- ✧ улік узроставых і індывідуальных псіхафізіялагічных асаблівасцей вучняў, рацыянальнае спалучэнне індывідуальных і калектыўных форм работы;
- ✧ дыялагічны характар зносін і атмасфера сатворчасці настаўніка і вучняў;
- ✧ рэалізацыя прынцыпу нагляднасці для фарміравання ўяўленняў вучняў аб відах і жанрах, паняццях і тэрмінах выяўленчага мастацтва, авалодання тэхнікамі і матэрыяламі, вобразнай сістэмай выяўленчага мастацтва;
- ✧ прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэліравання свету;
- ✧ прынцып інтэграцыі і ўзаемасувязі розных відаў мастацтваў (полімастацкасць) — выяўленчага мастацтва, музыкі, літаратуры і іншых, — з дапамогай якіх ствараецца асацыятыўна-вобразная атмасфера, неабходная для аптымальнага развіцця мастацкага мыслення вучняў;
- ✧ прынцып крэатыўнасці — рэалізацыя творчага патэнцыялу асобы ў мастацка-эстэтычнай адукацыі;
- ✧ прынцып эстэтызацыі жыццядзейнасці — унясенне элементаў прыгожага ва ўнутраны свет і вонкавае аблічча вучняў і навакольнае асяроддзе.

Метады работы з вучнямі на занятках разнастайныя: гутарка, аповед, дыскусія, прагляд мультымедыйнай прэзентацыі, самастойная работа з кнігай і інш. Вельмі эфектыўнымі з’яўляюцца такія формы арганізацыі навучання, як экскурсіі ў музеі, па горадзе, наведванне выстаў, сустрэчы і гутаркі з мастакамі; заняткі, пабудаваныя па законах мастацкай драматургіі; займальныя і гульнявыя формы работы.

Змест вучэбнага прадмета засвойваецца вучнямі без дамашніх заданняў.

У якасці дамашняй работы вучні могуць нарыхтаваць дапаможны матэрыял, паназіраць за пэўнымі аб’ектамі або з’явамі прыроды, падабраць рэпрадукцыйны матэрыял, падрыхтаваць паведамленне пра творчасць мастака або асобным творы мастацтва, выканаць замалёўкі і накіды з архітэктурнага ці скульптурнага помніка, наведаць мастацкі музей або мастацкую выстаўку і г. д.

Дадзеныя віды работ выконваюцца па жаданні вучняў і заахвочваюцца настаўнікам. Іх асноўнай мэтай з'яўляецца арыентацыя вучняў на эстэтычнае асваенне рэчаіснасці: прыроднага асяроддзя, помнікаў культуры, архітэктурных славутасцей свайго горада або вёскі і г. д.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
## (60 гадзін)

### УСПРЫМАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ І МАСТАЦТВА
### (8 гадзін)

#### Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці (3 гадзіны)

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў прыроды: разнастайнасць форм і колераў у прыродзе (кветкі, лісце, дрэвы). «Прагулка па гарадскім (сельскім) парку» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі); параўнальны аналіз формы, вызначэнне адценняў колеру садовых і лугавых кветак, знаходжанне падабенства і адрознення паміж імі. «Кветкі роднай зямлі» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў і з'яў прыроды: «Экскурсія па восеньскім парку (садзе)», «Экскурсія па веснавым парку (лесу)»; «Зіма-мастачка», «Снежныя скульптуры» (назіранне за станам прыроды ў розныя поры года, пажадана выкарыстанне мультымедыйных прэзентацый).

Эстэтычнае ўспрыманне архітэктуры Беларусі: «Прыгажосць сучасных архітэктурных збудаванняў Беларусі» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

Эстэтычнае ўспрыманне прадметнага свету: «Прыгажосць і карысць свету рэчаў» (пажадана выкарыстанне мультымедыйнай прэзентацыі).

#### Успрыманне твораў мастацтва (5 гадзін)

Роля выяўленчага мастацтва ў жыцці чалавека. Віды выяўленчага мастацтва: жывапіс (карціна), графіка (малюнак, ілюстрацыя). Творы мастакоў: *І. Шышкін.* «Раніца ў сасновым лесе»,

*В. Васняцоў.* «Алёнушка», ілюстрацыі да казак А. С. Пушкіна «Казка пра цара Салтана...», «Казка аб мёртвай царэўне і сямі волатах» і інш.

Віды і жанры выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура; нацюрморт, пейзаж, партрэт і інш.) — мастацкія творы на выбар настаўніка.

Мастацкі вобраз у розных відах выяўленчага мастацтва. Вобраз восені ў творах мастакоў: *С. Каткоў.* «Лагойскі матыў»; *Г. Вашчанка.* «Перад адлётам», «Бульба»; *Л. Шакінка.* «Бабіна лета»; *І. Левітан.* «Залатая восень»; *І. Бродскі.* «Апалае лісце»; *В. Паленаў.* «Залатая восень» і інш. (мастацкія творы на выбар настаўніка).

Настрой і стан прыроды ў пейзажах мастакоў (кампазіцыйнае і каларыстычнае рашэнне, эмацыянальнае значэнне колеру). Поры года ў творах мастакоў: *А. Астаповіч.* «Зімовы дзень»; *С. Герус.* «Зіма ў Менску»; *Л. Дударэнка.* «Зімовы дзень»; *В. Сумараў.* «Іней»; *М. Рамадзін.* «Незамярзаючая рэчка»; *Лі Дзі.* «Чалавек, які вядзе буйвала па снежнай раўніне»; *П. Масленікаў.* «Сакавіцкі вечар»; *А. Гугель.* «Бягуць раўчукі»; *В. Цвірка.* «Прыпяць. Вясна»; *В. Бялыніцкі-Біруля.* «Зялёны май», *П. Крохалеў.* «Вясна. Вяча», *І. Левітан.* «Вясна — вялікая вада», «Зноў вясна»; *С. Герасімаў.* «Вярба цвіце» (на выбар настаўніка).

Рэалістычныя, дэкаратыўныя і фантазійныя вобразы жывёл у выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (кафлі, прадметы народнага побыту і іх дэкор; творах мастакоў: *Я. Чарушын* — ілюстрацыі да кніг «Розныя звяры», «Дзеткі ў клетцы»; *В. Ватагін* — малюнкі жывёл; *В. Васняцоў.* «Гамаюн — птушка вешчая» і інш.).

Адзінства формы прадмета і яго аздаблення (агоўскія куфры, хахламскі посуд, жостаўскія падносы, дымкаўская цацка і інш.).

Беларускія ручнікі, посцілкі, паясы; народны саламяны, гліняны посуд і цацка. Функцыя, форма (канструкцыя) і дэкор вырабаў.

## ПРАКТЫЧНАЯ МАСТАЦКА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
(52 гадзіны)

### АДЛЮСТРАВАННЕ НА ПЛОСКАСЦІ
(30 гадзін)

### **Кампазіцыя** (11 гадзін)

Выбар палажэння ліста паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў. Адпаведнасць памеру выявы памеру ліста паперы. «Жырафа», «Бегемот», «Кракадзіл», «Слон», «Ракета», «Аўтобус», «Дом», «Волат», «Прыгажуня» і да т. п. (мастацкія матэрыялы на выбар настаўніка).

Кампаноўка выявы на лісце паперы. Узаемасувязь створаных аб’ектаў (фігур) у кампазіцыі. «Вясёлыя клоўны», «Паветраныя гімнасты», «Дрэсіроўшчыца і галубы» і да т. п. (гуаш, васковыя крэйды).

Гарманічнае запаўненне ліста паперы выявамі, выдзяленне кампазіцыйнага цэнтра. Маляванне пейзажа па памяці і ўяўленню: «Ясны восеньскі дзень», «Сумная восень», «Восеньская непагадзь» (гуаш або акварэль).

Паняцце пра кампазіцыйную ўзаемасувязь аб’ектаў, якія адлюстроўваюцца (размяшчэнне прадметаў адносна адзін аднаго). «Снягурка і Дзед Мароз», «Два Мароза», «На будоўлі», «Убіраем яблыкі» (гуаш або акварэль).

Перадача характару і нораву жывёл (добры, злы, хітры, даверлівы, цікаўны і г. д.). Маляванне па ўяўленні вобразаў беларускіх і рускіх народных казак («Храбры певень», «Змей Гарыныч», «Кот Максім»), твораў К. Чукоўскага, С. Маршака і інш. На выбар вучняў (гуаш або акварэль).

Перадача характэрных асаблівасцей знешняга аблічча і настрою чалавека. «Мая матуля», «Мы з татам гуляем у шахматы», «Бабуля вяжа шалік», «Мой любы дзядуля», «Мая сястрычка (мой брацік) з цацкай» і да т. п. (гуаш або акварэль).

### **Прастора** (2 гадзіны)

Перадача глыбіні прасторы ў малюнку: «на першым плане», «на другім плане». Выкананне кампазіцыі «Летні адпачынак», «На беразе возера», «На дачы», «На прышкольным участку», «Зімовая прагулка» (каляровыя алоўкі, гуаш).

## **Форма, прапорцыі, канструкцыя** (8 гадзін)

Перадача ў кампазіцыі формы, прапорцый і канструкцыі аб’ектаў, якія адлюстроўваюцца: «Восеньскі нацюрморт», «Дары лесу», «Агародніна і садавіна» і да т. п. (гуаш або акварэль), «Нацюрморт з простых прадметаў побыту» (матэрыялы на выбар настаўніка).

Перадача ў малюнку характэрных асаблівасцей будовы дрэў (форма, канструкцыя). Маляванне на аснове назіранняў: «Зімовы лес», «Чароўныя дрэвы», «Магутны дуб», «Стройная бярозка» (гелевая ручка з чорным чарнілам, фламастар).

Перадача ў кампазіцыі характэрных асаблівасцей будовы фігуры чалавека і жывёлы (канструкцыя, прапорцыі). «Артысты цырка на арэне» (акрабат, клоўн, жанглёр, дрэсіроўшчык і інш.) (гуаш або акварэль).

## **Колер** (9 гадзін)

Колер і фарбы. Паняцце пра асноўныя (жоўты, чырвоны, сіні), састаўныя (аранжавы, фіялетавы, зялёны) колеры, светлыя і цёмныя адценні колеру. Выкананне кампазіцый: «Рознакаляровыя паветраныя шары», «Рознакаляровыя флагі», «Цвецік-рознацвецік» «Папараць-кветка», «Пунсовая кветачка», «Вішня (яблыня) цвіце» (гуаш або акварэль).

Эмацыянальна-вобразны змест колеру: радасны і сумны, рэзкі і пяшчотны, спакойны і напружаны: «Добрыя і злыя персанажы казак», «Русалачка», «Кентаўр», «Птушка Сірын» і інш. (гуаш або акварэль).

Кампазіцыйныя магчымасці колеру. Цёплы, халодны і змешаны каларыт. Выкананне шматпланавых кампазіцый: «Ясны восеньскі (зімовы) дзень», «Сумная восень», «Восеньская непагадзь», «Выглянула сонейка» (гуаш або акварэль).

## **ЛЕПКА**
## (8 гадзін)

Прыёмы лепкі. Лепка садавіны і агародніны: «Восеньскі нацюрморт» (яблык, груша, сліва, агурок, перац, памідор і інш.) (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Спосабы лепкі. Складанне цэлага з асобных частак: лепка персанажаў казак і мультфільмаў «Цуда-Юда — трохгаловы змей», «Ліса», «Віні-Пух» (рознакаляровы пластылін), «Жывёлы на арэне цырка» і інш. (гліна, аднакаляровы пластылін або салёнае цеста; калектыўная работа), «Я катаюся на лыжах (санках)» (гліна ці пластылін).

Перадача формы цела і пластыкі жывёл: «Шчаня», «Кошка з кацянятамі», «Мядзведзь», «Казляня» (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Дэкаратыўнае вырашэнне вобраза пры лепцы цацак. Лепка цацкі ў падарунак родным (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Лепка рэльефу: «Рыбка», «Нацюрморт», «Дэкаратыўны букет» (рознакаляровы пластылін).

## ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ДЫЗАЙН (14 гадзін)

Дэкаратыўнае абагульненне формаў і колеру прадметаў (стылізацыя). Пано для школьнай сталовай (кухні) «Дэкаратыўны нацюрморт» (гуаш).

Дэкаратыўнае абагульненне формаў расліннага і жывёльнага свету (стылізацыя). Фрыз: «Кветкі, матылькі і птушкі», «Мая Беларусь» (гуаш).

Прыёмы выканання кампазіцыі «Кветкавыя матывы», «Пацешныя жывёлы» ў тэхніцы «фларыстыка».

Прыёмы выканання кампазіцыі «Восеньскі букет» у тэхніцы «манатыпія».

Віды выцінанкі. Прыёмы выканання кампазіцыі «Дрэва жыцця» ў тэхніцы «выцінанка».

Віды арнаменту. Эскіз арнаменту для ўпрыгожвання «кажушка», «рукавічак» і «шапачкі» для Снягуркі; пано для спальні, гасцінага пакоя, падноса, хусткі для спадарыні Мяцеліцы (гуаш).

Прыёмы стварэння кампазіцый дэкаратыўна-прыкладнога характару (асноўныя кампазіцыйныя схемы). Выкананне эскіза: «Хустка для мамы», «Дыван для лялькі», «Посуд для Васілісы Прыгожай, Бабы Ягі» (гуаш).

Віды аплікацыі (прадметная, сюжэтная, дэкаратыўная). Прыёмы вырэзвання элементаў аплікацыі: «Запаслівы вожык»,

«Дрэсіраваны леў», «Пудзель Арто», «Вясёлая малпачка», «Зімовы пейзаж» (збліжаныя і кантрасныя адценні паперы).

Рытм у дэкаратыўнай кампазіцыі. Фрыз: «Вясновыя кветкі», «Сняжынкі» (аплікацыя; калектыўная работа).

Прыёмы выканання рэльефнай кампазіцыі з паперы «Новы год у лесе», «У трыдзявятым царстве» (калектыўная работа).

Прыёмы выканання кампазіцый, вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка»: «Запрашальны білет», «Віншавальная паштоўка», ёлачныя цацкі, навагоднія сувеніры.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Ведаць / разумець:***

- адметныя асаблівасці асноўных відаў мастацтва (графіка, жывапіс, скульптура, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);
- сродкі мастацкай выразнасці твораў графікі, жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- назвы асноўных і састаўных колераў; эмацыянальна-вобразныя магчымасці колеру;
- назвы мастацкіх матэрыялаў, інструментаў, прыстасаванняў і правілы работы з імі;
- адметныя асаблівасці гуашавых і акварэльных фарбаў, прыёмы работы з дадзенымі мастацкімі матэрыяламі;
- прыёмы лепкі, трансфармацыі паперы, выканання аплікацыі, выцінанкі, манатыпіі і інш.;
- асаблівасці кампазіцыйнага размяшчэння аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца;
- паслядоўнасць выканання жывапіснай, графічнай і скульптурнай (рэльефнай, аб'ёмнай) кампазіцый, аплікацыі, манатыпіі, выцінанкі і інш;
- асноўныя кампазіцыйныя схемы, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару.

***Умець:***

- выбіраць фармат ліста і яго палажэння ў залежнасці ад зместу кампазіцыі;
- поўнасцю выкарыстоўваць плоскасць ліста паперы, маляваць прадметы суразмерна фармату;

- передаваць характэрныя асаблівасці формы прадметаў;
- састаўляць колеры, неабходныя для рэалізацыі творчай задумы;
- запаўняць малюнак колерам, не пакідаючы прабелаў паміж фігурамі і фонам;
- працаваць з мастацкімі матэрыяламі, інструментамі і прыстасаваннямі (гуаш, пластылін, васковая крэйда, туш, каляровая папера, клей, пэндзлі, палачкі);
- выбіраць дэкор у адпаведнасці з формай і прызначэннем прадмета;
- упрыгожваць плоскія і аб'ёмныя прадметы арнаментам;
- выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і ўборка працоўнага месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прыстасаванняў);
- актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні і ацэнцы работ аднакласнікаў.

***Выкарыстоўваць (прымяняць) у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:***

- спецыяльную (мастацтвазнаўчую) тэрміналогію (лексіку);
- рацыянальныя прыёмы рэзання паперы;
- аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак;
- аптымальныя спосабы лепкі;
- розныя мастацкія тэхнікі для вырашэння творчай задумы.

### *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу*


- *Шкуратава, М. А.* Выяўленчае мастацтва / М. А. Шкуратава. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2011.
- *Шкуратова, М. А.* Изобразительное искусство в I классе / М. А. Шкуратова. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2011.
- *Ткач, Е. В.* Изобразительное искусство: художественно-творческие задания: 1 класс / Е. В. Ткач. — Минск : Аверсэв, 2013.
- *Ткач, Е. В.* Изобразительное искусство: тестовые задания. 1—4 классы / Е. В. Ткач. — Минск : Аверсэв, 2013.

# МУЗЫКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі вучэбнаму прадмету «Музыка» належыць асаблівая роля. Ён цэласна ўздзейнічае на асобу, фарміруе светаадчуванне, светаўспрыманне і светапогляд падрастаючага чалавека; забяспечвае ўвядзенне вучняў у свет музычнага мастацтва, садзейнічае раскрыццю іх мастацка-творчага патэнцыялу; стварае ўмовы для творчага самавыяўлення, аказвае дапамогу ў набыцці мастацкага бачання свету.

Праграма вучэбнага прадмета «Музыка» грунтуецца на асноватворным прынцыпе канцэпцыі Д. Б. Кабалеўскага, у адпаведнасці з якім музыка вызначаецца як «жывое вобразнае мастацтва, жыццём народжанае і да жыцця звернутае».

У аснове тэматычнай пабудовы праграмы ляжыць распрацаваная Д. Б. Кабалеўскім сістэма абагульненых уяўленняў аб музыцы як аб важнай частцы культуры грамадства і самакаштоўным выглядзе мастацтва. Логіка пабудовы праграмы адлюстроўвае дыялектыку ўзаемадзеяння музыкі і жыцця. Рашэнню звышзадачы «Музыка — Жыццё» садзейнічае пільная ўвага да сацыяльных функцый музычнага мастацтва, яго ўздзеянню на духоўны свет падрастаючага чалавека.

Падобная накіраванасць да жыцця дазваляе вылучыць у праграме метапрадметны, жыццёвы змест, які спрыяе фарміраванню ў вучняў цэласнай карціны свету («Свет, што гучыць вакол нас», «Прыродныя і механічныя гукі», «Інтанацыя» і інш.). Фарміраванню цэласнай мастацкай свядомасці садзейнічае зварот да з'яў і паняццяў, якія выходзяць за межы музычнага мастацтва (кампазіцыя, форма, рытм, «пульс» (метр) і інш.).

***Мэта*** вывучэння вучэбнага прадмета «Музыка» — выхаванне ў вучняў музычнай культуры як часткі іх духоўнай культуры.

***Задачы:***

- фарміраванне эстэтычнага стаўлення да рэчаіснасці;
- выхаванне любові да музыкі, мастацкага густу;
- засваенне музычнага мастацтва (авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі);
- назапашванне вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці;
- развіццё музычных і творчых здольнасцей.

Згодна з праграмай засваенне музычнага мастацтва адбываецца ў формах самога мастацтва. Вучэбная дзейнасць ажыццяўляецца як мастацкая па змесце і вучэбная па форме.

Рэалізацыя праграмы прадугледжвае выкарыстанне ўніверсальных метадаў праблематызацыі зместу і мадэліравання мастацка-творчага працэсу. Для вырашэння канкрэтных задач выкарыстоўваюцца метады мастацкага, маральна-эстэтычнага пазнання музыкі, перспектыўных і рэтраспектыўных сувязей, эмацыянальна-сэнсавай драматургіі і інш.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца ўрок. Урок музыкі трактуецца як урок мастацтва, для якога характэрна гнуткая структура і наяўнасць эмацыянальна-сэнсавай драматургіі.

Узмацненню сувязі працэсу навучання з жыццём садзейнічае шырокае прымяненне інтэрактыўных тэхналогій, фасілітацыйных дыскусій і мастацка-творчых праектаў. Апошнія дазваляюць індывідуалізаваць адукацыйны працэс, арганізаваць яго з улікам патрэб і магчымасцей вучняў, даюць магчымасць выбару пазіцыі кампазітара, выканаўцы, слухача пры засваенні мастацкага матэрыялу. Мастацка-творчыя праекты могуць уключаць такія віды дзейнасці, як слуханне, спевы, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, тэатралізацыя, складанне, імправізацыя, рытмадэкламацыя і інш.

Праграма прадугледжвае ўзаемадзеянне і інтэграцыю розных відаў мастацтва (музыка, літаратура, харэаграфія, выяўленчае мастацтва, тэатр) пры вырашэнні канкрэтнай мастацкай задачы. Ажыццяўляемы пры гэтым выхад за межы выразнай сістэмы музычнага мастацтва забяспечвае разгляд музычных з'яў у шырокім мастацкім кантэксце, дае магчымасць выявіць агульныя асновы мастацкай творчасці, асвоіць у практычнай форме заканамернасці ўзаемадзеяння мастацтваў.

Праграма заклікана пабудаваць сістэму ўстойлівых сувязей паміж музычным мастацтвам і «паўсядзённай» культурай, жыццёвым і мастацкім вопытам вучняў. У гэтай сувязі вывучэнне традыцыйнай музычнай культуры (фальклору) ажыццяўляецца з улікам лакальных традыцый. Для вывучэння культуры народаў, якія насяляюць Рэспубліку Беларусь, прадугледжаны «рамачны змест» у адпаведных раздзелах праграмы.

У мэтах фарміравання грамадзянскай культуры вучняў рэкамендуецца штогадовы зварот да Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь для слухання і выканання.

Праграма дае настаўніку прастору для творчасці, якая можа выяўляцца ў выбары і размеркаванні мастацкага матэрыялу, мастацка-драматургічным планаванні ўрока, ажыццяўленні адукацыйнага працэсу ў цэлым.

Прапанаванае ў праграме планаванне з’яўляецца прыкладным і дае настаўніку магчымасць самастойна канструяваць змест кожнага ўрока. Аднак «...творча падыходзячы да праграмы, настаўнік ні ў якім выпадку не павінен разбураць яе тэматычную пабудову, таму што паслядоўнае развіццё пэўных тэм — аснова асноў гэтай праграмы» (Д. Б. Кабалеўскі).

Мастацкі рэпертуар, прадстаўлены ў праграме, з’яўляецца прыкладным. Яго прымяненне ажыццяўляецца з улікам асаблівасцей класа і ўзроўню музычнай падрыхтоўкі вучняў. Дапускаецца самастойны выбар твораў для слухання і выканання ў адпаведнасці з крытэрыямі мастацкасці і даступнасці музычнага матэрыялу.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### *I чвэрць*

### СВЕТ ГУКАЎ
(8 гадзін)

Адукацыйны працэс у I чвэрці прадугледжвае фарміраванне ў вучняў:

***ведаў (на ўзроўні ўяўленняў) аб:***

- ✧ разнастайнасці гукаў навакольнага свету;
- ✧ выразных і выяўленчых магчымасцях музыкі;
- ✧ разнастайнасці музычных інструментаў;

***уменняў:***

- ✧ успрымаць музыку як мастацтва, непарыўна звязанае з жыццём;
- ✧ эмацыянальна адгукацца на музычны твор;
- ✧ перадаваць мастацка-вобразны змест твораў у выканальніцкай дзейнасці (спевах, інструментальным музіцыраванні, рытмадэкламацыі і інш.);
- ✧ удзельнічаць у калектыўнай творчай дзейнасці пры ўвасабленні мастацкіх вобразаў;
- ✧ даваць ацэнку вынікам калектыўнай музычнай дзейнасці на ўзроўні асобасных эмацыянальных адносін;
- ✧ услухоўвацца ў гукі навакольнага свету і арыентавацца ў іх разнастайнасці;
- ✧ адрозніваць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці прыродныя, механічныя і музычныя гукі;
- ✧ перадаваць з дапамогай музычных гукаў пэўны настрой;
- ✧ ствараць гукавыя карціны.

## Прыкладнае планаванне тэмы

1. Свет, што гучыць вакол нас (1 гадзіна).
2. Прыродныя і механічныя гукі (1 гадзіна).
3. Музыка — краіна гукаў (1 гадзіна).
4. Карціны, створаныя пры дапамозе гукаў (2 гадзіны).
5. Настрой, перададзены пры дапамозе гукаў (2 гадзіны).
6. Абагульняючы ўрок па тэме «Свет гукаў» (1 гадзіна).

Гукавая разнастайнасць навакольнага свету (свету прыроды і чалавека). Магчымасць прайгравання гукаў жэстамі, якія «гучаць».

Характэрныя асаблівасці прыродных і механічных гукаў. Разнастайнасць гукаў прыроды. Крыніцы механічных гукаў.

Асаблівасці музычных гукаў. Адрозненне музычных гукаў ад гукаў прыродных і механічных.

Выразныя магчымасці гукаў. Стварэнне гукавых карцін.

### *Прыкладны музычны матэрыял*

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н. Сакалоўскага*, сл. *М. Клімковіча* і *У. Карызны.*

Беларускія народныя песні «Ладу-ладу-ладкі», «Белабока сарока», «Дожджык», «Іграў я на дудцы».

«Где живет музыка». Муз. і сл. *В. Каваліва.*

«Слова на ладошках». Муз. *А. Паплянавай*, сл. *Н. Пікулевай.*

«Солнышко», «Дождик». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Дымавай.*

«Осень». Муз. *М. Красева*, сл. *М. Івенсэн.*

«По грибы». Муз. *У. Алоўнікава*, сл. *М. Алтухова.*

*С. Пракоф'еў.* «Дождж і вясёлка», «Казачка» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячая музыка»).

*Г. Вагнер.* «Зязюлька», «Песенька».

*Р. Шуман.* «Песенька жняцоў», «Паляўнічая песенька» (са зб. фартэпіянных п'ес «Альбом для юнацтва»).

*Э. Грыг.* «Птушачка».

*А. Хачатуран.* «Вячэрняя казка».

*П. Падкавыраў.* «Ку-ку».

*Д. Шастаковіч.* «Катрынка».

*Ж. Ф. Рамо.* «Курыца».

*Н. Рымскі-Корсакаў.* «Акіян — мора сіняе» (аркестравае ўступленне да оперы «Садко»).

## *II чвэрць*

### ЯК РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА
### (8 гадзін)

Адукацыйны працэс у II чвэрці прадугледжвае фарміраванне ў вучняў:

***ведаў (на ўзроўні ўяўленняў) аб:***

- ✧ музычнай мове і яе выразных магчымасцях;
- ✧ гукаперайманні;

***уменняў:***

- ✧ бачыць сувязь выразных сродкаў музычнага твора з яго жыццёвым зместам;
- ✧ эмацыянальна і свядома ўспрымаць музыку;
- ✧ перадаваць музычна-сэнсавы змест твораў у выканальніцкай дзейнасці (спевах, інструментальным музіцыраванні, рытмадэкламацыі і інш.);

- ✧ удзельнічаць у калектыўнай і індывідуальнай творчай дзейнасці пры ўвасабленні мастацкіх вобразаў;
- ✧ даваць эмацыянальную і зместавую ацэнку вынікам калектыўнай і індывідуальнай музычнай дзейнасці;
- ✧ дыферэнцыраваць выяўленчыя і выразныя магчымасці музыкі;
- ✧ выкарыстоўваць прыёмы гукаперайманні ў працэсе мастацкай дзейнасці;
- ✧ распазнаваць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці розныя спосабы адлюстравання вялікага і маленькага, высокага і нізкага, хуткага і павольнага, светлага і цёмнага, блізкага і далёкага.

## Прыкладнае планаванне тэмы

1. Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў (1 гадзіна).
2. Гукаперайманне (1 гадзіна).
3. Святло і цень у музыцы (лад) (1 гадзіна).
4. Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп) (1 гадзіна).
5. Блізкае і далёкае ў музыцы (дынаміка) (1 гадзіна).
6. Халоднае і цёплае ў музыцы (тэмбр) (1 гадзіна).
7. Высокія і нізкія гукі (рэгістр) (1 гадзіна).
8. Абагульняючы ўрок па тэме «Як расказвае музыка» (1 гадзіна).

Роля гукаў у стварэнні музычных карцін. «Выяўленчасць» і «выразнасць» у музыцы.

Гукаперайманне. Прыёмы гукаперайманні.

Спосабы перадачы святла і цені ў музыцы. Выразныя магчымасці лада.

Спосабы перадачы хуткага і павольнага ў музыцы. Выразныя магчымасці тэмпу.

Спосабы перадачы гучнага і ціхага ў музыцы. Выразныя магчымасці дынамікі.

Спосабы перадачы халоднага і цёплага ў музыцы. Разнастайнасць музычных тэмбраў.

Высокія і нізкія гукі ў музыцы. Выразныя магчымасці рэгістраў.

## *Прыкладны музычны матэрыял*

Беларускія народныя песні «Чубаценькі верабей», «Гэй ты, воўчанька».

«Пайшоў коўзацца каток». Муз. народная, сл. *С. Шушкевіча.*

«Зімовая калыханка». Муз. *Л. Свердзеля*, сл. *В. Вярбы.*

«Добрый жук». Муз. *А. Спадавекіа*, сл. *Я. Шварца.*

«Догадайся, кто поет». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *А. Гангава.*

«Здравствуй, зимушка-зима». Муз. *А. Філіпенка*, сл. *Т. Волгінай.*

«Новогодняя хороводная». Муз. *А. Астроўскага*, сл. *Ю. Ляднёва.*

«Бубенчики». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *Л. Дымавай.*

«Песенка друзей». Муз. *В. Герчык*, сл. *Я. Акіма.*

«Новогодняя». Муз. *В. Каваліва*, сл. *А. Навуменкі.*

*І. Брамс.* «Пятрушка».

*Р. Шуман.* «Смелы коннік», «Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы», «Дзед Мароз» (са зб. фартэпіянных п'ес «Альбом для юнацтва»).

*Р. Сурус.* «Галоп», «Калыханка», «Жарты».

*К. Сен-Санс.* «Куры і пеўні», «Антылопы», «Чарапаха» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

*К. Цесакоў.* «Гульня ў снежкі», «Снежны вальс».

*С. Картэс.* «У некаторым царстве» (з маленькай сюіты для фартэпіяна «Казка»).

*Ж. Ф. Рамо.* «Тамбурын».

*Д. Кабалеўскі.* «Клоўны».

*В. Агафоннікаў.* «Сані са званочкамі».

*П. Чайкоўскі.* «Вальс снежных камякоў», «Танец Феі Дражэ» (з балета «Шчаўкунок»).

## *III чвэрць*

### З ЧАГО ВЫРАСЛА МУЗЫКА
(9 гадзін)

Адукацыйны працэс у III чвэрці прадугледжвае фарміраванне ў вучняў:

***ведаў (на ўзроўні ўяўленняў) аб:***

✧ песні, танцы, маршы як першааснове музычнага мастацтва;

- разнастайнасці песень, танцаў, маршаў;
- метры (пульсацыі) і яго ролі ў музыцы;

***уменняў:***

- успрымаць музыку як жывое, вобразнае мастацтва, народжанае жыццём і непарыўна з жыццём звязанае;
- эмацыянальна і свядома ўспрымаць і выконваць музыку;
- перадаваць музычна-сэнсавы змест твораў у выканальніцкай дзейнасці (спевах, інструментальным музіцыраванні, рытмадэкламацыі і інш.);
- удзельнічаць у калектыўнай і індывідуальнай творчай дзейнасці пры ўвасабленні мастацкіх вобразаў;
- ацэньваць вынікі музычнай дзейнасці, выказваць асабістае стаўленне да зместу музыкі;

- вызначаць настрой у музыцы;
- распазнаваць песню, танец, марш;
- выконваць раўнамерны «пульс» у музыцы рознага характару, вылучаць моцныя і слабыя долі «пульсу»;
- выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;
- мадэліраваць меладычны і рытмічны малюнак песеньтанцаў, песень-маршаў.

## Прыкладнае планаванне тэмы

1. З чаго пачынаецца музыка (1 гадзіна).
2. Песня, танец, марш (1 гадзіна).
3. Жывы «пульс» музыкі (1 гадзіна).
4. Якія бываюць маршы (1 гадзіна).
5. Якія бываюць танцы (2 гадзіны).
6. Песня ў жыцці чалавека (1 гадзіна).
7. Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы (1 гадзіна).
8. Абагульняючы ўрок па тэме «З чаго вырасла музыка» (1 гадзіна).

Жанравая разнастайнасць музыкі. «Першасныя» музычныя жанры: песня, танец, марш.

Пульсацыя (метр). Моцная і слабыя долі «пульсу» (метра).

Марш. Розныя віды маршаў (спартыўны, ваенны і інш.).

Танец. Віды танцаў.

Песня. Песні народныя і кампазітарскія. Змест песень. Выразнасць выканання песень.

Песня-танец, песня-марш. Асаблівасці песень-танцаў і песеньмаршаў.

### *Прыкладны музычны матэрыял*

Беларуская вясновая песня «Ідзі, зіма, ды да Кракава».

Беларуская дзіцячая гульня «А на гары мак».

«У нашым класе» (марш, полька, вальс, песня). Муз. *Д. Кабалеўскага.*

«Калыханка». Муз. *В. Раінчыка*, сл. *Г. Бураўкіна.*

«Песенка о гномиках». Муз. і сл. *В. Каваліва.*

«Веселый музыкант». Муз. *А. Філіпенка*, сл. *Т. Волгінай.*

«Солнечные зайчики». Муз. *А. Паплянавай*, сл. *В. Татарынава.*

«Барабан». Муз. *Л. Сімаковіч*, сл. *Б. Жанчака.*

«Птенчики». Муз. *А. Цілічэевай*, сл. *М. Долінавай.*

«Весна». Нямецкая народная песня, рускі тэкст *С. Карапыгінай.*

«Солдатик». Муз. *Г. Курына*, сл. *М. Карэма*, пер. *М. Кудзінава.*

«Начинаем перепляс». Муз. *С. Сасніна*, сл. *П. Сіняўскага.*

«Мама». Муз. *Л. Бакалава*, сл. *С. Вігдарава.*

*Дж. Вэрдзі.* «Марш» (з оперы «Аіда»).

*Л. Бакерыні.* «Менуэт».

*П. Чайкоўскі.* «Песня жаваранка», «Марш драўляных салдацікаў» (са зб. фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

*Д. Кабалеўскі.* «Танец маладога бегемота».

*С. Баневіч.* «Вальс на балі», «Паўночная полька» (з альбома «Па казках Ганса Хрысціяна Андэрсена»).

*В. Кузняцоў.* «Марш».

*Г. Гарэлава.* «Таўстун, які танцуе».

*К. Сен-Санс.* «Слон», «Акварыум», «Зязюля ў глыбіні лесу» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

*М. Мусаргскі.* «Гапак» (з оперы «Сарочынскі кірмаш»).

*М. Глінка.* «Полька».

*С. Пракоф’еў.* «Марш».

*С. Чарнецкі.* «Сустрэчны марш».

*М. Блантэр.* «Футбольны марш».

*В. Агапкін.* «Развітанне славянкі».

*І. Штраус.* «Вальс».

*С. Рахманінаў.* «Італьянская полька».

*Д. Шастаковіч.* «Вальс-жарт».

*Л. Шлег.* «Калыханка маці» (з сюіты-казкі «Пакаці-гарошак» для 4-струннай домры і фартэпіяна).

## *IV чвэрць*

### ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА
### (9 гадзін)

Адукацыйны працэс у IV чвэрці прадугледжвае фарміраванне ў вучняў:

***ведаў (на ўзроўні ўяўленняў) аб:***

- музыцы як з'яве, здольнай «распавядаць» гісторыі;
- здольнасці музыкі адлюстроўваць характар, перадаваць розныя пачуцці;
- здольнасці музыкі перадаваць рух;
- ролі музыкі ў народным свяце;

***уменняў:***

- бачыць у змесце музыкі адлюстраванне канкрэтных жыццёвых з'яў;
- знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;
- удзельнічаць у мастацка-творчым працэсе на ўсіх яго стадыях: ад задумы да практычнага ўвасаблення;
- самастойна ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці з пазіцый слухача, выканаўцы, кампазітара;
- знаходзіць узаемасувязь зместу музычнага твора з выкарыстанымі аўтарам сродкамі музычнай выразнасці;
- перадаваць пачуцці, настрой ва ўласнай мастацкай дзейнасці;
- адлюстроўваць з'явы навакольнага свету мастацкімі сродкамі.

### Прыкладнае планаванне тэмы

1. Музычныя гісторыі, расказаныя кампазітарамі (1 гадзіна).
2. Музыка перадае пачуцці чалавека (2 гадзіны).
3. Музыка адлюстроўвае розныя рысы характару (1 гадзіна).
4. Музыка перадае рух (1 гадзіна).

5. Музыка малюе карціны (2 гадзіны).

6. Музыка народнага свята (1 гадзіна).

7. Абагульняючы ўрок па тэме «Пра што расказвае музыка» (1 гадзіна).

«Музычныя гісторыі». Узаемасувязь зместу музычных твораў са сродкамі музычнай выразнасці, выкарыстанымі аўтарам.

Выразныя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы ўнутранага стану чалавека. Перадача пачуццяў (пяшчоты, радасці, трывогі), настрояў (весялосці, бадзёрасці, смутку).

Адлюстраванне ў музыцы характару чалавека.

Выяўленчыя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы руху. Перадача ў музыцы вобразаў прыроды. Поры года ў музыцы.

Роля музыкі ў народным святе.

### *Прыкладны музычны матэрыял*

Эстонская народная песня «Узяў валынку наш сусед».

Украінская народная песня «Ідзі, ідзі, дождж ык».

«Пастушок». Муз. *П. Падкавырава*, сл. *Я. Журбы.*

«Окликание дождя». Муз. *А. Лядава*, сл. народныя.

«Бесконечная песенка». Муз. *В. Каваліва*, сл. *В. Семерніна.*

«Волчок». Муз. *І. Арсеева*, сл. *Л. Дымавай.*

«Ягорачка». Муз. *В. Сярых*, сл. народныя.

*Э. Грыг.* «Матылёк».

*Ж. Бізэ.* «Ваўчок».

*Л. К. Дакен.* «Зязюля».

*П. Чайкоўскі.* «Хвароба лялькі», «Новая лялька» (са зб. фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

*Г. Свірыдаў.* «Упарты».

*К. Сен-Санс.* «Лебедзь» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

*А. Залётнеў.* «Балет мышэй».

*Д. Кабалеўскі.* «Труба і барабан», «Упарты братачка», «Сумная гісторыя».

*В. Рэбікаў.* «Мядзведзь».

*А. Лядаў.* «Музычная табакерка», «Кікімара».

*І. Арсееў.* «У госці» («Пешшу», «На веласіпедзе», «На машыне»).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Да канца першага года навучання ў вучняў фарміруюцца:

***веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:***

- ✧ разнастайнасці гукаў навакольнага свету;
- ✧ разнастайнасці музычных інструментаў;
- ✧ выразных і выяўленчых магчымасцях музыкі;
- ✧ першасных музычных жанрах (песні, танцы, маршы), іх разнастайнасці;
- ✧ метры (пульсе) і яго ролі ў музыцы;
- ✧ здольнасці музыкі «распавядаць» гісторыі;
- ✧ ролі музыкі ў народным свяце;

***уменні:***

- ✧ успрымаць музыку як жывое, вобразнае мастацтва, народжанае жыццём і непарыўна з жыццём звязанае;
- ✧ бачыць сувязь выразных сродкаў музычнага твора з яго зместам;
- ✧ эмацыянальна і свядома ўспрымаць і выконваць музыку;
- ✧ перадаваць мастацка-вобразны змест твораў у выканальніцкай дзейнасці (спевах, інструментальным музіцыраванні, рытмадэкламацыі і інш.);
- ✧ удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;
- ✧ знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;
- ✧ ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці з пазіцый слухача, выканаўцы, кампазітара;
- ✧ услухоўвацца ў гукі навакольнага свету і арыентавацца ў іх разнастайнасці;
- ✧ дыферэнцаваць выяўленчыя і выразныя магчымасці музыкі;
- ✧ распазнаваць прыродныя, механічныя, музычныя гукі і выкарыстоўваць іх ва ўласнай мастацкай дзейнасці; выкарыстоўваць прыёмы гукапераймання; ствараць гукавыя карціны;
- ✧ распазнаваць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці розныя спосабы адлюстравання вялікага і маленькага, высокага і нізкага, хуткага і павольнага, светлага і цёмнага, блізкага і далёкага;

- ✧ выконваць раўнамерны «пульс» у музыцы рознага характару, вылучаць моцныя і слабыя долі «пульсу»; мадэліраваць меладычны і рытмічны малюнак песень-танцаў, песень-маршаў;
- ✧ распазнаваць песню, танец, марш; адрозніваць іх віды;
- ✧ выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі.

### *Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу*


- *Ковалив, В. В.* Музыка в 1 классе / В. В. Ковалив, А. Ю. Ковалив. — Минск : Народная асвета, 2012.
- *Ковалив, В. В.* Музыка. 1 класс. Нотная хрестоматия / В. В. Ковалив, М. Б. Горбунова. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012.
- *Горбунова, М. Б.* Контрольно-измерительные материалы. Музыка. Тестовые задания. I—IV классы / М. Б. Горбунова. — Минск : Аверсэв, 2012.

# ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета. У сістэме вучэбных прадметаў на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі вывучэнне вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» забяспечвае атрыманне вучнямі асноў базавай фізкультурнай адукацыі.

Адукацыйны працэс, накіраваны на засваенне зместу вучэбнага прадмета, аказвае развіваючы ўплыў на сучасны светапогляд вучняў, фарміруе інтэлектуальныя, псіхічныя, псіхафізічныя, маральна-валявыя і іншыя якасці асобы. Акрамя гэтага рэгламентаваная рухальная актыўнасць вучняў на вучэбных занятках накіравана ў першую чаргу на дасягненне аздараўленчага эфекту. У вучняў у рэжыме вучэбнага дня, тыдня, месяца рэгулярна аднаўляецца і павышаецца разумовая (інтэлектуальная) і фізічная працаздольнасць. У выніку рэзультатам засваення зместу вучэбнага прадмета з'яўляюцца ўмацаванне здароўя, прафілактыка захворванняў, фарміраванне здаровага ладу жыцця вучняў.

Вучэбны прадмет «Фізічная культура і здароўе» мае аздараўленчае, выхаваўчае, агульнаінтэлектуальнае, культуралагічнае значэнне, вырашае задачы рознабаковага фізічнага, інтэлектуальнага, духоўна-маральнага развіцця і аздараўлення вучняў.

**Мэтай** вывучэння вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» ў І класе з'яўляецца фарміраванне фізічнай культуры асобы і аздараўленне вучняў з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Мэта прадмета дасягаецца ў выніку рашэння адукацыйных, выхаваўчых і аздараўленчых задач.

**Адукацыйныя задачы:**

- фарміраванне даступных у малодшым школьным узросце фізкультурных ведаў;
- навучанне рухальным уменням і навыкам, спосабам фізкультурнай дзейнасці;

- навучанне прымяненню засвоеных фізкультурных ведаў, рухальных уменняў і навыкаў у пазаўрочны час.

**Выхаваўчыя задачы:**

- выхаванне адносін да ўласнага здароўя і здароўя іншых як да каштоўнасці;
- садзейнічанне станаўленню і развіццю патрэбнасці ў рэгулярнай фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай актыўнасці;
- садзейнічанне гарманічнаму фізічнаму, духоўна-маральнаму, інтэлектуальнаму і эмацыянальнаму развіццю;
- выхаванне дысцыплінаванасці, сумленнасці, стараннасці, добразычлівасці, калектывізму, спагадлівасці, смеласці;
- навучанне ўменням і навыкам супрацоўніцтва з аднагодкамі ў працэсе фізкультурнай і спартыўнай дзейнасці.

**Аздараўленчыя задачы:**

- прафілактыка захворванняў, стрэсавых станаў;
- фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця сродкамі фізічнай культуры;
- умацаванне фізічнага здароўя вучняў;
- развіццё каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей;
- садзейнічанне markознабаковаму фізічнаму развіццю;
- фарміраванне правільнай паставы;
- фарміраванне ўяўленняў, ведаў, уменняў і навыкаў бяспечных паводзін падчас арганізаваных і самастойных гульняў, фізкультурных заняткаў у экалагічна неспрыяльных умовах (для тых, хто пражывае ва ўмовах уздзеяння вынікаў аварыі на ЧАЭС).

Матэрыял вучэбнай праграмы размеркаваны па наступных раздзелах (табліца 1):

«Уводзіны ў школьнае жыццё»;

«Асновы фізкультурных ведаў»;

«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»;

«Развіццё рухальных здольнасцей».

Змест урокаў раздзела ***«Уводзіны ў школьнае жыццё»*** пераважна складаюць добра знаёмыя вучням рухавыя гульні, гульнявыя заданні і эстафеты.

Тэмы раздзела «Асновы фізкультурных ведаў» вывучаюцца на ўроках фізічнай культуры на працягу навучальнага года ў форме непрацяглых (3—5 хвілін) апавяданняў, гутарак.

Раздзел ***«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»*** ўключае ў сябе фізічныя практыкаванні, якія складаюць змест «школы рухаў»: хадзьбу, бег, скачкі, кіданне, лажанне, практыкаванні ў раўнавазе, акрабатычныя практыкаванні, элементы спартыўных і рухавых гульняў, перамяшчэнне на лыжах, плаванне.

Змест раздзела ***«Развіццё рухальных здольнасцей»*** сфарміраваны з рухавых гульняў і гульнявых заданняў, тэставых практыкаванняў для вызначэння ўзроўня развіцця рухальных здольнасцей вучняў, прыкладных рэкамендацый па рухальным рэжыме вучняў на тыдзень.

На кожным уроку фізічнай культуры і здароўя рэкамендуецца планаваць гульнявую дзейнасць вучняў. Пры выкарыстанні на ўроках рухавых гульняў і гульнявых заданняў вырашаюцца наступныя **задачы:**

- замацаванне і ўдасканаленне рухальных уменняў, навыкаў і вывучаных спосабаў дзейнасці;
- развіццё каардынацыйных (дакладнае ўзнаўленне прасторавых, часавых і сілавых характарыстык рухаў, захоўванне раўнавагі, хуткае і своечасовае рэагаванне на зменлівыя сітуацыі, узгодненасць адначасовых і паслядоўных рухаў рознымі часткамі цела, прайграванне тэмпу і рытму рухаў) і кандыцыйных (хуткасных, сілавых, хуткасна-сілавых, агульнай вынослівасці, гнуткасці) здольнасцей.

Змест вучэбнай праграмы разлічаны на яго засваенне вучнямі, па стане здароўя якія аднесены да асноўнай і падрыхтоўчай медыцынскіх груп. Вучні, аднесеныя па стане здароўя да спецыяльнай медыцынскай групы, займаюцца асобна ад урокаў фізічнай культуры і здароўя па спецыяльных праграмах, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Перавод з адной медыцынскай групы ў другую ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Вучні, якія вызвалены па медыцынскіх паказаннях ад рухальнай актыўнасці на ўроках фізічнай культуры і здароўя, прысутнічаюць на іх і выконваюць спецыяльныя індывідуальныя заданні пад кантролем настаўніка.

Пры засваенні зместу вучэбнай праграмы падчас урокаў фізічнай культуры і здароўя ў вучняў фарміруюцца асобасныя і прад-

метныя кампетэнцыі, якія сфармуліраваны ў патрабаваннях да вучняў, якія заканчваюць I клас установы агульнай сярэдняй адукацыі. Названыя кампетэнцыі канкрэтызаваны па чатырох падгрупах:

- вучні павінны мець уяўленне;
- вучні павінны ведаць, разумець і выконваць;
- вучні павінны валодаць навыкамі і спосабамі дзейнасці;
- вучні павінны ўмець выкарыстоўваць набытыя веды, уменні, навыкі на ўроках і ў паўсядзённым жыцці.

Вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў і ступень засваення зместу вучэбнай праграмы «Фізічная культура і здароўе» ацэньваюцца па крытэрыях і ў адпаведнасці з правіламі правядзення атэстацыі вучняў, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» прадстаўлена ў дадатку 1.

Навык выканання тэставых практыкаванняў фарміруецца на ўроках фізічнай культуры выключна для матывацыі вучэбнай дзейнасці вучняў, індывідуалізацыі і карэкцыі зместу адукацыйнага працэсу. Вучні першага класа выконваюць тэставыя практыкаванні толькі адзін раз у вучэбным годзе — у маі. Умовы выканання тэставых практыкаванняў для індывідуальнага вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцей вучняў выкладзены ў дадатку 2.

У мэтах эфектыўнага рашэння задач фізічнага выхавання вучняў першых класаў змест урокаў фізічнай культуры і здароўя павінен быць цесна ўзаемазвязаны з іх рухальнай актыўнасцю ў рэжыме вучэбнага і падоўжанага дня, з іх удзелам у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах.

Для павышэння аздараўленчага эфекту вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» рэкамендуецца як мага часцей праводзіць заняткі на адкрытых прышкольных пляцоўках.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

## *Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу*

*Табліца 1*

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Уводзіны ў школьнае жыццё** | **4** |
| **Асновы фізкультурных ведаў** | **3** |
| Асновы бяспекі заняткаў | 0,5 |
| Гігіенічныя веды | 0,5 |
| Здаровы лад жыцця | 1 |
| Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі | 0,5 |
| Алімпізм і алімпійскі рух | 0,5 |
| **Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці** | **61** |
| Страявыя практыкаванні | 3 |
| Агульнаразвіццёвыя практыкаванні | 8 |
| Хадзьба | 2 |
| Бег | 4 |
| Скачкі | 5 |
| Кіданне | 4 |
| Лажанне | 5 |
| Акрабатычныя практыкаванні | 8 |
| Практыкаванні ў раўнавазе | 4 |
| Элементы спартыўных і рухавых гульняў | 10 |
| Перамяшчэнне на лыжах[1] | 8 |
| *Плаванне*[2] | *да 16 г* |

[1] Ва ўмовах бясснежнай зімы замяняецца вучэбным матэрыялам другіх тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню ў аб'ёме да 16 гадзін за кошт раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

*Канчатак*

| Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу | Колькасць гадзін |
|---|---|
| **Развіццё рухальных здольнасцей**[1] | |
| Рухавыя гульні і гульнявыя заданні | + |
| Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей[2] | + |
| Прыкладныя рэкамендацыі па тыднёваму рухальнаму рэжыму | + |
| **УСЯГО:** | **68** |

## Уводзіны ў школьнае жыццё

**Гульні з бегам:** «Лавішкі», «Вугалкі», «Паляўнічыя і малпы», «Парны бег», «Пастка», «Мы — вясёлыя рабяты», «Карасі і шчупак», «Хітрая ліса», «Сустрэчныя перабежкі», «Пустое месца», «Забаўнік».

**Гульні з поўзаннем і лажаннем:** «Хто хутчэй да сцяжка», «Мядзведзь і пчолы», «Пажарныя на вучэнні».

**Гульні з кіданнем:** «Паляўнічыя і зайцы», «Кінь за сцяжок», «Пападзі ў абруч», «Збі кеглі», «Мяч вядучаму», «Школа мяча».

**Гульнявыя заданні і эстафеты** з пераноскай і перадачамі мячоў, флажкоў, выкарыстаннем скакалак і іншага інвентара.

## Асновы фізкультурных ведаў

**Асновы бяспекі заняткаў.** Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай (у спартыўнай зале, на гульнявой і спартыўнай пляцоўках, лыжні, у басейне). Правілы бяспечнага перамяшчэння да месцаў заняткаў і назад. Меры папярэджання бяспекі на вадзе, у парках, у двары, дома.

**Гігіенічныя веды.** Патрабаванні да адзення і абутку для фізкультурных заняткаў у розных умовах. Правільная пастава і яе значэнне для здароўя і добрай вучобы.

[1] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухавых здольнасцей вучняў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[2] Плануецца на апошнія два тыдні вучэбнага года.

**Здаровы лад жыцця.** Уяўленне пра здароўе і здаровы лад жыцця. Рэжым дня вучня першага класа. Уплыў заняткаў фізічнымі практыкаваннямі на здароўе, настрой, вучобу.

**Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі.** Патрабаванні да выканання комплексу практыкаванняў ранішняй гімнастыкі. Правілы выканання практыкаванняў для фарміравання правільнай паставы.

**Алімпізм і алімпійскі рух.** Уяўленне пра Алімпійскія гульні старажытнасці, легенды і міфы Алімпіяд, праграма і ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў, апошнія Алімпійскія гульні старажытнасці.

## Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

**Страявыя практыкаванні.** Асноўная стойка, пастраенне ў адну калону, у шарэнгу, у круг; разыходжанне па загадзя ўстаноўленых месцах; размыканне на шырыню паднятых у бакі рук; павароты пераступаннем, скачком. Выкананне каманд «Станавіся!», «Раўняйся!», «Смірна!», «Вольна!», «Направа!», «Налева!», «Клас, шагам марш!», «Клас, стой!».

**Агульнаразвіццёвыя практыкаванні.** Практыкаванні без прадметаў, з гімнастычнай палкай, мячом, скакалкай у зыходных становішчах «стоячы», «седзячы», «лежачы»; практыкаванні для фарміравання правільнай паставы ў асноўнай стойцы, седзячы на гімнастычнай лаўцы, на падлозе; комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі без прадметаў, з мячом, са скакалкай; падцягванне ў вісе стоячы, згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы на гімнастычнай лаўцы, на падлозе; віс на сагнутых руках.

**Хадзьба.** Хадзьба звычайным і шырокім крокам, на насках, па разметках, па лініі, пераступаючы праз перашкоды, пад музычнае суправаджэнне, з утрыманнем гімнастычнай палкі, мяча адной і дзвюма рукамі ў розных палажэннях.

**Бег.** Бег у калоне ў павольным і сярэднім тэмпе, з паскарэннем, у чаргаванні з хадзьбой; на насках, з падніманнем бядра, са змяненнем напрамку па сігнале; чаўночны бег 4×9 м (тэставае практыкаванне); бег 10, 20, 30 м з высокага старту; 6-мінутны бег; бег 500 м (дзяўчынкі), 800 м (хлопчыкі).

**Скачкі.** Імітацыя скачкоў птушак, жывёл; скачкі «па купінах», праз «вудачку», праз кароткую і доўгую скакалку; скачкі ўверх з даставаннем рукой падвешанага прадмета; скачкі на дзвюх нагах з прасоўваннем наперад; у даўжыню з месца з адш-

турхоўваннем дзвюма нагамі (тэставае практыкаванне); скачок праз вертыкальную перашкоду (разінка, планка на вышыні 20—25 см); скачкі ў даўжыню з малога (5—6 крокаў) разбегу.

**Кіданне.** Падкідванне малога мяча ўверх і яго лоўля дзвюма рукамі, перакідванне мяча з рукі ў руку; удары мячом аб падлогу і лоўля пасля адскоку дзвюма рукамі; кіданне малога мяча адной рукой з месца ў шчыт з адлегласці 2—3 м са становішча стоячы тварам у бок кідання; кіданне набіўнога мяча (0,5 кг) дзвюма рукамі з-за галавы з зыходнага становішча «седзячы ногі паасобку», дзвюма рукамі знізу з зыходнага становішча «стоячы ногі паасобку».

**Лажанне.** Лажанне па гарызантальнай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры прысеўшы, ва ўпоры стоячы на каленях; падцягванне на гарызантальнай гімнастычнай лаўцы ў становішчы лежачы на жываце; лажанне па гімнастычнай сценцы рознаіменным і аднайменным спосабамі.

**Акрабатычныя практыкаванні.** Пераварoты ў правы і левы бакі з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі ўнізе», «лежачы на спіне, рукі ўверсе»; выскокванне ўверх з зыходнага становішча «ўпор прысеўшы», групоўка з зыходнага становішча «стоячы», «седзячы», «лежачы на спіне»; перакат з групоўкі ў прыседзе назад з вяртаннем у прысед; кулёк уперад у групоўцы.

**Практыкаванні ў раўнавазе.** Стойка на адной назе, другая нага сагнутая са зменай становішча рук у бакі, наперад, за галавой; хадзьба па прамой лініі на падлозе звычайным і скарочаным крокам, па гімнастычнай лаўцы, па рэйцы гімнастычнай лаўкі.

**Элементы спартыўных і рухавых гульняў.** Перакідванне тэніснага мяча з рукі на руку; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй дзвюма рукамі, адной рукой; кідкі тэніснага мяча ў сценку з наступнай лоўляй дзвюма рукамі пасля адскоку ад сценкі і падлогі.

Падкідванне валейбольнага мяча[1] і лоўля яго дзвюма рукамі; тое ж з адным-двума воплескамі, з адскокам ад падлогі; перакідванне мяча праз валейбольную сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча; перакідванне мяча ў парах адзін аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; удары мяча аб падлогу з наступнай лоўляй дзвюма рукамі; кідкі мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога на вышыні 1,5—2 м ад падлогі).

---

[1] Дапускаецца выкарыстоўваць любы мяч дыяметрам 25—30 см.

Вядзенне футбольнага мяча[1] па прамой адной нагой, паперамення правай і левай нагой змейкай, чаўнаком; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагой; перадачы мяча ў парах адзін аднаму правай і левай нагой; удары нагой па нерухомым мячы з пападаннем у вароты.

**Перамяшчэнне на лыжах.** Пераноска лыж да месца заняткаў і назад; адзяванне, зніманне лыж; стойкі на лыжах: асноўная, высокая, нізкая; ступаючы і слізготны крокі без палак, з палкамі; павароты пераступаннем на месцы; пад'ём угору «лесвічкай»; спускі з гор у высокай стойцы.

**Плаванне.** Прысяданні з пагружэннем у ваду з галавой; выдых у ваду; дасტаванне прадметаў з дна, расплюшчваючы вочы ў вадзе; слізганне лежачы на грудзях і лежачы на спіне з апорай рукамі аб плавальную дошку і без апоры; рухі ног спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна, з падтрымкай партнёра, які стаіць на месцы; слізганне на спіне, на грудзях пасля адштурхвання ад борціка з рухамі ног спосабам «кроль».

Гульнявыя заданні: «Схавайся ў ваду»; «Жабяняты», «Паплавок».

Гульні: «Медуза», «Зорачка», «Карагод», «Фантан», «Бура на моры», «Паляўнічыя і качкі», «Арэлі».

## РАЗВІЦЦЁ РУХАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ

**Рухавыя гульні і гульнявыя заданні**[2] выкарыстоўваюцца на ўроках фізічнай культуры і здароўя для замацавання і ўдасканалення вывучаных рухальных уменняў, навыкаў, спосабаў дзейнасці, развіцця каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей.

**Гульні з выкананнем страявых каманд:** «Хто хутчэй стане ў строй», «Пабудуй круг», «Пабудуй калону», «Падарожжа на караблі», «Рака і роў», «У дзяцей парадак строгі», «Елачкі — бярозкі», «Рыбкі — крабікі».

**Гульні на развіццё ўвагі:** «Фігуры», «Лес, балота, возера», «Нос, нос, нос, лоб», «Клас, смірна!», «Дзень і ноч», «Таварыш капітан», «Рабі, як я», «Забаронены рух», «Забаўнікі», «Зрабі фігуру», «Люстэрка».

---

[1] Дапускаецца выкарыстоўваць любы мяч дыяметрам 25—30 см.

[2] У раздзел уключаны гульні і гульнявыя заданні, якія выкарыстоўваюцца настаўнікам па выбары.

**Гульні для развіцця каардынацыйных здольнасцей:** «Барада», «Грушка», «Малако», «Пасадка бульбы», «Змяя», «Калімбам-ба», «Метка», «Вяроўка-змейка», «Не сыдзі з месца», «Збор ураджаю», «Дванаццаць палачак», «Квач у парах», «Паспей узяць», «Спрытныя матальшчыкі», «Канатаходзец», «Хто даўжэй не ўпусціць», «З купіны на купіну», «Соўка», «Пераправа».

**Гульні і гульнявыя заданні з бегам:** «Ключы», «Хто хутчэй», «Аддай стужку», «Хутка вазьмі і пакладзі», «Замяні прадмет», «Дагані сваю пару», «Два маразы», «Соўка», «Хто хутчэй дакоціць абруч», «Не замачы ног», «Паспей дагнаць», «Шпакоўня», «Знайдзі пару», «Поезд», «Бяздомны заяц», «Маяк», «Коннікі-спартсмены», «Гусі-лебедзі», «Пустое месца», «Краскі», «Вольнае месца».

**Гульні і гульнявыя заданні са скачкамі:** «Пінгвіны з мячом», «Саскоч і павярніся», «Не наступі», «Воўк у рове», «Зайцы ў агародзе», «Жаба і чапля», «Вераб'і і кошкі», «Вудачка», «Злаві камара», «З купіны на купіну», «Не пападзіся», «Квач».

**Гульні і гульнявыя заданні з кіданнем:** «Перадаў — сядай», «Мяч у карзіну», «Паспей злавіць», «Каго назвалі — той ловіць», «Хто далей», «Паляўнічыя і зайцы», «Рухавая цэль», «Перадай мяч», «Хто самы меткі», «Паспей злавіць», «Мяч вядучаму», «Дагані мяч», «Мішэнь-качалка».

**Гульні і гульнявыя заданні з лажаннем і пералажаннем:** «З мячом пад дугой», «Перапаўзі — не кінь», «Хто хутчэй да флажка», «Пералёт птушак», «Лоўля малпаў», «Пажарныя», «Мядзведзі і пчолы».

**Гульні з перамяшчэннем на лыжах:** «Шырэй крок», «Хто самы хуткі», «Да сваіх флажкоў», «Сустрэчная эстафета».

**Гульні з выкананнем тэставых практыкаванняў:** «Выконвай без памылак», «Самы спрытны», «Самы хуткі», «Самы моцны».

### *Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў*

Індывідуальны ўзровень рухальных здольнасцей вучня вызначаецца з дапамогай тэставых практыкаванняў, якія выконваюцца толькі ў канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выкарыстоўваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены ў табліцы.

*Табліца 2*

## *Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак I класа*

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца (см) | 94 і менш | 95 | 100 | 105 | 110 | 112 | 115 | 119 | 122 | 130 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м (с) | 14,7 і больш | 14,6 | 14,0 | 13,7 | 13,4 | 13,2 | 12,9 | 12,5 | 12,2 | 12,0 і менш |
| 3 | Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне» за 30 с (разоў) | 7 і менш | 8 | 10 | 11 | 12 | 14 | 15 | 17 | 18 | 20 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе» (см) | −5 і менш | −4 | −2 | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 і больш |
| 5 | Бег 30 м (с) | 7,8 і больш | 7,7 | 7,4 | 7,2 | 6,9 | 6,8 | 6,6 | 6,5 | 6,4 | 6,2 і менш |
| 6 | Шасцімінутны бег (м) або бег 500 м (мін, с) | 650 і менш<br>4,16 і больш | 660<br>4,15 | 760<br>3,58 | 800<br>3,54 | 850<br>3,35 | 890<br>3,23 | 920<br>3,10 | 970<br>3,05 | 1000<br>2,50 | 1110 і больш<br>2,40 і менш |

*Табліца 3*

## *Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў I класа*

| № п/п | Тэставае практыкаванне | Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Нізкі | | Ніжэйшы за сярэдні | | Сярэдні | | Вышэйшы за сярэдні | | Высокі | |
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Скачок у даўжыню з месца (см) | 103 і менш | 104 | 110 | 115 | 119 | 122 | 126 | 130 | 134 | 140 і больш |
| 2 | Чаўночны бег 4×9 м (с) | 14,0 і больш | 13,9 | 13,4 | 13,1 | 12,8 | 12,5 | 12,3 | 12,1 | 11,8 | 11,5 і менш |
| 3 | Віс на сагнутых руках (с) | 2 і менш | 3 | 4 | 5 | 7 | 10 | 12 | 14 | 17 | 23 і больш |
| 4 | Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе» (см) | −9 і менш | −8 | −6 | −4 | −2 | 1 | 3 | 5 | 7 | 10 і больш |
| 5 | Бег 30 м (с) | 7,7 і больш | 7,6 | 7,5 | 7,3 | 7,0 | 6,9 | 6,7 | 6,5 | 6,4 | 6,2 і менш |
| 6 | Шасцімінутны бег (м) або бег 800 м (мін, с) | 700 і менш<br>6,56 і больш | 710<br>6,55 | 800<br>6,29 | 860<br>6,00 | 900<br>5,35 | 950<br>5,13 | 1000<br>5,08 | 1020<br>4,54 | 1080<br>4,40 | 1140 і больш<br>4,25 і менш |

*Табліца 4*

### *Прыкладныя парады па тыднёвым рухальным рэжыме вучняў I класа*[1]

| №<br>п/п | Віды рухальнай дзейнасці[2] | Аб'ём рухальнай дзейнасці на тыдзень | |
|---|---|---|---|
| | | **хлопчыкі** | **дзяўчынкі** |
| 1<br>2 | Бег у рухавых гульнях у двары, у парку (км) або хадзьба на лыжах (км) | до 6<br>7—9 | до 5<br>6—8 |
| 3 | Скачкі праз кароткую скакалку (разоў) | 500—600 | 500—600 |
| 4<br><br>5 | Падцягванне ў вісе на высокай перакладзіне (разоў) або<br>Падцягванне на нізкай перакладзіне (разоў) | 30—45 | —<br><br>60—80 |
| 6 | Згінанне і разгінанне рук ва ўпоры лежачы (разоў) | 30—50 | 30—50 на падвышанай апоры |
| 7<br><br><br><br>8 | Нахіл наперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе ногі разам» («складка з затрымкай 5—8 с») (разоў) або<br>Нахіл уперад «колькі магчыма» з зыходнага становішча «седзячы на падлозе ногі паасобку» (разоў) | 20—30<br><br><br><br>50—60 | 20—30<br><br><br><br>50—60 |
| 9<br><br><br>10 | З зыходнага становішча «лежачы на спіне рукі за галавой», падыманне і апусканне тулава (разоў) або<br>З зыходнага становішча «лежачы на спіне», падыманне і апусканне прамых ног (разоў) | 20—30<br><br><br>30—40 | 20—30<br><br><br>30—40 |

[1] Для вучняў, якія не займаюцца ў спартыўных або фізкультурных групах.

[2] Практыкаванні выконваюцца ў дні, вольныя ад урокаў фізічнай культуры.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

***Мець уяўленне:***

- аб здароўі чалавека;
- аб здаровым ладзе жыцця і месцы ў ім фізічных практыкаванняў;
- аб Алімпійскіх гульнях старажытнасці.

***Ведаць, разумець і выконваць:***

- патрабаванні здаровага ладу жыцця;
- правілы бяспечных паводзін на ўроках фізічнай культуры;
- патрабаванні да прафілактыкі траўматызму пры самастойным выкананні практыкаванняў і падчас рухавых гульняў;
- правілы самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі і выканання дамашніх заданняў;
- рэжым вучэбнага і выхаднога дня;
- гігіенічныя патрабаванні да адзення і абутку для заняткаў фізічнай культурай;
- вывучаныя практыкаванні, спосабы дзейнасці, страявыя каманды.

***Валодаць навыкамі і спосабамі дзейнасці:***

- гуляць у вывучаныя рухавыя гульні;
- тэхнічна правільна выконваць тэставыя практыкаванні для ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей;
- параўноўваць вынікі і тэхніку выканання практыкаванняў (рухальных дзеянняў) з эталонам — узорам, малюнкам, правілам;
- выкарыстоўваць набытыя веды, уменні, навыкі на ўроках і ў паўсядзённым жыцці;
- выконваць практыкаванні для фарміравання правільнай паставы, комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі і фізкультхвілінак;
- выконваць розныя спосабы перамяшчэння ў хадзьбе, бегу, скачках, на лыжах;
- выконваць кіданне малога мяча адной рукой, перадачы і лоўлі мяча дзвюма рукамі, вядзенне мяча адной і папераменна правай і левай нагой, удары нагой па мячы з трапленнем у вароты;
- выконваць слізгаценне па вадзе на грудзях і на спіне з рухамі ног спосабам «кроль».

*Дадатак 1*

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ»

## Перечень и нормы обеспечения спортивным инвентарем и оборудованием, необходимыми для организации физического воспитания обучающихся при получении ими общего среднего, специального, профессионально-технического и среднего специального образования, проведения с ними физкультурно-оздоровительных и спортивно-массовых мероприятий[1]

| Спортивный инвентарь и оборудование для гимнастики, акробатики, аэробики и атлетической гимнастики | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № п/п | Наименование | Единица измерения | Количество в учреждении образования с числом учащихся (чел.): | | | | Примечания |
| | | | до 220 | до 440 | до 880 | свыше 880 | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | Аптечка | штука | 1 штука в каждом спортивном зале и помещении, приспособленном для занятий физической культурой и спортом | | | | — |
| 2 | Бревно гимнастическое | штука | — | 1 | 1 | 1 | — |

[1] Дадатак 2 да пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14.07.2014 № 105 (друкуецца на мове арыгінала).

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | Брусья гимнастические универсальные | штука | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 4 | Гантели переменной массы (0,5 — 5 кг) | пара | 10 | 20 | 40 | 40 | — |
| 5 | Гриф для штанги | штука | 1 | 1 | 2 | 2 | масса до 10 кг |
| 6 | Гиря | штука | 2 | 4 | 4 | 6 | 16 кг, 24 кг |
| 7 | Диски для штанги | пара | 8 | 8 | 16 | 16 | от 1 до 15 кг каждого веса |
| 8 | Жерди для гимнастических брусьев | штука | 1 | 2 | 3 | 4 | — |
| 9 | Канат для лазанья диаметром 30 мм | штука | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 10 | Канат для перетягивания | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 11 | Кегли | штука | 6 | 8 | 10 | 12 | — |
| 12 | Козел гимнастический | штука | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 13 | Конь гимнастический | штука | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 14 | Коврик туристский | штука | 12 | 12 | 24 | 24 | для занятий спецмедгрупп |
| 15 | Мат гимнастический | штука | 10 | 20 | 30 | 40 | — |
| 16 | Мостик гимнастический | штука | 2 | 2 | 2 | 4 | — |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 | Мяч малый резиновый | штука | 10 | 16 | 16 | 20 | — |
| 18 | Обруч гимнастический | штука | 15 | 20 | 30 | 40 | — |
| 19 | Палка гимнастическая | штука | 10 | 20 | 40 | 40 | — |
| 20 | Перекладина гимнастическая | штука | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 21 | Перекладина навесная | штука | 5 | 10 | 10 | 10 | — |
| 22 | Скакалка гимнастическая | штука | 20 | 20 | 40 | 40 | — |
| 23 | Скакалка гимнастическая | штука | 2 | 2 | 3 | 3 | длина 5 м |
| 24 | Скамейка гимнастическая | штука | 6 | 8 | 10 | 15 | — |
| 25 | Стенка гимнастическая | штука | 6 | 10 | 10 | 16 | — |
| 26 | Флажок | штука | 10 | 15 | 20 | 20 | — |
| 27 | Эспандер | штука | 6 | 10 | 10 | 20 | — |
| **Легкоатлетический спортивный инвентарь** | | | | | | | |
| 28 | Брусок деревянный 5×5×10 см | пара | 4 | 8 | 10 | 16 | — |
| 29 | Канат оградительный с флажками | метр | 100 | 100 | 100 | 200 | — |
| 30 | Колодки стартовые | пара | 2 | 4 | 6 | 8 | — |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 31 | Комплект нагрудных номеров | комплект | 1 | 1 | 1 | 2 | от 1 до 100 |
| 32 | Комплект указателей метража | комплект | 1 | 1 | 1 | 2 | от 10 до 60 м |
| 33 | Мяч: | | | | | | |
| 33.1 | набивной медбол 1 кг | штука | 5 | 10 | 15 | 20 | — |
| 33.2 | набивной медбол 2 кг | штука | 5 | 10 | 15 | 20 | — |
| 33.3 | набивной медбол 3 кг | штука | 5 | 8 | 10 | 15 | — |
| 33.4 | набивной медбол 5 кг | штука | 5 | 8 | 8 | 10 | — |
| 33.5 | для метания (150 г) | штука | 12 | 15 | 20 | 30 | — |
| 34 | Планка: | | | | | | |
| 34.1 | для прыжков в высоту | штука | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 34.2 | измерительная для прыжков в высоту | штука | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 35 | Рулетка измерительная | штука | 1 | 1 | 2 | 4 | — |
| 36 | Секундомер | штука | 2 | 3 | 5 | 10 | — |
| 37 | Стойки для прыжков в высоту | пара | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 38 | Транспаранты «Старт», «Финиш» | штука | 1 | 1 | 2 | 2 | — |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 39 | Туфли беговые с шипами | пара | 10 | 20 | 30 | 60 | — |
| 40 | Эстафетная палочка | штука | 8 | 10 | 16 | 20 | — |
| **Спортивный инвентарь для зимних видов спорта** | | | | | | | |
| 41 | Ботинки лыжные | пара | 30 | 60 | 100 | 150 | — |
| 42 | Коньки | пара | 10 | 20 | 30 | 50 | разных размеров |
| 43 | Клюшка хоккейная | штука | 12 | 20 | 30 | 50 | — |
| 44 | Лыжи беговые | пара | 30 | 60 | 100 | 150 | — |
| 45 | Лыжные крепления | пара | 30 | 60 | 100 | 150 | — |
| 46 | Мазь лыжная | комплект | — | — | — | — | приобретается по мере необходимости |
| 47 | Палки лыжные | пара | 30 | 60 | 100 | 150 | — |
| 48 | Санки | штука | 10 | 10 | 10 | 10 | — |
| 49 | Шайба хоккейная | штука | 8 | 12 | 12 | 18 | — |
| **Инвентарь для спортивных, подвижных и народных игр** | | | | | | | |
| 50 | Бита для городков | штука | 4 | 4 | 8 | 8 | — |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 51 | Волан | штука | — | — | — | — | приобретается по мере необходимости |
| 52 | Ворота: | | | | | | |
| 52.1 | гандбольные | пара | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 52.2 | футбольные | пара | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 53 | Городки | комплект | 2 | 3 | 4 | 6 | — |
| 54 | Кольцо баскетбольное | пара | 4 | 6 | 8 | 14 | — |
| 55 | Комплект для настольного тенниса | комплект | 2 | 4 | 6 | 6 | — |
| 56 | Мяч: | | | | | | |
| 56.1 | баскетбольный | штука | 10 | 20 | 30 | 60 | — |
| 56.2 | волейбольный | штука | 10 | 20 | 30 | 60 | — |
| 56.3 | гандбольный | штука | 4 | 6 | 10 | 20 | — |
| 56.4 | малый резиновый | штука | 10 | 20 | 30 | 60 | — |
| 56.5 | для настольного тенниса | штука | — | — | — | — | приобретается по мере необходимости |
| 56.6 | теннисный | штука | — | — | — | | приобретается по мере необходимости |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 56.7 | футбольный | штука | 5 | 10 | 15 | 30 | — |
| 57 | Насос | штука | 1 | 2 | 2 | 4 | — |
| 58 | Ракетка: | | | | | | |
| 58.1 | бадминтонная | пара | 10 | 15 | 20 | 30 | — |
| 58.2 | для настольного тенниса | пара | 6 | 12 | 18 | 24 | — |
| 58.3 | теннисная | пара | 5 | 10 | 15 | 20 | — |
| 59 | Свисток судейский | штука | 2 | 3 | 4 | 6 | — |
| 60 | Сетка: | | | | | | |
| 60.1 | для бадминтона | штука | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 60.2 | для баскетбольных колец | пара | 6 | 10 | 15 | 30 | — |
| 60.3 | волейбольная | пара | 1 | 2 | 3 | 4 | — |
| 60.4 | для гандбольных ворот | пара | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 60.5 | теннисная | штука | 2 | 2 | 3 | 4 | — |
| 60.6 | футбольная | пара | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 61 | Стойки: | | | | | | |
| 61.1 | баскетбольные | пара | 1 | 1 | 2 | 3 | — |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 61.2 | волейбольные | пара | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 61.3 | для обводки | штука | 8 | 10 | 15 | 20 | — |
| 62 | Стол для настольного тенниса | штука | 2 | 3 | 4 | 6 | — |
| 63 | Флажок судейский | штука | 6 | 6 | 8 | 8 | — |
| 64 | Часы шахматные | штука | 2 | 4 | 4 | 6 | — |
| 65 | Шашки | комплект | 6 | 8 | 12 | 20 | — |
| 66 | Шахматы | комплект | 6 | 8 | 12 | 20 | — |
| 67 | Щит баскетбольный | пара | 2 | 4 | 6 | 10 | — |
| **Спортивный туристский инвентарь** | | | | | | | |
| 68 | Аптечка походная | штука | 2 | 2 | 4 | 4 | — |
| 69 | Карабин туристский | штука | 10 | 15 | 20 | 30 | — |
| 70 | Компас | штука | 6 | 8 | 12 | 20 | — |
| 71 | Коврик туристский | штука | 20 | 30 | 40 | 60 | — |
| 72 | Комплект: | | | | | | |
| 72.1 | костровых принадлежностей | штука | 2 | 4 | 6 | 10 | — |
| 72.2 | посуды для приготовления пищи | штука | 2 | 4 | 6 | 10 | — |
| 73 | Мешок спальный | штука | 20 | 30 | 40 | 60 | — |

*Працяг*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 74 | Палатка туристская | штука | 6 | 10 | 10 | 20 | — |
| 75 | Рюкзак туристский | штука | 20 | 30 | 40 | 60 | — |
| 76 | Топорик туристский | штука | 2 | 4 | 6 | 10 | — |
| 77 | Фал капроновый: | | | | | | |
| 77.1 | диаметром 8—10 мм | метр | 40 | 80 | 100 | 150 | — |
| 77.2 | диаметром 12—14 мм | метр | 40 | 40 | 50 | 50 | — |
| **Спортивный инвентарь для многоборий Государственного физкультурно-оздоровительного комплекса Республики Беларусь** | | | | | | | |
| 85 | Винтовка пневматическая | штука | 2 | 4 | 6 | 10 | |
| 86 | Патроны для винтовки пневматической | штука | — | — | — | — | приобретаются по мере необходимости |
| **Дополнительный спортивный инвентарь и оборудование, приобретаемые за счет средств приносящей доходы деятельности, безвозмездной (спонсорской) помощи юридических лиц, индивидуальных предпринимателей** | | | | | | | |
| **Технические средства обучения** | | | | | | | |
| 87 | Видеокамера | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 88 | Компьютер | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 89 | Мегафон | штука | 1 | 1 | 2 | 3 | — |
| 90 | Микрофон | штука | 1 | 1 | 1 | 2 | — |
| 91 | Музыкальный центр | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 92 | Проектор мультимедийный | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 93 | Телевизор | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 94 | Усилитель с колонками | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| 95 | Шнур (удлинитель) электрический | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | до 50 м |
| 96 | Экран переносной | штука | 1 | 1 | 1 | 1 | — |
| **Спортивный гимнастический инвентарь и оборудование** | | | | | | | |
| 97 | Веревочка с грузом | штука | 2 | 3 | 4 | 6 | до 5 м |
| 98 | Тренажер (операционный или многофункциональный) | штука | 2 | 4 | 4 | 6 | — |
| 99 | Штанга | штука | 1 | 2 | 2 | 3 | — |
| 100 | Эспандер | штука | 6 | 8 | 10 | 15 | — |
| 101 | Гантели разборные | пара | 4 | 8 | 10 | 12 | до 10 кг |

*Заканчэнне*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Спортивная экипировка для сборных команд учреждения образования** | | | | | | | |
| 102 | Костюм спортивный | штука | 10 | 18 | 20 | 20 | — |
| 103 | Майка, полурукавка, футболка спортивная | штука | 10 | 18 | 20 | 20 | — |
| 104 | Трусы спортивные | штука | 10 | 18 | 20 | 20 | — |
| 105 | Кроссовки спортивные | пара | 10 | 18 | 20 | 30 | — |

*Дадатак 2*

## УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

**Бег 500, 800 метраў** выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Рэкамендуецца клас дзяліць на групу дзяўчынак і групу хлопчыкаў. Старт — групавы. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік у бегу вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

**Шасцімінутны бег** выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне пазначаецца на кожныя 10 ці 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па заканчэнні 6 мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, калі яны пачулі сігнал. Затым настаўнік кожнаму індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе вучань перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

**Віс на сагнутых руках** выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча «віс хватам зверху». Кожнаму вучню даецца адна спроба. Па камандзе настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань прымае зыходнае становішча «віс на сагнутых руках». Пры гэтым падбародак павінен быць на ўзроўні або вышэй за ўзровень перакладзіны. Секундамер выключаецца тады, калі падбародак вучня апусціцца ніжэй за ўзровень перакладзіны. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

***Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне» за 30 секунд*** выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага стано-

вішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, ступні ног зафіксаваныя. Вугал у каленным суставе складае 90 градусаў.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дотыку локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дотыкам лапаткамі гімнастычнага мата.

***Бег 30 метраў*** праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага ці нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў у бегу (фальстарт, забяганне на суседнюю дарожку), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

***Чаўночны бег 4×9 м*** выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу — не больш за 2. Кожнаму вучню даецца дзве спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча высокага старту па напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць два брускі 50×50×100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.




Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па адным бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (або за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы скорасці, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання чаўночнага бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з двух спробаў.

***Скачок у даўжыню з месца*** выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню прадастаўляюцца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спробаў.

Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе». Вучань садзіцца на падлогу, з боку знака «−» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі ОВ упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі ў каленных суставах.

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэдніх нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.



# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ Ў ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
РУССКИЙ ЯЗЫК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
МАТЭМАТЫКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
ЧАЛАВЕК І СВЕТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64
ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
МУЗЫКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . 108

ВУЧЭБНЫЯ
ПРАГРАМЫ

па вучэбных прадметах
для ўстаноў
агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

**І клас**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Б. Сопат*
Вокладка мастака *Л. Г. Рудакоўскай*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *М. І. Чэплаводскай*
Карэктар *Л. Г. Ганчарэнка*

Падпісана ў друк 29.07.2013. Фармат $60 \times 84\,^1/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,91. Ул.-выд. арк. 6,54.
Тыраж 3300 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Прамдрук». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/21
ад 23.11.2013. Вул. Чарняхоўскага, 3, 220049, г. Мінск